Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
_________М.А. Яцэвіч
___ ____________2022 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
_________Ю.М. Галкоўская
___ ____________2022 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

**КРАЯЗНАЎЧАЕ КРЫНІЦАЗНАЎСТВА**
для спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках)

Складальнік: В.І. Саітава, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

Разгледжана і рэкамендавана
на пасяджэнні Савета ўніверсітэта 21.06.2022.
пратакол № 12

**Складальнік**

В. І. Саітава, прафесар кафедры інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**Рэцэнзенты:**

Вучоны савет Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа НАН Беларусі;

В. А. Касап, прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**Разгледжаны і рэкамендаваны да зацвярджэння:**

кафедрай інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол ад 2022 № 10 ад 13.05.2022);

Саветам факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол №10 ад 13.06.2022)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ


1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА 4
2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 5
Матэрыялы да лекцый 6
3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 76
Тэматыка практычных заняткаў 76
Метадычныя парады да практычных заняткаў 76
4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ 87
Метадычныя парады да самастойнай работы 87
Пытанні да заліку па вучэбнай дысцыпліне 90
Тэмы курсавых і дыпломных работ 91
Пералік сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці 92
5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ 94
Вучэбная праграма 94
Вучэбна-метадычная карта 97
Электронныя адукацыйныя рэсурсы 98
Асноўная літаратура 99
Дадатковая літаратура 99


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Актуальнасць вучэбнай дысцыпліны “Краязнаўчае крыніцазнаўства” абумоўлена павышэннем значэння краязнаўчай інфармацыйнай работы, якая на сучасным этапе з’яўляецца адным з асноўных кірункаў ва ўніверсальных і спецыяльных бібліятэках.

У сучаснай адукацыі развіваецца тэндэнцыя паглыблення крыніцазнаўчай падрыхтоўкі па гуманітарных дысцыплінах, што знайшло адлюстраванне на міжнародных канферэнцыях па праблемах гэтых навук і іх выкладання, у адукацыйнай дзейнасці.

У прафесійнай падрыхтоўцы бібліятэчных спецыялістаў на ФІДК вялікая ўвага надаецца вывучэнню інфармацыйных рэсурсаў: іх структурна-відавому складу, арганізацыі, пытанням кіравання і выкарыстання, прамоцыі. Вучэбная дысцыпліна “Краязнаўчае крыніцазнаўства” адносіцца да ліку інфармацыйных рэсурсных дысцыплін і характарызуецца пэўнымі асаблівасцямі. Падставай спалучэння краязнаўства і крыніцазнаўства ў якасці вучэбнай і навуковай дысцыпліны з'яўляецца комплексны характар гэтых навук, прызнанне іх інтэгрыруючай ролі ў сферы навукі (адносна многіх іншых навук) і ў сферы культурна-асветнай дзейнасці, якую яны паспяхова выконваюць у сучасным грамадстве. Крыніцазнаўчая падрыхтоўка бібліятэчных спецыялістаў адрозніваецца тым, што звязана са збіраннем, аналітыка-сінтэтычнай апрацоўкай, каштоўнаснай ацэнкай, здабываннем бібліяграфічных, фактаграфічных і ў пэўных сітуацыях навуковых ведаў з дакументнай прадукцыі, якая прызначана для захавання ў бібліятэках, мае шырокае сацыяльнае прызначэнне.

Вучэбна-метадычны комплекс вучэбнай дысцыпліны “Краязнаўчае крыніцазнаўства” прызначаны для суправаджэння адукацыйнай дзейнасці студэнтаў завочнай формы навучання. Яго структура і напаўненне адпавядаюць “Палажэнню аб вучэбна-метадычным комплексе па вучэбнай дысцыпліне” (БДУКМ).

ЭВМК уключае: тлумачальную запіску, тэарэтычны раздзел, у якім змешчанылекцыйны матэрыял, практычны раздзел, дзе прыводзяцца метадычныя рэкамендацыі па падрыхтоўцы да практычных заняткаў; раздзел кантроля ведаў, у якім прыводзяцца рэкамендацыі і заданні да кіруемай самастойнай работы студэнтаў, пытанні да заліку.

Апошні раздзел ЭВМК уключае тэкст вучэбнай праграмы, вучэбна-метадычныя карту дысцыпліны, спісы асноўнай і дадатковай літаратуры, інфармацыю аб электронных адукацыйных рэсурсах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Згодна вучэбнага плана “Краязнаўчае крыніцазнаўства” вывучаецца студэнтамі як курс па выбару. Прыкладнае размеркаванне гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 8 гадзін, практычныя заняткі – 4 гадзіны, самастоўная работа – 6 гадзін. Рэкамендуемая форма кантролю ведаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## МАТЭРЫЯЛЫ ДА ЛЕКЦЫЙ

### Тэма “ТЭАРЭТЫЧНЫЯ ПЫТАННІ КРАЯЗНАЎЧАГА КРЫНІЦАЗНАЎСТВА”

У даследчай дзейнасці паняцце “крыніца” трывала замацавалася як аб’ект і сродак пазнання. Крыніца – гэта любы аб’ект матэрыяльнай і духоўнай культуры, з дапамогай якога магчыма ажыццяўляць даследаванні – такое тлумачэнне гэтага тэрміна шырока прадстаўлена ў навуковай і даведачнай літаратуры.

Паняцце крыніца мае вялікае значэнне для развіцця навукі, практычнай дзейнасці ў розных галінах і сферах. У практычнай сферы крыніца – гэта можа быць матэрыяльны рэсурс, выток фінансавання, якія выкарыстоўваюцца ў вытворчасці, у тэхналогіі. Гэта паняцце часта выступае сінонінам тэрміна рэсурс ці падобных.

У даследчай дзейнасці паняцце “крыніца” трывала ўмацавалася як аб’ект і сродак пазнання.

За час існавання чалавецтва ў цэлым, і ў прыватнасці на Беларусі, створана безліч помнікаў матэрыяльнай і духоўнай культуры, пісьменнасці, даных мовы, ідэалогіі, культурных традыцый, звычаяў і інш. Усё гэта, створанае раней і дайшоўшае да нашага часу, як і тое, што ствараецца сёння, з'яўляецца крыніцамі даследаванняў, вывучэння, у т. л. навуковага, з адукацыйнымі мэтамі. Колькасць крыніц у шырокім сэнсе слова бязмежная.

Крыніцы выкарыстоўваюцца для вывучэння гістарычнага развіцця асобных краін, перыядаў, падзей, жыцця і дзейнасці персон, асобных рэгіёнаў.

Негледзячы на тое, што беларуская культура ў цэлым і кожны асобны рэгіён страцілі безліч археалагічных, гістарычных, архітэктурных, кніжных і іншых помнікаў падчас шматлікіх войнаў, у выніку дзяржаўнай няўсталяванасці і па іншых прычынах, кожны раён Беларусі мае дастаткова багаты падмурак, створаны з разнастайных крыніц, выяўленне і выкарыстанне якіх прынясе вялікую карысць у навуковых даследаваннях, набыцці ведаў аб краі, для патрыятычнага выхавання насельніцтва, асабліва моладзі, у фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці, гонару за свой край і радзіму, у справе далейшага сацыяльна-культурнага развіцця. Штодзень ствараецца велізарная колькасць новых крыніц, па якіх нашчадкі будуць адлюстроўваць карціну нашага часу. Паўната, аб’ектыўнасць, дакладнасць, надзейнасць (ці іх значэнняў у адмоўным сэнсе: непаўната, тэндэнцыйнасць і г. д.) і іншыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паказчыкі выкарыстання крыніц уплываюць на якасць даследаванняў. Напрыклад, у кнізе “Историческое краеведение Белоруссии» (1980) амаль няма звестак па тэме да канца XVIII ст., што сведчыць аб нявывучанасці на перыяд напісання вучэбнага дапаможніка крыніц, якія адлюстроўваюць гістарычнае краязнаўства таго часу. Ці, напрыклад, ніхто ў Беларусі пасля 1817 г. не пісаў аб тым, якое вялікае ўражанне аказала звестка аб смерці Т. Касцюшкі на насельніцтва Беларусі, аб тым, як шырока і ўрачыста былі праведзены з гэтай нагоды богаслужэнні ў каталіцкіх, пратэстанцкіх і мусульманскіх храмах, у т. л. у Мінску.

Крыніцы ў крыніцазнаўстве падзяляюць на 5 тыпаў: рэчавыя, пісьмовыя (тэкставыя), вусныя, аўдыёвізуальныя, машыначытальныя.

*Рэчавыя* крыніцы – гэта любыя аб’екты матэрыяльнай культуры: вынікі археалагічных раскопак (старажытныя прадметы, забудаванні або пахаванні, тое, што захавалася на зямной паверхні, пад зямлёй і пад вадой), этнаграфічных экспедыцый (вопратка, гаспадарчыя рэчы і інш.), прыродных даследаванняў (узоры мінералаў); любыя вырабы: прадукты вытворчасці (хлеб), прылады працы, бытавыя рэчы, упрыгожванні і інш. Напрыклад, на нашых землях захавалася шмат пахавальных помнікаў – курганоў (магільнікаў), якія ў цэнтральнай Беларусі і на поўдні называюць капцы (ад балтаў, ад літоўскага магіла), а на поўначы і ў заходняй Смаленшчыне – валатоўкі. У другой палове XVI ст. іх шмат разоў апісалі замежныя падарожнікі, а з XIX ст. яны сталі пастаянным аб’ектам археалагічных раскопак.

*Пісьмовыя* (тэкставыя) – гэта рукапісныя, друкаваныя, машыначытальныя крыніцы. Рукапісныя крыніцы захаваліся на каменях, косці, тканіне, бяросце, драўляных і гліняных таблічках, пергамене, паперы. Рукапісныя крыніцы складаюць некаторую частку бібліятэчных фондаў, напрыклад, успаміны ураджэнцаў і дзеячоў края, пісьмы і інш.

*Друкаваныя* крыніцы класіфіцыруюць па відах. Гэта кнігі, брашуры, лістоўкі, газеты, часопісы, ноты і інш. Пісьмовыя крыніцы прынята дзяліць на две асноўныя групы: актавага (дакументальнага) і літаратурнага (апавядальнага) характару. Да крыніц актавага характару адносяць заканадаўчыя матэрыялы, юрыдычныя дакументы, афіцыйную перапіску, статыстычныя дадзеныя. Вывучэннем формы і зместа крыніц актавага характару, вывучэннем іх сапраўднасці, даставерначсці, займаецца спецыяльная дапаможная гістарычная дысцыпліна – дыпламатыка. Да крыніц літаратурнага характару адносяцца: летапісы, хронікі, мемуары, запісы, дзённікі, прыватныя пісьмы, памфлеты, публіцыстычныя творы. Пісьмовыя крыніцы ствараюцца чалавекам, таму адлюстроўваюць рэчаіснасць, несучы і суб’ектыўны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

светапогляд чалавека (пісьменніка, вучонага, вайскоўца). Таму пісьмовыя крыніцы – гэта самі прадукты гістарычнай рэчаіснасці пэўнага часу. Яны і частка той рэчаіснасці і вобраз яе адначасова. Рэальная рэчаіснасць праз разуменне чалавека своеасабліва шматпланава адлюстроўваецца ў ім з такой паўнатой разнастайнасцю, што стварае магчымасць больш поўна даследчыкам пазнаваць гэту назаўсёды адыйшоўшую, непаўторную рэчаіснасць.

На сучасным этапе пад тэкстам разумеюць не толькі пісьмовыя крыніцы, але і знакава-сімвальныя абазначэнні, гіпертэкст.

*Вусныя крыніцы* – жывая памяць ці вусная гісторыя – гэта цікавая крыніца краязнаўчай інфармацыі, якая вызначаецца аб’ектыўна-суб’ектыўнымі рысамі. Гэта значыць, што аповяды удзельнікаў дапамагаюць праўдзіва ўзнавіць падзеі, а асабістыя ацэнкі і ўспрыйманне таксама мае гістарычную каштоўнасць, таму што праз пэўны час падзеі могуць успрыймацца і ацэньвацца інакш. Часам не існуе іншых, ці дакументаваных крыніц атрымання ведаў, акрамя вусных аповядаў. «Вусныя аповяды валодаюць такой сілай, там што нярэдка крыніцай інфармацыі з’яўляецца звычайны чалавек» - адзначыла менеджэр гістарычнага цэнтра публічнай бібліятэкі Х’юстана.

Аднак жывая памяць, ці вусная гісторыя даволі хутка страчваецца. З кожным пакаленнем знікае унікальная эпоха, асабліва уклад жыцця, традыцыі, псіхалагічныя асаблівасці. Ва ўсім свеце ў краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі працуюць з вуснымі матэрыяламі. Гісторыкі (у гісторыі ёсць раздзел і паняцце вусная гісторыя) выкарыстоўваюць для абазначэння вусных матэрыялаў паняцце “мемарат”. Мемарат – гэта вусны расказ-успаміны чалавека аб сваім жыцці, аб канкрэтных падзеях і фактах, сведкам якіх яму выпала быць. Падчас правядзення краязнаўчых мерапрыемстваў бібліятэкі запрашаюць сведкаў падзей, знаёмяць чытачоў з цікавымі людзьмі края. Існуюць і многія іншыя формы, з дапамогай якіх сучаснікі атрымліваюць жывую, вусную інфармацыю аб родным краі. Вельмі актыўна ствараюць падкасты.

Працуючы з носьбітамі жывой памяці бібліятэкары-краязнаўцы імкнуцца выканаць наступныя задачы: а) выявіць жывых сведкаў важнейшых падзей у краі

б) задакументаваць успаміны, напрыклад, зрабіць аудэа-відэазапіс (відэавільм, фотаздымкі, папрасіць аб напісанні рукапісных успамінаў, публікацый, напрыклад, напісаць артыкул ці кнігу і г.д. Да такіх дакументаў могуць неаднаразова звяртацца чытачы, даследчыкі, звесткі аб іх уключаюцца ў бібліяграфічную прадукцыю.

*АВ-крыніцы* – любыя гуказапісы, творы выяўленчага мастацтва, кіна, фота дакументы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Машыначытальныя* – інфармацыя на CD-ROM, у аддаленым доступе. Хутка павялічваецца мульцімедыйная інфармацыя. Краязнаўчы сегмент Інтэрнет-прасторы велізарны. У прыватнасці, важную яго частку складаюць інфармацыйныя рэсурсы установаў, якія прафесійна ствараюць, апрацоўваюць, арганізуюць, захоўваюць і перадаюць краязнаўчую інфармацыю (бібліятэкі, архівы, музеі). Шляхам алічбоўкі пісьмовых, друкаваных, рэчавых краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў са сваіх фондаў, а таксама шляхам стварэння першасных і другасных рэсурсаў, якія не маюць іншых (традыцыйных) аналагаў, установы пашыраюць доступ да краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў, ствараюць магчымасці іх выкарыстання з рознымі мэтамі. У бібліятэках развіваецца тэндэнцыя ствараць электронныя калекцыі краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў, прысвечаных рэгіёну.

Крыніцы з'яўляюцца аб’ектам навукі крыніцазнаўства, якое як навука склалася ў другой палове XIX ст.

Крыніцазнаўства з'яўляецца спецыяльнай гістарычнай дысцыплінай, якая займаецца выяўленнем гістарычных крыніц, іх класіфікацыяй, распрацоўкай метадаў іх вывучэння і выкарыстання. Тое ж паказвае і наступная фармулёўка: “Прадметам крыніцазнаўства з'яўляецца вывучэнне крыніц, іх формы, зместу, магчымых метадаў атрымання з іх гістарычнай інфармацыі і ўдасканалення гэтых метадаў”.

Крыніцазнаўства мае складаную структуру.

Па-першае, крыніцазнаўства шматдысцыплінарная, шматгаліновая навуковая і вучэбная дысцыпліна. Крыніцазнаўства дыферэнцыруецца па зместу асобных навуковых дысцыплін. Аб’ектам крыніцазнаўства ў спецыфічным разглядзе з'яўляюцца дыпламатыка, археаграфія, генеалогія, метралогія, хранаграфія, гістарычная геаграфія, тапаніміка, геральдыка і інш. Кожная з гэтых навуковых дысцыплін і ўсе яны разам прызначаны для “работы з пісьмовымі крыніцамі”. Крыніцазнаўства выкладаецца ва ўстановах вышэйшай адукацыі, напрыклад, “Гістарычнае крыніцазнаўства”.

Па-другое, складанасць структуры крыніцазнаўства заключаецца таксама і ў тым, што ў ім выдзяляюць вывучэнне крыніц, прысвечаных асобным краінам, гістарычным перыядам, асобам, падзеям і г. д. Над праблемамі крыніцазнаўства наогул, і прысвечанага Беларусі ў прыватнасці, працавалі многія выдатныя даследчыкі, сярод якіх Ціхаміраў (Расія), У. І. Пічэта, М. М. Улашчык, М. І. Ермаловіч, А. П. Грыцкевіч, В. П. Грыцкевіч, Д. В. Караў, В. У. Скалабан і інш. Сёння гэту дзейнасць вядуць М. Ф. Шумейка, С. М. Ходзін, С. А. Рыбчонак, А. І. Груша, Д. В. Яцкевіч і інш. Найчасцей крыніцазнаўцамі з'яўляюцца гісторыкі, а па розных галінах ведаў – прадстаўнікі гэтых галін



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навукі. Па праблемах крыніцазнаўства праходзяць навуковыя канферэнцыі На гістарычных факультэтах ёсць кафедры крыніцазнаўства. Праблемамі крыніцазнаўства займаюцца даследчыкі якія працуюць ва ўніверсітэтах, інстытутах НАН, у НГАБ, НАРБ, абласных і ведамасных архівах, краязнаўчых музеях, БелНДІДАС. Сярод лепшых прац гэтай галіны крыніцазнаўства, якія прадстаўляюць вялікую карысць і для краязнаўцаў, належаць “Очерки по археографии и источниковедению истории Беларуси феодального периода” (1973) і “Введение в изучение белорусско-литовского летописания” (1985) М. М. Улашчыка. Выпушчаны два выданні вучэбнага дапаможніка “Крыніцы гісторыі Беларусі” (БДУ).

Галіновыя крыніцазнаўчыя дысцыпліны накіраваны на структураванне корпусу крыніц, якія дапамагаюць ствараць новыя галіновыя веды, іх класіфікацыю і фарміраванне спецыфічнага прафесійнага мыслення. Так, у беларускім гістарычным крыніцазнаўстве даволі чотка акрэслены склад крыніц, выпрацаваны падыходы да класіфікацыі крыніц, паспяхова развіваецца метадалогія.

Выпрацаваны метад крыніцазнаўства, сутнасць якога заключаецца ў “прадстаўленні аб крыніцах як з’явах культуры, як рэалізаваным інтэлектуальным прадукце чалавечай дзейнасці” (Русіна). Метад крыніцазнаўства дазваляе вызначыць інфармацыйны патэнцыял крыніцы для атрымання фактычных даных (паўната, верагоднасць, навізна) і яе значнасць.

Вылучаны асноўныя этапы работы з крыніцай. Гэта 1) выяўленне пошук крыніц, 2) крыніцазнаўчы аналіз, 3) распрацоўка метадаў вывучэння, апрацоўка і аналіз даных, якія змяшчае крыніца.

Вышэй прыведзеныя характарыстыкі крыніцазнаўства даюць усе падставы для выдзялення навуковага кірунка і вучэбнай дысцыпліны “Краязнаўчае крыніцазнаўства”.

Краязнаўства як галіна навукі мае корпус крыніц, на якіх яно паўстала і паспяхова развіваецца. Лагічным прадстаўляецца ў гэтай структуры і выдзяленне кірунка, прадметам якога з'яўляецца вывучэнне крыніц, прысвечаных адміністрацыйна-тэрытарыяльным, фізіка-геаграфічным адзінкам, населеным пунктам і іншым аб’ектам дробнага тэрытарыяльнага паходжання ў межах краіны. Магчыма спаслацца на аднаго з вядучых сучасных беларускіх археографаў Ю.У. Несцяровіча, які абгрунтоўваючы структуру археаграфічных выданняў па “тэматычнаму аб’екту публікацыі”, вылучыў і групу выданняў “па гісторыі пэўнай мясцовасці”. Да краязнаўчых крыніц адносяцца крыніцы ўсіх відаў, якія заключаюць інфармацыю аб тым ці іншым краі. Ёсць крыніцы, мэтанакіравана створаныя, каб адлюстраваць інфармацыю, звесткі аб краі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

напрыклад, “Летапіс горада Магілёва”, “Была такая вёска” [Віцкаўшчына, Дзяржынскага р-ну] – кніга, прысвечаная М. М. Улашчыкам сваёй малой радзіме, кнігі з серыі гісторыка-дакументальных хронік “Памяць” і інш. Але інфармацыя аб асобных краях трапляе ў дакументы краіназнаўчага і галіновага зместу, дзе яе трэба адшукаць.

У краязнаўстве выкарыстоўваюцца шырокае кола крыніц. Так, для турыстычнага краязнаўства асабліва актуальныя такія рэчавыя крыніцы, як архітэктурныя помнікі, помнікі прыроды і інш. Для краязнаўцаў-археолагаў найважнейшымі з'яўляюцца рэчавыя крыніцы, здабытыя пад час археалагічных раскопак, вельмі важныя таксама пісьмовыя і іншыя крыніцы.

Бібліятэкі і бібліятэчныя спецыялісты ў наш час адыгрываюць важную ролю ў інстытуцыянальнай структуры краязнаўства і краязнаўчага крыніцазнаўства. Бібліятэкі прадстаўляюць доступ да велізарнай колькасці кніг, перыядычных выданняў, карт, выяў, гукаў, рукапісаў і іншай дакументальнай прадукцыі шырокага грамадскага прызначэння. У структурных падраздзяленнях па краязнаўстве, бібліятэчнага маркетынгу, галіновых і іншых аддзелах вядзецца выяўленне і вывучэнне дакументальных крыніц, на іх падставе ствараюцца інфармацыйныя краязнаўчыя рэсурсы і прадукты, навуковыя працы. У бібліятэках сканцэнтраваны буйнейшыя бібліяграфічныя і фактаграфічныя рэсурсы па краязнаўстве. Беларускія бібліятэкі рыхтуюць і праводзяць навуковыя краязнаўчыя канферэнцыі і чытанні, у т. л. міжнародныя, узаемадзейнічаюць з музеямі, архівамі, універсітэтамі, СМІ па напрамку краязнаўства. Для бібліятэчнага (ці бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства) найважнейшымі з'яўляюцца выданні, аўдыёвізуальныя і машыначытальныя крыніцы, што адпавядае прызначэнню існавання бібліятэк як сацыяльнага інстытута. У дзейнасці бібліятэк можна знайсці і нямала прыкладаў выкарыстання іншых крыніц, напрыклад, рэчавых, пры афармленні інтэр’еру ў мясцовым стылі, стварэнні краязнаўчых музейных экспазіцый, арт-прасторы для дэманстрацыі творчых дасягненняў землякоў.

Краязнаўчае крыніцазнаўства як навуковая і вучэбная дысцыпліна выконвае шэраг функцый: пошукавую, каштоўнасную, светапоглядную.

Сутнасцю пошукавай функцыі краязнаўчага крыніцазнаўства з'яўляецца выўленне дакументна фіксаваных ведаў, дастатковых і інфармацыйна каштоўных для генерыравання новых ведаў аб рэгіёне.

Сутнасць каштоўнаснай функцыі краязнаўчага крыніцазнаўства ў тым, што аналіз і тэарэтычнае абагульненне дакументных фактаў суадносяцца з мэтавымі і карыстальніцкімі фактарамі інфармацыйна-спажывецкай дзейнасці, з ацэнкай іх інфармацыйнага патэнцыялу, жанрава-стылістычных якасцей.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сутнасць светапогляднай функцыі заключаецца ў тым, што інфармацыйнае забеспячэнне ў спалучэнні з любым відам краязнаўчых даследаванняў, краязнаўчай дзейнасці, дзейнасці па сацыяльна-эканамічнаму і любому іншаму кірунку рэгіянальнага развіцця спрыяе фарміраванню спецыфічнага інфармацыйнага-рэгіянальнага стыля і логікі мыслення, выхоўвае патрыятызм.

Фарміраванне прафесійнага мыслення – адна з важнейшых мэт вучэбных курсаў крыніцазнаўства. Крыніцазнаўчае даследаванне складаецца з выяўлення крыніц, аналіза, які дазваляе выбіраць асобныя факты, і сінтэза, задачай якога з'яўляецца атрыманне сукупнасці фактаў з комплекса крыніц.

Гістарычнае крыніцазнаўства выпрацоўвае ў будучых гісторыкаў, археографаў, музеязнаўцаў крытычнае гістарычнае мысленне. Крытыка крыніц, так часцей называюць крыніцазнаўцы працэс крытычнага гістарычнага мыслення, уключае ў сябе некалькі этапаў, у т.л. “устанаўленне іх сапраўднасці, або падробкі, магчымых мэт іх фальсіфікацыі, прачытанне і разуменне зместу крыніц, выяўленне розных рэдакцый і напластаванняў у крыніцы, рэканструкцыі тэкстаў, якія не захаваліся.” Далей вылучаюцца больш складаныя этапы крытыкі крыніц: “вытлумачэнне сэнсу, укладзенага ў тэкст крыніцы аўтарам, высвятленне прамога тэксту, алегорый, іншасказанняў, замоўчванняў і іх прычын, вывучэнне канкрэтных гістарычных абставін стварэння крыніцы, часу і месца яе ўзнікнення, устанаўлення імя аўтара”. На этапе высвятлення навуковай каштоўнасці інфармацыі, прыведзенай у крыніцах, вывучаецца ўплыў умоў, пры якіх узнікла інфармацыя, яе паўната, верагоднасць і дакладнасць, уплыў групавых (этнічных, дзяржаўных, палітычных, саслоўных, рэлігійных і іншых поглядаў) на аўтара, на інфармацыю, змешчаную ў крыніцы”. Вышэйшым этапам лічыцца “сінтэз інфармацыі з комплексу крыніц, якія вывучае даследчык, пасля чаго ён можа вывучаць рэканструкцыю гістарычных падзей”.

Для бібліятэчных спецыялістаў крыніцазнаўчая база і метадалогія гістарычнага краязнаўства ўяўляюць бясспрэчную каштоўнасць. Яе элементы, у спецыфічнай прафесійнай інтэрпрэтацыі, павінны мець месца ў крыніцазнаўчай падрыхтоўцы па краязнаўству. У вучэбнай дысцыпліне “Краязнаўчае крыніцазнаўства” перавага аддадзена вывучэнню друкаваных крыніц і электронных рэсурсаў. Важна арыентавацца ў тэрміналогіі геральдыкі і генеалогіі, дыялекталогіі, тапаніміцы, мемуарыстыцы, класіфікацыі крыніц, прынятых у адпаведных навуковых дысцыплінах з улікам асаблівасцей дакументных патокаў, якія кумулююцца ў бібліятэках. Увага бібліятэчнага спецыяліста канцэнтруецца на бібліяграфічным і навукова-даведачным апараце

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дакументальных крыніц, каментарыях і іншых фактаграфічных элементах выданняў. Высокапрафесійны спецыяліст павінен уяўляць асаблівасці розных рэдакцый дакумента, ведаць найбольш поўныя, верагодныя і дакладныя публікацыі па той ці іншай рэгіянальнай праблематыцы.

Спецыфічнае прафесійнае мысленне бібліятэкара-бібліёграфа краязнаўцы ў межах краязнаўчага крыніцазнаўства павінна ахопліваць наступныя элементы:

1) асноўны паняційны склад актуальнай часткі краязнаўства, без якой дзейнасць з аб’ектамі краязнаўчай інфармацыі, зносіны з прадстаўнікамі краязнаўства (навукоўцамі, спецыялістамі і аматарамі) ускладняюцца. Студэнты авалодваюць пэўным колам паняццяў, ведаў з розных галін краязнаўства, якія на сённяшні час з'яўляюцца вынікам вывучэння рэгіёнаў Беларусі;

2) авалоданне ведамі аб дакументальных крыніцах краязнаўства;

3) авалоданне спецыфічнай метадалогіяй краязнаўчага крыніцазнаўства. Элементы крытычнага мыслення, крытычнага аналізу адносна крыніц краязнаўства павінны выпрацоўвацца ўжо пад час вывучэння дысцыпліны, далей яны пастаянна паглыбляюцца ў прафесійнай дзейнасці.

## Тэма “КРЫНІЦЫ ПА ГЕНЕАЛОГІІ І ГЕРАЛЬДЫЦЫ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСКІХ РЭГІЁНАЎ”

Бібліятэкі назапасілі і папаўняюць багатыя першасныя і другасныя інфармацыйныя рэсурсы аб рэгіянальнай супольнасці ў мінулым і ў наш час. У бібліятэках існуе ўстойлівы высокі попыт на біяграфічныя звесткі як аб знакамітых людзях рэгіёна, так і аб звычайных грамадзянах, калі з'яўляецца патрэбнасць удакладніць месца пражывання ці працы чалавека, пасаду ці іншыя даныя. У сучасных умовах у рэгіёнах назіраецца павышэнне інтарэсу да гісторыі сем’яў, частотных прозвішчаў, радаводаў. У метадычных рэкамендацыях “Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк” абгрунтавана важнасць фарміравання БД “Народны архіў”, у якіх назапашваюцца матэрыялы пра мясцовыя роды, пра канкрэтных людзей. Прагназуецца, што інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк па меры развіцця кампанентаў, якія змяшчаюць звесткі пра роды, сем’і, прыватных асоб, будуць усё больш адпавядаць удзелу бібліятэчных работнікаў у адным з самых цікавых і значных накірункаў краязнаўчых даследаванняў – аднаўленні радаводаў мясцовага насельніцтва. Такі аспект краязнаўчай дзейнасці пераважае ў бібліятэках заходніх краін.

Для даследавання сямейнай гісторыі і генеалогіі важнае значэнне маюць уяўленні аб генеалогіі як навуковай дысцыпліне. Генеалогія – гэта спецыяльная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гістарычная дысцыпліна, якая вывучае ў гістарычнай рэтраспектыве індывідуальныя сямейна-родавыя сувязі, заснаваныя на агульным паходжанні, роднасці. Гэта навука дазваляе высветліць ролю прыродна-біялагічных, у т.л. этнагенетычных, сацыяльных фактараў у развіцці роду, канкрэтнай асобы, пэўных сацыяльных груп і ўсяго грамадства. Без вывучэння генеалогіі на ўсіх яе ўзроўнях немагчыма паўнацэннае даследаванне многіх важных праблем гісторыі Беларусі. Не менш важныя вынікі дае вывучэнне генеалогіі на рэгіянальным узроўні. Гэта вывучэнне з'яўлення прадстаўнікоў асобных прозвішчаў (родаў у рэгіёне), іх сямейна-роднасных, этнаканфесіянальных і іншых сувязей, вывучэння фарміравання саслоўнай структуры ў рэгіёне, асаблівасцей удзелу мясцовых уплывовых родаў і асобаў у знешняй і унутранай палітыцы на розных гістарычных этапах, вывучэнне мясцовай гаспадаркі, культуры, мастацтва, традыцый.

Неабходнай умовай для работы па дадзенаму кірунку з'яўляецца ўяўленне бібліятэкарам-бібліёграфам спецыфікі генеалагічных звестак. Генеалагічныя звесткі гэта спецыфічныя інфармацыйныя адзінкі аб персонах, якія дазваляюць ідэнтыфікаваць канкрэтнага чалавека. Яны падзяляюцца на прамыя (асноўныя) і ўскосныя (ці дадатковыя).

Прамыя (асноўныя) генеалагічныя звесткі – гэта прозвішча, імя, дата нараджэння, шлюбу, смерці, месцы жыхарства, што тычацца канкрэтнай асобы, а таксама адпаведная інфармацыя пра яго бацькоў, жонку, дзяцей і іншых блізкіх сваякоў, прычым указаныя звесткі павінны фіксаваць роднасныя сувязі паміж гэтымі людзьмі. Пры іх наяўнасці можна ідэнтыфікаваць любога чалавека, як асобную індывідуальную адзінку ў бязмежным моры людзей.

Ускосныя генеалагічныя звесткі – гэта веравызнанне, сацыяльнае становішча, прафесія, месца адукацыі, адукацыя і любыя іншыя, якія дапамагаюць праводзіць пошукі, але самі па сабе без выкарыстання асноўных не вызначаюць канчатковай ідэнтыфікацыі.

Паняцці род і родавае прозвішча паказваюць на прыналежнасць чалавека да аднаго рода, які вядзецца ад агульнага продка. Род аб’ядноўвае ўсіх членаў сям’і мужнага і жаночага пола, незалежна ад таго, незалежна ад таго, ці носяць усе яны яго прозвішча. Блізкасць радства ўстанаўліваецца лініямі і ступенямі. Сувязь адной асобы з іншай пры нараджэнні – гэта ступень роднасці, а бесперапынная сувязь ступеняў роднасці складае лінію.

Браты і сёстры даводзяцца адзін аднаму сваякамі ў 1 калене ці роднымі. Дастаткова падняцца на 1 узровень уверх па генеалагічным дрэве, каб сустрэць іх бацькоў. У сваю чаргу, іх дзеці даводзяцца адзін аднаму сваякамі ў 2 калене ці «стрыечнымі», таму што ў іх агульныя продкі дзяд, бабуля. Дзядзька і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пляменнік з'яляюцца сваякамі ў 1 калене ці роднымі, бо падняўшыся ад дзядзькі на 1 узровень уверх, мы знаходзім іх агульнага сваяка (бацьку/маці аднаго і дзеда/бабулю іншага).

*Сваяцкія лініі бываюць 3 відаў:*

– спадаючыя (нисходящие),

– узыходзячыя (восходящие),

– бакавыя.

Спадаючая лінія – ад асобы да яго патомства. Узыходзячая – ад асобы да яго продкаў. У спадаючай і ўзыходзячай лініях колькасць ступеняў адпавядае колькасці народзінаў. Таму ў спадаючай лініі сын займае 1-ю ступень, унук – другую і інш. Ва ўзыходзячай лініі – першую ступень займае бацька, другую дзед і інш. У бакавой лініі ступені лічацца ад данай асобы і ўзыходзяць да агульнага родапачынальніка, а ад яго па спадаючай лініі да таго родзіча ступень роднасці з якім трэба вызначыць. Таму два родных браты знаходзяцца ў другой ступені, дзядзька і пляменнік – у трэцяй, дваюродныя браты ў у чацвёртай, сын дваюроднага брата – у пятай.

Пошукавая дзейнасць бібліятэчнага спецыяліста патрабуе таксама ведання цэнтраў назапашвання дакументаванай інфармацыі аб людзях. Сярод іх важнейшымі з'яўляюцца архівы і некамерцыйныя генеалагічныя кампаніі (за мяжой як Ancestry.com Inc).

У архівах захоўваюцца такія каштоўныя рукапісныя крыніцы, як:

– метрычныя кнігі культавых устаноў: цэркваў, касцёлаў, сінагог, якія змяшчаюць звесткі пра народжаных, узяўшых шлюб і памерлых. Гэтыя дакументы захоўваюцца ў фондах духоўных кансісторый, духоўных праўленняў, дэканатаў, благачынняў, асоб[2]ных цэркваў, касцёлаў і інш.

– Рэвізскія казкі: матэрыялы перапісаў (рэвізій) насельніцтва. У НГАБ захоўваюцца матэялы 5-й 1795-10-й (1858 г.) рэвізій. На жаль, даныя 1-й Усерасійскага перапісу насельніцтва 1897 г. у архіве не захаваліся. (Але ёсць выданні).

– Пасямейныя і прызыўныя спіскі, пагаспадарчыя кнігі і іншыя дакументы.

У Беларусі крыніцы генеалагічнага характару XIX-XX стст. захоўваюцца Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі (НГАБ) і Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Гродна, у дзяржаўных абласных і занальных архівах. НГАБ захоўвае дакументы па тэрыторыях Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губерняў за перыяд да 1917 г., а таксама выбарачна метрычныя кнігі па Вілейскаму і Дзісненскаму паветам Віленскай губерні за канец XIX –

2



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

першую чвэрць XX стст. НГАБ у Гродна захоўвае дакументы па тэрыторыі Гродзенскай губерні за перыяд да 1917 г., у т.л. па Брэсцкаму, Кобрынскаму і Пружанскаму паветам. Пагаспадарчыя кнігі з'яўляюцца важнымі крыніцамі генеалагічных звестак у дзяржаўных рэгіянальных архівах.

Не гледзячы на вялікія страты рукапісных дакументаў па розных прычынах, па ацэнках архівістаў у Беларусі існуюць падставы для шырокага адлюстравання матэрыялаў сямейнай гісторыі і ўзнаўлення радаводаў. Для гэтага створаны адпаведныя інфармацыйна-пошукавыя сістэмы, напрыклад, базы даных НГАБ "Радавод", "Беларуская шляхта" утрымліваюць па больш за 250 тыс. запісаў. Дасягненні і перспектывы айчыннай генеалогіі грунтоўна разгледжаны С. А. Рыбчонкам  іншымі вучонымі.

У архівах устанаўленне радаводаў прадастаўляецца як платная паслуга, якая карыстаецца высокім попытам. Самастойная праца па ўзнаўленні радаводу патрабуе шмат часу, ведання моў і ўменняў выкарыстоўваць дакументальныя крыніцы.

Некаторыя праекты, звязаных з персонамі, беларускія бібліятэкі рэалізуюць разам з архівамі. Дапамогу бібліятэкарам у дзейнасці па зборы матэрыялаў пра мясцовыя роды і іх папулярызацыю, могуць аказаць не толькі дзяржаўныя ўстановы (архівы, музеі, кафедры ўніверсітэтаў), але і грамадскія генеалагічныя арганізацыі (Мінскае генеалагічнае таварыства, навуковая ініцыятыва "Цэнтр генеалагічных даследаванняў", "Радавод" пры БДУ і інш.). Партнёрам бібліятэкі можа быць і царква. Школа практычнай генеалогіі праводзіцца ў апошнія гады і ў храме святіцеля Мікалая Японскага ў мэтах асветы вернікаў храма і ўсіх жадаючых па пытаннях пошуку продкаў, выхавання дзяцей на прыкладах родавай гісторыі. Кіруе В. В. Урублеўскі, кандыдат гістарычных навук, супрацоўнік ЦНБ імя Я. Коласа НАН Беларусі.

Беларускія бібліятэкары-бібліёграфы краязнаўцы могуць пераважна карыстацца друкаванымі крыніцамі для пошуку звестак, прысвечаных генеалагічнай тэматыцы. Сярод іх: бібліяграфічныя рэсурсы, гербоўнікі шляхты, даведачныя выданні, навуковыя і навукова-папулярныя публікацыі, перыядычны друк, генеалагічная інфармацыя ў Інтэрнэце.

– Да ліку найбольш значных рэтраспектыўных бібліяграфічных дапаможнікаў адносяцца "Бібліяграфія па гісторыі Беларусі" (складальнікі М.Крэканэ і А.Сакольчык, 1969), "Дооктябрьская книга на русском языке о Белоруссии" (складальнік А.Сакольчык, 1976), штогоднікі "Бібліяграфія гісторыі Польшчы", крыніцы бягучай нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі і сумежных краін, іншыя бібліяграфічныя  рэсурсы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– Гербоўнікі шляхты – гэта спецыяльныя даведнікі, якія пачалі стварацца ў перыяд феадалізму з мэтай апісання радаводаў дваранства. Складаліся знаўцамі радаводаў дваран пэўнай мясцовасці ці краіны. Змяшчаюць гербы і апісанні ў храналагічнай паслядоўнасці жыцця і дзейнасці пакаленняў роду па мужчынскай лініі. Уключаюць многа бібліяграфічных спасылак на дакументы, якія падцвярджаюць прыводзімыя факты. Па перыяду Расійскай імперыі трэба асобна адзначыць радаводныя кнігі. Яны складаліся адначасова з вываднымі пратаколамі. Змяшчаюць пералік у алфавітным парадку дваранскіх родаў з выявай герба, а таксама генеалагічнае дрэва і пакаленны роспіс з бібліяграфічнымі звесткамі аб дакументах, якія прадстаўлены ў доказ дваранства. Кнігі складаліся ў трох экзэмплярах: арыгінал у фондзе дваранскага губернскага, а копіі ў фондзе губернскага праўлення і ў архіве Дэпартамента герольдыі ў Санкт-Пецербургу.

– Даведачныя выданні з персанальным аспектам зместу (па сучаснаму перыяду: энцыклапедыі, гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі “Памяць”, гістарычныя хронікі; па дарэвалюцыйнаму перыяду: “Алфавитные спискі дворянских родов ...губернии…”; звесткі аб персонах у “Памятных кніжках губерній”).

– Навуковая біяграфічная літаратура: гісторыка-генеалагічныя біяграфіі; публікацыі ў зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый, прысвечаных знакамітым людзям рэгіёнаў; у краязнаўчых і іншых часопісах.

– навукова-папулярная біяграфічная літаратура і публікацыі ў рэгіянальным, цэнтральным і замежным перыядычным друку.

Найбольш друкаваных крыніц, у т.л. гербоўнікі, прысвечаны шляхецкім родам. З шляхтай звязаны ўсе рэгіянальныя гістарычныя падзеі мінулага: вайсковыя перамогі, паўстанні, навука і мастацтва, рэлігія і адукацыя. Шляхецтва ў ВКЛ надавалася прывілеямі караля, вялікага князя за радавітасць і заслугі перад Айчынай. Шляхецтва атрымалі татары, нанятыя Вітаўтам як ваенныя наёмнікі, і яўрэі, якія пераходзілі ў каталіцтва.

Пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі частка шляхты атрымала правы дваранства, астатнія былі пераведзены ў падатковае саслоўе. Былі створаны дваранскія дэпутацкія сходы (ДДС), а ў іх структуры – асобныя вывадовыя камісіі, што займаліся разглядам радаводных пытанняў. Спачатку ўмовы прызнання ў расійскім дваранстве былі простымі: дастаткова было прадставіць пісьмовыя дакументы або сведкаў, які б падцвердзілі прыналежнасць чалавека да шляхецкага саслоўя. Аднак з пачатку 1830 г. ўмовы сталі больш жорсткімі (у дзейнасці ДДС заходніх губерняў адкрылася шмат фальсіфікацый дваранскіх радаводаў). Канчатковае зацверджанне выконвалася

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дэпартаментам герольдыі пры правячым Сенаце. Шмат асоб страціла дваранства з-за ўдзел ў антыўрадавым руху, у нацыянальна-вызваленчых паўстаннях. Дваранства ў XIX – пачатку XX ст. падзялялася на 6 груп, самымі знатнымі сярод іх былі тытулаваныя роды (пятая група) і прадстаўнікі старажытнага дваранства (шостая група), а астатнія адносіліся да груп, якія заслужылі дваранства сваёй дзейнасцю.

Саслоўі былі скасаваныя пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г.

Звесткі пра прадстаўнікоў купецкага саслоўя і духавенства адлюстраваны як ў рукапісных дакументах, так і ў некаторых друкаваных крыніцах. У іх ліку – “Памятные книжки губерний”, мясцовы перыядычны друк, іншыя краязнаўчыя выданні.

Звесткі пра мяшчан і сялян пераважна захоўваюцца ў дакументах архіваў.

*Гербоўнікі шляхты.* Беларуская шляхта ўзнікла і існавала як саслоўе ў перыяды, калі Беларусь не мела ўласнай дзяржаўнасці. Таму для выяўлення мясцовых шляхецкіх родаў бібліятэкі выкарыстоўваюць гербоўнікі, якія выходзілі ў Рэчы Паспалітай, у Расійскай імперыі, а сёння выдаюцца ў Польшчы, Расіі, Украіне і іншых краінах. Нешматлікія дарэвалюцыйныя гербоўнікі прысвечаны шляхце ВКЛ, а шляхце асобнага беларускага рэгіёну – аршанскай, прысвечаны толькі адзін дарэвалюцыйны гербоўнік. Лепшыя гербоўнікі выдадзены на польскай мове і захаваліся ў буйнейшых бібліятэках Беларусі (таксама ў архівах і музеях), што ўтварае пэўныя перашкоды ў выкарыстанні гэтых крыніц. Гербоўнікі спалучаюць апісанні радаводаў і гербоў.

Сярод гербоўнікаў, якія з’явіліся ў XVI – пачатку XX стст., адметнымі з’яўляюцца:

“Гербы рыцарства польскага”(«Herby rycerstwa Polskiego») Б. Папроцкага,

“Гербоўнік рыцарства В.К.Літоўскага” (“Herbarz rycerstwa W.X.Litewskiego, tak zwany Compendium...”**)** В. Каяловіча,

“Карона польская”(“Korona Polska)” К. Нясецкага,

“Радавод палякаў” (“Orbis Polonus”) Ш. Акольскага,

“Збор родаў у Вялікім княстве Літоўскім у XVI і XVI ст.” (“Poczet rodów w Wielkim Ksiêstwie Litewskim”) і "Польскі гербоўнік”(“Herbarz polski”) А. Банецкага,

“Князі літоўска-рускія ад канца чатырнадцатага веку (“Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku” Ю. Вольфа,

“Tablica odmian herbowych” Ст. Хжаньскага,

“Гербоўнік пінскай засцянковай шляхты” Р. Гарашкевіча,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“Гербоўнік татарскіх родаў у Польшчы” (“Herbarz rodzin tatarskich w Polsce”) С. Дзядулевіча і іншыя гербоўнікі.

Гэтыя гербоўнікі, негледзячы на наяўнасць памылак, часам істотных, не страцілі крыніцазнаўчага значэння. Так, наш суайчыннік В.В.Каяловіч, гісторык, рэктар Віленскай акадэміі, стваральнік адзінага на той час гербоўніка шляхты ВКЛ. Характарызуецца шырокім выкарыстаннем дакументальных крыніц, матэрыялаў пісьмовага апытання шляхты. Гэта забяспечвала больш высокую ступень даставернасці генеалагічнай інфармацыі. В.В.Каяловіч называў пачынальніка рода, блізкіх родзічаў, займаемыя пасады, удзел у войнах, сеймах і інш. Гербаўнік выдаваўся ў другой палове XVII ст. і ў XIX ст. Атрымаў высокую ацэнку сучасных вучоных, напрыклад, доктара гістарычных навук Г.Я.Галенчанкі.

*Гербоўнік К. Нясецкага а*длюстроўвае радаводы шляхты і гербы Рэчы Паспалітай, у т.л. літоўска-беларускай. У першым томе прыведзены звесткі і аб прадстаўніках улады і кіравання ў ВКЛ: аб вялікіх князях, біскупах, ваяводах, кашталянах і іншых за ўвесь перыяд існавання гэтых пасад. Змяшчае каштоўную бібліяграфічную інфармацыю, прысвечаную беларускім ваяводствам: віленскаму, полацкаму, трокскаму, мсціслаўскаму, браслаўскаму, мінскаму. У пераліку ваяводаў і кашталянаў гэтых адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак прыводзяцца апісанні дакументальных крыніц, у якіх маюца звесткі аб прызначэнні гэтых асобаў на кіруючыя пасады і іх дзяржаўнай дзейнасці. Гэта крыніцы на лацінскай і польскай мовах: афіцыйныя дакументы караля і вялікага князя, сеймавыя канстытуцыі, дакументы апублікаваныя і рукапісныя. Апісанні радаводаў размешчаны ў іншых тамах выдання ў алфавітным парадку. Радаводы дастаткова поўныя. Аўтар паказвае родапачынальнікаў, прадстаўнікоў наступных пакаленняў па мужчынскай лініі, вядомыя біяграфічныя звесткі, аб месцах рассялення. Фактычныя звесткі падцвярджацца шматлікімі ўнутрытэкставымі бібліяграфічнымі спасылкамі. Цікава, што К. Нясецкі бібліяграфаваў не толькі разнастайныя рукапісныя і друкаваныя дакументы, але і надмагільныя надпісы, правільна ацаніўшы іх крыніцазнаўчую каштоўнасць, выкарыстоўваў вынікі пісьмовага апытання шляхты.

У гербоўніку ёсць прабелы і недакладныя звесткі, якія выправілі пазнейшыя генеалогі. Украліся  яны пераважна з-за некрытычных адносінаў Нясецкага да некаторых легендарных апісанняў паходжання роду. Асобныя шляхціцы, імкнучыся прадставіць свой род больш знатным, прыпісвалі сабе паходжанне аб рымскіх патрыцыяў ці іншых магутных і знатных родаў. Абвергнуць такія легенды ў часы Нясецкага было вельмі цяжка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*А. Банецкі - выдатны* польскі генеалог, які выправіў шмат недахопаў папярэднікаў. Аўтар двух гербоўнікаў, якія маюць важнае значэнне для генеалагічных пошукаў беларускіх родаў. Гербоўнік "Збор родаў у Вялікім княстве Літоўскім у XVI і XVI ст." прысвечаны старажытнай шляхце ВКЛ. Вызначаецца тым, што радаводы напісаны на падставе шырокага кола крыніц, у т. л. кніг Метрыкі ВКЛ, архіўных матэрыялаў, археаграфічных выданняў і інш. (напрыклад, гэта звесткі пра зямельную ўласнасць, прывілеі, пра падзелы маёмасці, наданні пасад). А.Банецкі шырока выкарыстоўвае спасылкі на крыніцы. Для найбольш знатных прозвішчаў (магнатаў, арыстакратыі, радзей звычайнай шляхты) дадзены радаводныя схемы. Змешчаны ў дадатку спісы духоўных і свецкіх саноўнікаў.

"Польскі гербоўнік" быў А. Банецкім не завершаны, выйшла 16 тамоў, да літары М. Аб'ём радаводных артыкулаў залежыць ад наяўнасці матэрыялу.

У канцы XIX ст. упершыню апублікаваны рэгіянальны беларускі гербоўнік. Гэта складзены Д. Даўгяла "Аршанскі гербоўнік". Змешчаны ў выданні «Историко-юридических материалов, извлеченных из актовых книг губерний Могилевской и Витебской, хранящихся в Центральном Витебском архиве», Т.28 – Витебск, 1900, Ч.2.

У БССР гербоўнікі шляхты не складаліся. Некаторыя замежныя выданні ў адзінкавых экзэмплярах захаваліся ў бібліятэках, напрыклад, "Гербоўнік татарскіх родаў у Польшчы", падрыхтаваны С. Дзядулевічам. Зміяшчае змястоўныя радаводныя артыкулы і пра прадстаўнікоў беларускіх татарскіх родаў.

У Рэспубліцы Беларусь упершыню пачаў выдавацца "Гербоўнік беларускай шляхты" і рэгіёнальныя гербоўнікі. Вызначаюцца высокім навуковым узроўнем. Іх ствараюць айчынныя даследчыкі, найбольш супрацоўнікамі НГАБ.

*"Гербоўнік беларускай шляхты",* ствараецца ў НГАБ, выйшлі 8 тамоў (літары А – К). Асноўная частка – апісанні рэальнага родаводу з пазначэннем пачынальніка, сваяцкіх сувязяў і дакументаў на права валодання маёнткамі, судовыя справы, наданні пасад і іншыя доказы і дакументы, якія прадстаўлялі асобы, што выводзіліся ў доказ свайго паходжання. Прадстаўнікі роду, што рабілі вывад, у тэксце падкрэслены. Усе матэрыялы падаюцца адпаведна тэксту з найбольшым набліжэннем да арыгінала, напісанага на польскай мове, асабліва, што тычыцца імёнаў, прозвішчаў і назваў населеных пунктаў. Навукова-даведачны апарат уключае імянны і геаграфічны паказальнікі, а таксама алфавітны спіс гербаў. Цікавыя часткі - "Шляхта Беларусі: доўгія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пуцявіны гісторыі" і "Крыніцы па генеалогіі беларускай шляхты і правядзенне архіўных даследаванняў".

*Рэгіянальныя гербоўнікі* прысвечаны, аршанскай, наваградскай, халопенічскай, браслаўскай шляхце.

*Так "Малы гербоўнік Наваградзкай шляхты"складзены С. А. Рыбчонкам з*мяшчае матэрыялы па генеалогіі 202 родаў, якія паходзяць з Навагрудскага ваяводства, або пражывалі ў ім. Асноўная частка артыкула ўключае: апісанне рэальнага родавода з пазначэннем родапачынальніка, роднасных сувязяў і дакументаў пра валоданне маёнткам, судовыя справы, наданні пасад, звесткі пра жонак і дзяцей і г. д., якія выводзіўшыяся прадстаўлялі ў доказ свайго паходжання. Прадстаўнікі роду, што рабілі вывад, у тэксце падкрэслены. У канцы артыкула падаюцца звесткі аб даце прызнання вывада. Малюнкі гербоў зроблены з арыгіналаў канца XVIII ст., што захаваліся ў апрацаваных матэрыялах, а пры іх адсутнасці выкарыстоўваліся тыповыя малюнкі з "Польскага гербоўніка" А.Банецкага і іншых гербоўнікаў. Маюцца слоўнік тэрмінаў, імянны паказальнік назваў гербоў з указаннем родаў, якія імі карысталіся.

*У "Малым гербоўніку халопеніцкай шляхты" З. Яцкевіча* змешчаны распрацаваныя на аснове архіўных дакументаў генеалогіі 131 роду з заходняй часткі былога Аршанскага павету, які пасля першага падзелу ў 1772 г. застаўся на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Цэнтрам павету сталі Халопенічы. У гербоўніку пададзены звесткі пра гербы, якія насілі прадстаўнікі мясцовай шляхты, пра займаемыя пасады і маёнткі. Выдзелены ў асобны раздзел "Неафіты" – новаахрышчаныя ці выхрысты – шляхта яўрэйскага паходжання, напрыклад, маці А.Міцкевіча Барбара Маеўская мела такое паходжанне.

*Даведачныя выданні.* У некаторых даведачных выданнях сучасных і дарэвалюцыйнага перыяду шырока адлюстроўваюцца звесткі аб насельніцтве, найбольш аб знакамітых і адметных людзях края. У сучасных рэгіянальных даведніках раздзелы персаналій могуць быць прадстаўлены як асобныя, ці рассейваюцца на зместу даведачных выданняў. Звесткі аб персаналіях можна знайсці ў рэгіянальных энцыклапедыях, даведніках, слоўніках, гісторыка-дакументальных хроніках, даведачна-інфармацыйных матэрыялах выканкамаў і іншых выданнях. Напрыклад, звесткі пра многія тысячы імён увайшлі ў гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі "Памяць", у гістарычныя хронікі ("Хроніка Убарцкага Палесся" А.Атнагулава і інш.)

Безумоўна, для пошуку імён выкарыстоўваюць і беларускія энцыклапедыі ("Беларуская энцыклапедыя" у 18 тт., "Энцыклапедыя гісторыі Беларусі" і інш.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Спісы дваран па адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках.* На пачатку XX ст. выйшлі даведнікі пад назвай “Алфавитный список дворянских родов ...губернии, внесенных в дворянскую родословную книгу” (Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай). Шэраг спісаў дваран выдаваліся губернскімі статыстычнымі камітэтамі, звесткі пра іх адлюстроўваліся ў даведачных выданнях тыпа “Адрас-календар горада...”. Звесткі аб персонах адлюстраваны ў “Памятных книжках губерний”. Гэтыя крыніцы алічбоўваюцца, напрыклад, электронныя публікацыі магчыма выкарыстоўваць на сайтах нацыянальных бібліятэк, у Вікіпедыі. Так, “Алфавитный список дворянских родов Минской губернии” (1903) магчыма праглядаць як электроннае выданне на сайце Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі, у Нацыянальнай электроннай бібліятэцы (Расія).

У пошуках звестак пра прадстаўнікоў мясцовай шляхты пэўную дапамогу могуць аказаць і спісы шляхты, асуджанай за ўдзел у паўстанні 1863/64 гг. па губернях. Аўтарытэтныя выданні рыхтуюцца польскімі даследчыкамі (“Спісы шляхты вылегітамыванай ў губернях Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай, Смаленскай і Віцебскай”, Варшава, 1992).

*Навуковая і навукова-папулярная біяграфічная літаратура.* Ахоплівае вельмі шырокае кола пытанняў, звязаных з насельніцтвам рэгіёнаў. Мэтазгодна адзначыць наступныя групы выданняў: 1) гісторыка-генеалагічныя біяграфіі, 2) матэрыялы навуковых канферэнцый, прысвечаных знакамітым людзям рэгіёнаў. Важную ролю ў папулярызацыі краязнаўчых ведаў адыгрываюць навукова-папулярныя біяграфічныя публікацыі.

Сярод гісторыка-генеалагічных выданняў навуковай грунтоўнасцю вылучаюцца выданні, прысвечаныя асобным родам, як “История рода Заливако” (2006), “История рода Барановских” (2009), “История рода Мурашко” (2018 – 2022) і інш. Шэраг выданняў выйшаў у серыі “Рыцарство. Шляхта. Дворянство”.

У кожнай вобласці, многіх гарадах і раёнах адбываюцца навуковыя канферэнцыі, прысвечаныя знакамітым ураджэнцам і землякам, юбілеям гарадоў. Вынікам канферэнцый з'яўляюцца зборнікі навуковых артыкулаў, якія на аснове навейшых даследаваняў і грунтоўнай крыніцазнаўчай базе прадстаўляюць жыццёвы лёс і вобразы мясцовых знакамітасцей, а нярэдка гэта асобы вядомыя ў краіне і ў свеце. Так, краязнаўцу і фалькларысту В.А.Шукевічу і вучонаму ў галіне батанікі і заалогіі С.Б.Юндзілу прысвечаны матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі “Славутыя людзі Воранаўшчыны” (1992).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Матэрыялы аб знакамітых асобах змяшчаюцца ў навуковых зборніках разнастайнай краязнаўчай тэматыкі, такіх як “Наш радавод” (Гродна), “Дняпроўскі край” і інш.

Персанаграфічныя публікацыі друкуюцца ў краязнаўчых часопісах “Лідскі летапісец”, “Навагрудская зямля” і іншых, у т.л. краязнаўчых часопісах мінулага, напрыклад, “Атэнэум Віленьскі”, “Лідская зямля”).

Навукова-папулярныя творы выходзяць зрэдку асобнымі выданнямі, большая колькасць як артыкулы. Такія матэрыялы рассеяны на старонках мясцовага перыядычнага друку, а аб найбольш вядомых мясцовых дзеячах і ў цэнтральным і замежным друку.

*Электронныя рэсурсы.* Інфармацыю па генеалагічных пытаннях можна шукаць на сайтах архіваў. Сацыяльныя сеткі і сайты для генеалагічных аматарскіх пошукаў створаны ў Расіі: “Всероссийское генеалогическое древо” Міжнароднага інстытута генеалагічных даследаваняў, «Российские Династии» і іншыя, а таксама вэб-праекты (банкі даных і інш.), якія змяшчаюць масавыя крыніцы інфармацыі аб насельніцтве, сярод якіх асабліва значныя аб удзельніках Вялікай Айчыннай вайны («Подвиг народа в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг.», “Память народа” і інш.). Гэты рэсурсы садзейнічаюць пашырэнню генеалагічных ведаў сярод шырокіх колаў насельніцтва.

Беларусы замежжа, продкі якіх ў мінулым трапілі эмігрыравалі, могуць выкарыстоўваць багатыя інфармацыйныя рэсурсы Ancestry, FamilySearch і атрымліваць дапамогу бібліятэчных спецыялістаў ў аддзелах генеалогіі і краязнаўства публічных бібліятэк.

*Геральдыка.* Герб – гэта сімвалічная эмблема, візуальны адпаведнік пэўнай асобы, роду, горада, сярэдневяковага цэха, адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, дзяржавы.

Рэгіянальная геральдычная спадчына прадстаўляе каштоўны пласт краязнаўчых ведаў. Герб як і назвы мясцін – рэч незнішчальная. Праз старажытныя гербы ў чалавека ўзнікае цікавасць і пашана да мінуўшчыны, любоў да края і Айчыны, праз герб ўзнікае свайго роду інфармацыйная сувязь паміж забытымі прадзедамі і нашчадкамі. Абавязак мясцовых бібліятэк актыўна ўдзельнічаць у гэтым працэсе.

Гербы гарадоў і адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак прыцягваюць увагу шырокіх колаў аматараў старажытнасці, краязнаўцаў. Выява горада, зямель былога ваяводства, павета, губерні ўзбуджае цікавасць да мінуўшчыны, да гісторыі родных мясцін. Прайшлі часы поўнага адмаўлення ролі гэтых сімвалаў у фарміраванні гістарычнай свядомасці і патрыятызму людзей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гербы даследуюцца геральдыкай. Гэта навука аб гербах і практычная дзейнасць па стварэнні новых гербоў. Гербы вывучаліся і вывучаюцца шматлікімі геральдычнымі таварыствамі, асобнымі навукоўцамі, навуковымі калектывамі. Так, у музейнай рабоце геральдыка дапамагае ўдакладніць прыналежнасць асобных матэрыяльных помнікаў і пісьмовых дакументаў. Асноўная задача геральдыкі з'яўляецца правільнае апісанне і характарыстыка герба (блазаніраванне герба).

Для краязнаўчай дзейнасці бібліятэк галоўнымі задачамі з'яўляецца выяўленне дакументаў, якія нясуць інфармацыю пра мясцовыя гербы, арганізацыя доступа да іх і папулярызацыя геральдычнай інфармацыі.

У бібліятэках выставы і гутаркі пра мясцовыя гербы дапоўняць тую дзейнасць, якую бібліятэкі вядуць па ўшанаванні нацыянальна-дзяржаўнай сімволікі. Напрыклад, Воранаўская ЦБС Гродзенскай вобласці выпусціла дайджэст, прысвечаны мясцовай геральдыцы. Геральдыку вывучаюць студэнты гістарычных факультэтаў, таму за камплектаваннем вучэбнай і навуковай літаратуры гэтай тэматыкі сочаць бібліятэкі ўстаноў вышэйшай адукацыі.

На рубяжы 1980-1990-х гадоў у Беларусі пачынае актыўна разьвівацца геральдычная бібліяграфія. Узнавіліся спробы рэтраспэктыўнага і бягучага ўліку, павысіліся патрабаванні да паўнаты даведнікаў. Пашырылася кола выданняў, што публікуюць працы па геральдыцы.

Гербы пачалі стварацца ў далёкія часы і паступова сфарміраваліся пэўныя правілы іх афармлення. Гербы адрозніваюцца па форме і складаюцца з розных элементаў.

Герб складаецца з наступных элементаў: шчыт, карона, прылбіца (шлем), клейнод, барэлет, намёт, шчытатрымальнікі, манція (сень), дэвіз. Гербавыя выявы падзяляюцца на фігуры геральдычныя (1-га і 2-га парадку) і негеральдычныя, звычайныя (натуральныя і штучныя).

*Геральдычныя фігуры. Шчыт - гэта* галоўны элемент герба. Шчыты маюць розную форму і паходжанне, назвы іх тыпаў утвораны ад тых краін, дзе яны атрымалі найбольшае распаўсюджанне. Форма шчыта: трохкутны старажытны, французскі, іспанскі, авальны, нямецкі, ромбавы, англійскі і інш.

На шчыце размешчаны галоўныя *геральдычныя* фігуры: вяршыня (верх), падножжа (ніз), пояс (сярэдзіна), стоўб, перавязь, аканечнасць, красты, страпіла, кайма, сэрца. Шчыт можа быць тарчом – гэта турнірны шчыт, які мае адтуліну для дзіды. Шчыт падзяляецца на палі.

На шчыце змяшчаліся *і негеральдычныя* фігуры: над шчытом – шлем, карона і іншыя ўпрыгожванні. У познім сярэдневякоўі ў гербе з'явіліся неабавязковыя элементы – шчытатрымальнікі, стужкі з дэвізам, ордэны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Прылбіца (шлем) і карона*. У гербах свецкіх асоб прылбіца ўпрыгожана каронай: княжацкай, графскай, шляхецкай. У гербах духавенства прылбіца можа быць упрыгожана капелюшом (у рыма-каталікоў і грэка-каталікоў), мітрай (у праваслаўных), чалмой – гэта сведчанне ўсходняга паходжання рода ў рускай геральдыцы.

*Клейнод.* Гэта фігура, якая змяшчалася зверху прылбіцы і ўпрыгожваючай яго кароны. Клейнод тытулованай шляхты адпавядаў галоўнай эмблеме ў шчыце.

*Барэлет* – меў форму скручанай у жгут ткніны, яна ўтварала кальцо на шлеме. Характэрна для заходнеўрапейскай геральдыкі.

*Намёт* тканіна, якая развівалася над прылбіцай. Колер галоўнага поля шчыта вызначаў колер намёта.

*Шчытатрымальнікі* – гэта фігуры па баках шчыта, якія падтрымлівалі яго. Нярэдка яны сімвалізавалі паходжанне рода.

*Дэвіз* мог указваць прычыну пажалавання тытула або дваранства.

*Негеральдычныя фігуры* – натуральныя і штучныя. Яны нярэдка нясуць сэнсавае значэнне. Сярод эмблем, якія выкарыстоўвалі ў геральдыцы, важнае месца займае арол, леў, леапард і крэст. У беларускай геральдыцы ў часы ВКЛ і іншыя перыяды (Расійскай імперыі, у Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг.) выкарыстоўвалі польскага белага арла, расійскага двухгаловага арла пад трыма каронамі. Львы і леапарды адлюстроўваліся ў пэўным парадку. Часам змяшчалася футра гарнастая і вавёркі.

У гербах прымяняюць строга абмежаваную колькасць фарбаў і металаў. Гэта 5 - 4 колеры (без пурпурнага). *Фарбы:* чырвоная, блакітная, зялёная, пурпурная, чорная. *Металы:* золата (жоўты), срэбра (белы).

Фарбы не павінны накладвацца адна на адну ці быць побач. Таксама і металы Не павінны накладацца ці суседнічаць металы.

Герб нясе пэўную інфармацыю, таму ён блазаніруецца (чытаецца). Калі гербавы шчыт мае два і больш палёў, то апісваецца (чытаецца) яго правы бок (для гледачоў – левы) і верхняя частка і вядзецца паслядоўна, так, як чытаецца кніга. Калі на шчыце чатыры палі і кожная дыяганальна распалажаная пара тоесная, то апісанне даецца адзін раз. У выпадках, калі ў цэнтры шчыта змешчаны сярэдзінны шчыток (“сэрца”), у залежнасці ад змешчанай у ім выявы, ці пачынаецца з яго, ці вядзецца звычайным парадкам і завяршаецца “сэрцам”. Пры аб’яднанні двух гербаў больш значны ставіўся ў правым баку шчыта, а падпарадкаваны ў левым. Таксама па значнасці гербы маглі быць размешчаны адпаведна ўверсе і ўнізе шчыта. У гербе бакі шчыта вызначаюцца



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ад асобы, якая трымае шчыт, г. зн. што выява, якая гледачом успрыймаецца як левая, з'яўляецца правай і наадварот.

У ВКЛ гербы з'явіліся ў другой палове XIV ст. У літоўска-беларускіх летапісах згадваюцца гербы “Кітаўрус”, “Калюмны”, “Урсін”, “Ружа” і “Пагоня”. У гербах беларускай шляхты пераважалі блакітныя і чырвоныя фарбы.

У розных краінах яны надаваліся манаршай уладай і былі праявай вялікай міласці і гонару для атрымальніка, суправаджаліся прывілеямі.

Гербы падзяляюцца на нацыянальна-дзяржаўныя, уласніцкія і карпарацыйныя. Усе тры групы знаходзяцца ў полі інтарэсаў і даследаванняў краязнаўцаў і бібліятэчных спецыялістаў.

*Нацыянальна-дзяржаныя гербы* – гэта сімвалы дзяржавы, іх састаўной і неад’емнай часткай з'яўляюцца гербы зямель, адміністрацыйна-тэрытарыяльных аб'ектаў краіны, якія прадстаўляюць асаблівы інтарэс для краязнаўцаў. У ВКЛ дзяржаўным быў герб Пагоня, пасля стварэння Рэчы Паспалітай Абодвух народаў, на яе гербе Пагоня была сумешчана з Белым арлом – гербам Кароны Польскай. Беларускія ваяводствы, шэраг паветаў і гарадоў у ВКЛ мелі герб “Пагоня”, які адрозніваўся афарбоўкай поля або эмблемы. У перыяд Расійскай імперыі герб дзяржавы – двухгаловы арол аказаў уплыў геральдыку гарадоў – цэнтраў адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу на беларускіх землях.

*Уласніцкія гербы* – ахопліваюць родавыя шляхецкія гербы і асабістыя (набытыя) гербы. Асабістыя гербы надаваліся разам з правам асабістага шляхецтва (за гераізм і выдатныя заслугі перад айчынай), яны не перадаваліся нашчадкам. Па родавым гербе можна вызначыць паходжанне і роднасныя сувязі ўладальніка. (На першым полі ставіцца герб бацькоўскага роду, у другім – мацярынскага, у трэцім – роду бабулі па бацьку, у чацвёртым – бабулі па маці, у пятым – прабабулі па бацьку).

*Карпарацыйная геральдыка* – ахоплівае гербы гарадоў, цэхавыя і канфесійныя гербы. Карпарацыйныя гербы паводле зместу падзяляюцца на вытворчыя, рэлігійныя і абстрактныя. Найбольшае распаўсюджанне атрымалі вытворчыя гербы. Яны адлюстроўвалі справу, прадметы працы і г.д., паказвалі прафесійную адметнасць пэўнай катэгорыі насельніцтва. Свае гербы мелі рэлігійныя брацтвы, манастыры, каталіцкія, уніяцкія і праваслаўныя храмы, звычайна гэта быў святы, чыё імя насіў храм.

Гербы падзяляюцца на 1) функцыянальныя і 2) штучныя. Сярод функцыянальных вылучаюцца тры групы гербоў: 1) абарончыя, 2) архітэктурныя, 3) гаспадарчыя. Архітэктурныя нясуць часта і ваенную



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

атрыбутыку, напрыклад, замак, вежу. Штучныя гербы не нясуць такой прамой інфармацыі, як функцыянальныя. Нярэдка выбар эмблемы залежаў ад суб’ектыўных прычын. Штучныя гербы падзяляюцца на групы:

1) мемарыяльнай геральдыкі – уключаюць у сябе шэраг элементаў прыватных гербаў. Агульнай адзнакай гэтай групы гербаў з'яўляецца тое, што гербы нададзены ў памяць аб прадстаўніку пэўнай сям’і, роду, па ініцыятыве, ці з дазволу якога места атрымала дадзены герб. (У ёй выдзяляюцца гербы, звязаныя з каралеўскімі і вялікакняжацкімі гербамі або асобамі і гербы гарадоў, звязаныя з прыватнаўласніцкай геральдыкай буйных магнатаў. Ашмяны, напрыклад, мелі на гербе цялё з родавага гербу Ст. Аўгуста Панятоўскага, Пружаны – вужа, у пашчы якога напалоў праглынутае дзіця – італьянскі герб. Гэты герб надала Пружанам Ганна – дачка Боны Сфорцы, жонка Генрыха Валуа і Стэфана Баторыя.

2) з выявамі геральдычных жывёл: львоў, арлоў, крылатых коней, ваўкоў, ласёў, аленяў (Гродна, Ваўкавыск, Слуцк, Ліда).

3) гербы з рэлігійнай сімволікай – выявы Маці Божай, архангелаў, святых (Мінск, Віцебск, Навагрудак, Кобрын).

Герб быў прадметам гонару мяшчан і візуальным падцверджаннем іхняй пэўнай незалежнасці ад буйных землеўласнікаў. Гарадскі герб упрыгожваў фасад гарадской ратушы і будынкаў, якія з'яўляліся ўласнасцю горада, а таксама гарадскія сцягі і пячатку горада.

Пасада герольда у ВКЛ была ўведзена ў XV ст.

На Беларусі ў геральдыку было ўнесена шмат мясцовых сюжэтаў: архітэктурных выяў (элементы замкаў), жывёл (алені), заняткаў рамеснікаў (нажніцы і інш.), прымет рэлігійных канфесій. У XVI – XVII ст. былі пашыраны вершы, эпіграмы на гербы знакамітых асоб, гарадоў (А.Рымша, А.Мамоніч і інш.). У XVI – XVIII ст. хутка развівалася гарадская геральдыка. Гербы мелі больш за 100 беларускіх гарадоў.

У Расійскай імперыі ў 1722 г. была ўтворана Геральдычная кантора з герольдмайстрам. Гербавая сімволіка ў Беларусі пачала змяняцца. Лічаныя населеныя пункты захавалі старажытную сімволіку, а абсалютная большасць гарадоў і паветаў і таксама губерні атрымалі новую сімволіку, адпавядаючую расійскай геральдыцы. Характэрнай яе рысай было ўключэнне ў верхнюю дамінуючую частку двухгаловага арла.

Гарадскія гербы былі скасаваныя, так як іх сімволіка адлюстроўвала незалежнасць, традыцыі самакіравання. Толькі 7 з 42 гарадскіх і павятовых гербоў у межах сучаснай тэрыторыі Беларусі былі зацверджаны Сенатам са старымі эмблемамі, але ў новых рэдакцыях. Астатнія атрымалі новыя гербы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

негледзячы на тое, што 23 гарады, якія сталі цэнтрамі паветаў і губерняў паводле новага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу, мелі старажытныя гербы. У новых гербах шмат былі выкарыстаны элементы прыроды. У XIX ст. назіраецца падмена паняцця гарадскі герб на герб павятовы. У 1840-я гг. галоўнымі сюжэтамі герба становяцца не асаблівасці самога горада, а павета. У афіцыйных дакументах пачалі зацвярджаць не гербы гарадоў, а паветаў.

У савецкі час ствараліся прымітыўныя гербы, не адпавядаючыя асноўным правілам геральдыкі.

З пачатку 1990-х гг. у Рэспубліцы Беларусь пытанні тэрытарыяльнай геральдыкі ўпершыню пасля 1917 г. былі ўзведзены ў ранг дзяржаўнай палітыкі. 22 лютага 1994 года СМ прыняў пастанову № 89 "Аб зацвярджэнні Палажэння аб Гербавым матрыкуле Рэспублікі Беларусь". Гэтым актам рэгламентаваны працэс рэгістрацыі гарадскіх гербаў Беларусі.

Матрыкул – рээстр, у якім захоўваюцца малюнкі афіцыйных гербоў Рэспублікі Беларусь, у т.л. і тэрытарыяльных. Усе пытанні, звязаныя з гарадской геральдыкай, ускладаліся на Камітэт па архівах і справаводству пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыі падлягалі як гістарычныя гербы, так і зноў створаныя геральдычныя знакі тых населеных пунктаў, якія не мелі іх у мінулым.

Актывізацыі працы па стварэнні і ўзнаўленні гарадской геральдыкі ў Беларусі спрыяла прыняцце абласнымі выканаўчымі камітэтамі адмысловых рашэнняў па гэтым пытанні. Так, у 1998 г. у Брэсцкай вобласці па рашэнні абласнога выканаўчага камітэта быў узноўлены гістарычны герб Брэста, які дарэчы стаў першым нумарам у Гербавым матрыкуле Рэспублікі Беларусь.

У 2002 г. быў створаны Геральдычны савет пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Для цэнтралізаванага ўліку афіцыйных геральдычных знакаў і стварэння адзінай базы даных аб гэтых знаках у Камітэце па архівах і справаводству пры Савеце Міністраў вядзецца Дзяржаўны геральдычны рэгістр Рэспублікі Беларусь, складовай часткай якога стаў былы Гербавы матрыкул.

Дзейнасць Геральдычнага савета вядзецца ў межах Закона ад 26 мая 2012 года № 384-З «Аб афіцыйных геральдычных сімвалах». Геральдычны савет дае заключэнні аб адпаведнасці сімволікі гістарычным традыцыям, правілам геральдыкі, магчымасці або немэтазгоднасці яе ўстановы альбо неабходнасці дапрацоўкі, уносіць у парадку, устаноўленым заканадаўствам, прапановы аб распрацоўцы праектаў нарматыўных прававых актаў па ўдасканаленні парадку заснавання і выкарыстання афіцыйных геральдычных знакаў. Пасля станоўчага экспертнага заключэння Геральдычнага савета гербы ўносяцца ў Дзяржаўны геральдычны рэгістр Рэспублікі Беларусь. Сярод іх гістарычныя гербы, у т.л. у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

новай рэдакцыі і створаныя гербы. У Беларусі з’явіліся мастакі-геральдысты, як В. Ляхар, А. Леўчык. У цэлым сучасная геральдыка передае гістарычны шлях рэгіёнаў і асобных населеных пунктаў, у т.л. вёсак.

Устанаўленне гербоў і сцягоў аб’ектаў на тэрыторыях абласцей нашай краіны рэгламентуюць Указы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. На сакавік 2019 г. 201 адміністрыцыйна-тэрытарыяльныя і тэрытарыяльныя адзінкі атрымалі герб і сцяг.

Сучасныя знаўцы беларускай геральдыкі А. К. Цітоў, С. Я. Рассадзін, У. І. Адамушка, М. М. Елінская, А. М. Міхальчанка, А.І . Шаланда, . У буйнейшых бібліятэках Беларусі на сучасным этапе ёсць ў невялікай колькасці гербоўнікі мінулых стагоддзяў, большасць жа бібліятэк валодае пераважна сучаснай літаратурай па пытаннях геральдыкі.

Выявы гербаў і іх апісанні ў бібліятэках магчыма выяўляць па даволі шырокаму колу дакументальных крыніц. Гэта энцыклапедыі, перш за ўсё “Энцыклапедыя гісторыі Беларусі”, “Беларуская энцыклапедыя”, гербоўнікі шляхты, навуковая літаратура па геральдыцы, навукова-папулярныя публікацыі, гістарычныя часопісы і зборнік. На інтэрнет-партале “Архівы Беларусі” маецца раздзел “Геральдыка”, у якім сістэматызавана прадстаўлена тэрытарыльная геральдыка. Гістарычныя сайты, сайты гарадоў, выканаўчых камітэтаў розных узроўняў змяшчаюць раздзелы геральдыкі і гербавыя выявы.

Як адзначалася вышэй, фундаментальнымі працамі, прысвечанымі гербам, з'яўляюцца гербоўнікі. Адметнасцю гербоўнікаў з'яўляецца тое, што яны спалучаюць інфармацыю аб гербах і родаводах, г. зн. большасць зместу прысвечаны уласніцкім гербам. Разам з тым у некаторых гербоўніках прадстаўлены і іншыя віды гербоў, як у гербоўніку Б. Папроцкага на с. 917 – 923 – гербы ваяводстваў і іх апісанні.

У Расійскай імперыі ў 1843 г. у дадатку да “Полного собрания законов” былі апублікаваны малюнкі гарадскіх гербоў. У другой палове XIX ст. выйшлі выданні, якія поўна адлюстравалі расійскія тэрытарыяльныя гербы, у т.л. па беларускіх землях. Гэта “*Гербы губерний и областей Росийской империи” (1880), “Гербы городов, губерний, областей и посадов Российской империи, внесенные в полное собрание законов с 1649 по 1900 год”* П.П. Винклера. Змяшчае паказальнік “Гербы городов, внесенные в полное собрание законов Российскйо империи”. Магчыма весці пошук гербоў беларускіх гарадоў, дат іх зацвярджэння імпаратарамі.

Сучасныя гербоўнікі, выдадзеныя ў Беларусі змяшчаюць толькі ўласніцкія гербы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*У “Малым гербаўніку Наваградзкай шляхты” малюнкі* гербоў зроблены з арыгіналаў канца XVIII ст., што захаваліся ў апрацаваных матэрыялах, а пры іх адсутнасці выкарыстоўваліся тыповыя малюнкі з “Польскага гербоўніка” А.Банецкага, Ю.Шыманьскага “Гербоўніка сярэдневяковага польскага рыцарства” (Варшава, 1993) і Хжаньскага Ст. “Tablica odmian herbowych (Warszawa, 1909). Маецца паказальнік назваў гербоў з указаннем родаў, якія імі карысталіся.

Асноўная частка – апісанні рэальнага родаводу з пазначэннем пачынальніка, сваяцкіх сувязяў і дакументаў на права валодання маёнткамі, судовыя справы, наданні пасад і іншыя доказы і дакументы, якія прадстаўлялі асобы, што выводзіліся ў доказ свайго паходжання. Прадстаўнікі роду, што рабілі вывад, у тэксце падкрэслены. Усе матэрыялы падаюцца адпаведна тэксту з найбольшым набліжэннем да арыгінала, напісанага на польскай мове, асабліва, што тычыцца імёнаў, прозвішчаў і назваў населеных пунктаў.

Самая вялікая праблема – геральдычная – прадзелана велізарная работа па атаясамленні прадстаўнікоў дадзеных родаў з тымі, што выводзіліся ў Беларускім, Мінскім і Магілёўскім губернскіх дэпутацкіх сходах, таксама зафіксаваны ў друкаваных гербоўніках Аршанскім, Віцебскім і Наваградскім. Гербы намаляваў Андрэй Леўчык на падставе архіўных матэрыялаў Беларускага і Мінскага губернскіх дваранскіх дэпутацкіх сходаў, з Наваградскага гербоўніка, з гербоўнікаў А.Банецкага, Ст.Хжаньскага, Ю.Шыманьскага (Варшава, 1993).

У выданні чорна-белыя гербы, паколькі не знайшлося дастатковага фінансавання. Усе гербавыя выявы маюцца ў каляровым выкананні. У даным выданні колеры перададзены найбольш распаўсюджанай штрыхоўкай. Напрыклад, чысты шчыт азначае, што ён сярэбраны, вертыкальная штрыхоўка пазначае чырвоны колер і г.д. Форма шчыта ўзята з позняй геральдыкі – новафранцузскі шчыт – простакутнік са скошанымі ніжнімі кутамі і вастрыём у ніжнім баку. Шлем жа традыцыйны для нетытулаванага заходнееўрапейскага рыцарства – з паліраванай сталі з апушчаным забралам. На ўсіх малюнках на шлем адзета тыповая шляхецкая карона. На апошняй знаходзіцца шлемавая эмблема, якая звычайна спалучаецца з выявай самога герба ці яго частак, а таксама са стравусіных ці паўліных пёраў.

Сярод іншых сучасных даведачных выданняў неабходна адзначыць дапаможнік С.Рассадзіна і А.Міхальчанкі “Гербы і сцягі гарадоў і раёнаў Беларусі”. Змяшчае 118 гербаў гарадоў, гарадскіх пасёлкаў, раёнаў у алфавітным парадку гэтых населеных пунктаў. Выявы гербоў каляровыя, падаецца апісанне герба, зроблены неабходныя тлумачэнні, паказана сувязь



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сучаснага герба з гістарычным, адзначана ў некаторых выпадках, хто ўнёс уклад у стварэнне сучаснага герба. Напрыклад, у распрацоўку герба г.Валожына (у чырвоным полі W) унёс выдатны ўклад старшыня Валожынскага савета дэпутатаў С. М. Маляўскі, прыводзіцца напісаны ім верш аб гербе. Багаты спіс літаратуры пра геральдыку беларускіх населеных пунктаў.

З'яўляюцца навуковыя выданні, як А.І. Шаланда "Таямнічы свет беларускіх гербоў: шляхецкая геральдыка Вялікага Княства Літоўскага" (2014).

Інтарэс для беларускіх даследчыкаў і аматараў геральдыкі ўяўляюць працы сучасных польскіх і расійскіх спецыялістаў. У працах расійскіх даследчыкаў няма паняцця "беларуская геральдыка", выкарыстоўваецца "польская геральдыка".

Як адзначалася вышэй тэрытарыяльный гербы, функцыянуючыя на сучасным этапе, поўна прадстаўлены на інтэрнет-партале "Архівы Беалрусі". Іх выявы і звесткі аб іх магчыма адшукаць на на сайтах тэрытарыяльных органаў улады. Больш інфармацыі, цікавых гістарычных звестак сустракаецца ў гарадскіх парталах, сайтах краязнаўчага характару.

## Тэма "ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ КРЫНІЦЫ ТАПАНІМІКІ РЭГІЁНАЎ БЕЛАРУСІ"

Адным з кірункаў краязнаўства, у т. л. бібліятэчна-бібліяграфічнага з'яўляецца збор звестак аб назвах геаграфічных аб'ектаў рэгіёна. На тэрыторыі Беларусі каля 50 000 рачных і азёрных аб'ектаў, сотні назваў раўнін, узвышанасцей, тысячы населеных пунктаў. Гэтыя назвы, асабліва назвы населеных пунктаў, выклікаюць цікавасць у мясцовага насельніцтва. Таму для бібліятэкара-бібліёграфа веданне тапанімікі, праца з яе крыніцамі, дазваляе ствараць каштоўныя інфармацыйныя рэсурсы, праводзіць змястоўную і цікавую краязнаўчую работу.

Тапаніміка з'яўляецца раздзелам анамастыкі – навукі, якая вывучае ўласныя назвы, іх паходжанне, структуру, арэал распаўсюджання.

*Тапаніміка* вывучае геаграфічныя назвы (тапонімы), іх значэнне, структуру, паходжанне і арэал пашырэння. Сукупнасць тапонімаў на якой-небудзь тэрыторыі складае яе тапанімію. У шэрагу краін нацыянальнай тапаніміі нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Тапаніміка – складаная навука. Каб вывучыць паходжанне і сэнс назвы, неабходны грунтоўныя лінгвістычныя, геаграфічныя, гістарычныя, археалагічныя, этнаграфічныя і іншыя веды. Пры высвятленні паходжання тапанімічных назваў абавязкова трэба ўлічваць, што ў пераважнай большасці тапонімы – гэта старажытныя словы нашай або суседніх ці іншых моў (вынік



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

міграцыі народаў, плямён). У аснове назвы можа ляжаць даўно забытае слова, яго першаснае значэнне згублена ці вельмі змянілася і вядома цяпер толькі рэдкім спецыялістам. Трэба добра ведаць слоўнікавы запас тых моў, якія ўжываліся ў мінулыя стагоддзі. Некаторыя тапанімічныя назвы на першы погляд тлумачацца вельмі проста. Такія вывады звычайна робяцца на знешнім падабенстве агульнага і ўласнага назоўніка – тапаніма, напрыклад, бобр – Бабровічы, казёл – Казловічы. Даследчыкамі ўстаноўлена, што нярэдка з-за таго, як агульны назоўнік у выніку эвалюцыі семантыкі ператвараецца ў тапанімічную назву, на прамежкавым этапе ён можа выконваць ролю ўласнага назоўніка – імя ці мянушкі чалавека. Затым ад уласнага імя ўтвараецца тапанімічная назва.

Сучасныя дзяржаўныя граніцы Беларусі не з'яўляюцца яе тапанімічнымі граніцамі.

Тапаніміка дапамагае аднавіць рысы гістарычнага мінулага народа, вызначыць межы яго рассялення, акрэсліць вобласці былога распаўсюджання моў і этнасаў, геаграфію культурных і эканамічных цэнтраў, гандлёвых шляхоў. У многіх выпадках тапаніміка дае магчымасць вызначыць этнічную прыналежнасць археалагічных культур. Практычным аспектам тапанімікі з'яўляецца транскрыпцыя тапонімаў, якая ўстанаўлівае іх зыходнае і аднолькавае напісанне і перадачу на іншых мовах, што важна для картаграфавання і ўсіх відаў камунікацыі.

Сярод тапанімічных назваў вылучаюць *айконімы* – назвы населеных пунктаў: гарадоў, вёсак, мястэчкаў, пасёлкаў, хутароў, раз'ездаў, а таксама *урбонімы* – назвы ўнутрыгарадскіх аб'ектаў: плошчаў, вуліц, праспектаў, паркаў, тэатраў, музеяў, гасцініц, помнікаў і г.д.; *мікратапонімы* – гэта назвы дробных, невялікіх аб'ектаў: палёў, ўзлескаў, гаёў, палянак, асобна выдзяляюць *гідронімы* – назвы азёраў, рэк і рачулак, сажалак, вадасховішчаў, забалочаных мясцін, калодзежаў, крыніц, канаў і каналаў. Гідронімы адыгралі асаблівую ролю ў тапаніміі, таму што ляжаць у аснове найбольш старажытных назваў не толькі ўласна водных аб'ектаў, але далі найменне мноству населеных пунктаў. Многія сельскія пасяленні атрымалі свае назвы ад рачных гідронімаў, якія самі зніклі з зямлі: напрыклад, калісьці працякалі рэчкі з тыповымі назвамі Каменкі, Пясчанкі, Рыбчанкі, а зараз існуюць толькі вёскі з такімі назвамі . Гэтую х'яву характарызуюць рака і вуліца Няміга ў Мінску. Некаторыя гарады з суфіксам ск - цк носяць імёны рэк: Віцебск, Пінск, Чачэрск, Слуцк, Друцк. Адбываўся і адваротны працэс: ад назваў пасяленняў атрымалі найменні малыя рэчкі: ад Брагіна Брагінка і інш.; *дрымонімы* – назвы лесу: пушчаў, хвойнікаў, алешнікаў, бярэзнікаў, дуброў, лязнякоў і г.д.; *касмонімы і астронімы* – назвы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зон касмічнай прасторы, галактык, сузор'яў, імёны нябесных аб'ектаў, напрыклад, Чумацкі Шлях, Мілавіца, Месяц і г.д. Гэтыя віды тапанімікі падзяляюцца яшчэ больш дэталёва, напрыклад, у гідраніміі выдзяляюць *гелонімы* (назвы балот) і іншыя галіны.

Даследаванні тапанімікі ў Беларусі разгарнуліся пасля Вялікай Айчыннай вайны. Адзін з першых даследчыкаў, В.А.Жучкевіч успамінаў, што калі ў 1946-1947 гг. ён пачаў збіраць тапанімічны матэрыял, то фактычна не было літаратуры па гэтай галіне, разрозненыя звесткі можна было знайсці ў літаратуры самага螺 рознага зместу. Да таго ж ні спісы назваў, ні карты не вызначаліся дакладнасцю і не маглі служыць для навуковага вывучэння.

Істотны ўклад ў беларускую тапаніміку ўнеслі вядучыя даследчыкі: Я.М. Адамовіч, В. А. Жучкевіч, Я. Н. Рапановіч, А. Ф. Рогалеў, В. П. Лемцюгова, І. А. Гапоненка, П. У. Сцяцко і інш. Шмат інфармацыі падаюць гісторыкі, літаратуразнаўцы і крыніцазнаўцы.

*Асноўныя тыпы населеных пунктаў у Беларусі.* Беларуская тапаніміка мае багатую гісторыю, на працягу тысяч гадоў засялялася тэрыторыя, фарміравалася адметная тапаніміка. Лад жыцця старажытных беларусаў паўплываў на фарміраванне тапонімаў. Не выпадкова ў Беларусі добра распрацавана тапанімічная наменклатура, звязаная з ляснымі промысламі, землеўстройствам, паляваннем, рыбалоўствам, асваеннем забалочаных участкаў прырэчных і прыазерных нізін.

На Беларусі цяпер больш за 27 тысяч населеных пунктаў, кожны з якіх мае адну ці некалькі назваў, якія яму надаў народ ці першыя заснавальнікі. Вельмі многа неафіцыйных назваў, ужываемых мясцовым насельніцтвам. Але ў Беларусі колькасць тапонімаў яшчэ не падлічана (Шур В. В.). Для параўнання ў Швецыі, пры супастаўляльнай колькасці насельніцва, іх больш 12 млн.

На жаль, у гісторыі Беларусі было вельмі многа перыядаў, надзвычай трагічных для лёсу населеных пунктаў. Гэта перш за ўсё войны і стыхійныя бедствы. Так, падчас Вялікай Айчыннай вайны нямецка-фашысцкімі захопнікамі было знішчана 9200 вёсак і сёл, 209 гарадоў, гарадскіх пасёлкаў і мястэчак, з якіх 186 не аднавіліся пасля вайны.

Найбольш распаўсюджанымі тыпамі пасяленняў ў на беларускіх землях былі: вёскі, хутары, гарады, мястэчкі, фальваркі, засценкі і аколіцы, слабоды, гарадскія і рабочыя пасёлкі. Некаторыя з іх страцілі сваю ролю. Новым сучасным тыпам сталі аграгарадкі.

На працягу другой паловы XX – пачатку XXI ст. адбываецца працэс няўхільнага памяншэння колькасці сельскіх населеных пунктаў, у т.л. *вёсак* – гэта вынік арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці і сацыяльна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дэмаграфічных працэсаў. Сярод вёсак асабліва частотнымі з'яўляюцца назвы Навасёлкі – іх 112, Слабада –73 вёскі, Забалоцце – 63 вёскі.

*Хутар.* Хутарамі ў Беларусі называлі звычайна аддаленае ад вёсак аднадворнае пасяленне з зямельным надзелам. Лічыцца, што да пачатку калектывізацыі ў БССР і да далучэння Заходняй Беларусі да БССР, гэты тып пасяленняў быў пераважаючым – на тэрыторыі Беларусі было некалькі соцен тысяч хутароў. Найбольш за ўсё іх было на Віцебшчыне і Гродзеншчыне.

Хутары ўзнікалі ў выніку перасялення жыхароў вёсак. Адзначаюцца тры перыяды хутарызацыі ў Беларусі. "Першы перыяд – пасля адмены прыгоннага права, калі кожны селянін меў права пакінуць вясковую абшчыну і абаснаваць сваю ўласную гаспадарку". Другі перыяд – калі праводзілася так званая сталыпінская рэформа па стварэнні хутарской сістэмы сялянскага гаспадарання. Трэці перыяд адбываўся ў 1920-я гг., калі ў БССР пасля надзялення сялян зямлёй і дазволу свабодна выбіраць форму землевыкарыстання. У той жа час у Заходняй Беларусі (Другая Рэч Паспалітая Польская) праводзілася парцэляцыя і камасацыя зямлі – "высяленне сялян (найчасцей прымусовага) з вёсак у аднаасобныя гаспадаркі)."

Але хутары не толькі ствараліся. Па рашэнні ўладаў неаднаразова праводзіліся капаніі па прымусоваму адсяленні хутаран у вёскі. Так было падчас масавай калектывізацыі. Да Вялікай Айчыннай вайны ў калгасы і саўгасы былі пераселены жыхары 190 тысяч хутароў, а пасля вайны такое перасяленне праводзілася на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

*Гарады.* Цікавая эвалюцыя самога слова горад у народнай лексіцы. Шмат стагоддзяў для абагначэння гарадскога населенага пункта абазначалася слова "места". У помніках беларускага пісьменства XII ст. слова "грод" абазначала замак. На пачатку XX ст. у лексіцы беларускіх сялян слова "горад" – гэта "гарод", а слова "места" – гэта горад у нашым сучасным разуменні.

У Беларусі з XVI па першую палову XVII ст. узнікла 414 гарадскіх паселішчаў – што ацэньваецца як сапраўдны бум горадабудаўніцтва. За часы Расійскай імперыі на тэрыторыі Беларусі не ўзнікла ні аднаго горада. Па розных прычынах асобныя гарады з цягам часу страцілі свой статус, былі пераўтвораны ў гарадскія пасёлкі (Лагішын, Ружаны, Друя, Любча і інш.), вёскі (Воўпа, Перабродзе, Крэва, Гарадная, Жыровіцы, Малеч, Прывалка, Геранены, Радунь і інш.).

На сучасным этапе ў гарадскіх і іншых пасяленнях Беларусі 4742 вуліц называюцца Цэнтральная, па частотнасці на другім месцы вуліца – Маладзёжная – 2156, на трэцім месцы вуліца Садовая – 2016.

*Мястэчка* – вядомыя з XIV ст. Большасць мястэчак узнікла каля манастыроў, маёнткаў феадалаў, вялікіх дарог, – там, дзе існаваў гандаль. Жыхароў гэтых пасяленняў называлі мяшчанамі, іх асноўнымі заняткамі быў гандаль і рамёствы, займаліся таксама і прысядзібнай сельскай гаспадаркай. Беларускія мяшчане характарызаваліся ў мінулым разнастайным этнічным складам, пераважна гэта былі яўрэі, беларусы, палякі, татары, цыганы. У мястэчках размяшчаліся гандлёвыя ўстановы – лаўкі, крамы, невялікія прадпрыемствы, майстэрні, культавыя ўстановы, аптэкі, млыны. Абавязковым элементам сацыяльна-эканамічнай інфраструктуры з'яўляўся кірмаш. Характарнай прыкметаю забудовы большасці мястэчак была наяўнасць вялікай плошчы ў цэнтры, або пашыранай вуліцы, дарогі, дзе арганізоўваўся гандаль. У канцы XIX ст. існавала 464 мэстэчкі з насельніцтвам 679 тыс. чалавек. У розныя часы мястэчкамі былі Станькава, Жыровічы, Чэрвень, Вілейка, Патавы, Клецк, Зэльва, Масты, Браслаў, Слонім, Скідэль, Узда, Ганцавічы, Лунінец, Мір, Брагін, Нароўля, Крычаў, Ветка і інш.

У Заходняй Беларусі – мястэчкі шматвулічныя, з цэнтральнай плошчай, кампактныя па забудове. Ва Усходняй Беларусі – мелі адну доўгую вуліцу, забудаваную драўлянымі аднапавярховымі будынкамі. У большасці выпадкаў адсутнічала цэнтральная плошча: набор культавых і адміністрацыйных будынкаў быў значна абмежаваны.

У 1938 г. у адпаведнасці з Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР мястэчкі былі скасаваныя. Частка іх пераўтварылася ў гарады, частка была пераведзена ў лік вёсак, рабочых пасёлкаў, пасёлкаў гарадскога тыпу. Паводле слоўнікаў Я. Н. Рапановіча зафіксавана 43 мястэчкі, з іх 13 у Гродзенскай вобласці 13.

*Фальварак.* З XVI ст. вядомы асобны тып пасялення – фальваркі – (хутар, маёнтак па ням.). Характэрнай асаблівасцю была наяўнасць вялікай колькасці будынкаў пана: сядзібны дом з калонамі, або ганкам, часам двухпавярховы, з надворнымі галерэямі, з комплексам разнастайных жылых памяшканняў. Дом абносіўся дубовым тынам і брамай.

*Засценак і аколіца* – сельскія паселішчы ў Беларусі ў XVI – XX ст. Узніклі ў выніку правядзення зямельнай рэформы 1557 г., так званай “Уставы на валокі”. Валока 21,36 га. Ворныя землі феадалаў падзяляліся на 3 часткі, кожная з якіх мела свае межы (“сценкі”). Землі, якія засталіся па-за гэтымі межамі, называліся “засценкамі”. Іх звычайна арэндавалі дробная шляхта (“засцянковая шляхта” і “аколічная шляхта”) і заможныя сялене. Складаліся з жылога дома і гаспадарчых будынкаў. Засценкі і аколіцы адрозніваліся ад хутароў толькі сваім гісторыка-эканамічным паходжаннем і саслоўнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыналежнасцю жыхароў. Асабліва многа засценкаў было ў цэнтральнай і заходняй Беларусі. У 1930 – 1940-я гг. частка гэтых населеных пунктаў была зселена, а частка перайменавана ў вёскі.

*Слабада.* Тып сельскага паселішча. У перыяд ВКЛ жыхары слабод карысталіся часовым вызваленнем ад падаткаў, што знайшло адлюстраванне ў назве. На захадзе Беларусі, асабліва ў Пінскім Палессі, слабодскія пасяленні называліся *Волямі ці Волькамі, Вулькамі,* напрыклад, Святая Воля, Вулька Радавецкая і інш.

У працэсе пошукавай дзейнасці бібліятэкары-бібліёграфы сутыкаюцца з праблемай неабходнасці адшукаць змененыя назвы населеных пунктаў, удакладніць ранейшае напісанне назваў, націскі пры вымаўленні. Напрыклад, сучасным жыхарам будзе цікава пачуць на бібліятэчным мерапрыемстве як гучала назва іх вёскі ў мінуўшыя стагоддзі, як яна вымаўлялася. Веданне назваў тапоніма дазваляе больш поўна выяўляць дакументныя крыніцы аб ім.

Бурлівыя гістарычныя, ваенныя і палітычныя падзеі, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі на працягу шэрагу стагоддзяў, паўплывалі на змены ў тапаніміцы. Можна назваць некалькі фактараў, пад уплывам якіх адбываліся гэтыя змены:

1) паланізацыя і русіфікацыя тапанімічных назваў. Гэта вынік выключна моцных уплываў, якія адбываліся ў пэўныя гістарычныя перыяды ў выніку вядомых ваенных, палітычных і іншых падзей. У перыяд Рэчы Паспалітай Абодвух народаў назвы населеных пунктаў у пісьмовых крыніцах найчасцей пісаліся адпаведна лігвістычным асаблівасцям польскай мовы. У вусным вымаўленні адпаведна ставіўся націск. У перыяд уваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі напісанне і вымаўленне тапанімічных назваў у пісьмовых крыніцах пераважывае ўплыў рускай мовы. Так, напрыклад, маёнтак Czerlona на Гродзеншчыне (уладанне Масальскіх, Сапегаў, а з канца XIII ст. Друцкіх-Любецкіх) пачаў пісацца і вымаўляцца як Черлёна, Черліона. Трэба адзначыць, што ў пісьмовых крыніцах на рускай мове ў XIX – пачатку XX ст. часам імкнуліся перадаць гучанне назвы, таму, напрыклад, пісалася “им. Радзивоновичи” Фелікса Пуслоўскага ў Лунненскай воласці Гродзенскага павета (уезда), ці “хут. Грандзичи” Гожскай воласці, “хут. Чеховщизна” Горніцкай воласці таго ж павета. (Прыклады па “Списку землевладений в Гродненской губернии”, 1890).

2) доўгі час беларускамоўныя назвы былі вядомы вельмі абмежавана, яны выкарыстоўваліся пераважна ў вуснай мове насельніцтва. Пад уплывам лінгвістычных асаблівасцей беларускай мовы напісанне і гучанне тапанімічных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

назваў таксама змянялася, напрыклад, той жа маёнтак Друцкіх-Любецкіх пішацца як Чарлёна.

3) адміністрацыйныя рашэнні. Рашэнні аб змене назваў населеных пунктаў, вуліц, плошчаў і г.д. актыўна прымаліся ў савецкі перыяд гісторыі Беларусі, асабліва ў 1930-60-я гг. Мелася на мэце 1) пазбавіцца ад назваў, якія, па меркаванні савецкіх уладаў, адлюстроўвалі цяжкае жыццё народа да Кастрычніцкай рэвалюцыі, гучалі абразліва (што справядліва толькі часткова). 2) у новых назвах адлюстраваць надзеі на шчаслівае жыццё пры сацыялізме, ушанаваць падзеі савецкай гісторыі і рэвалюцыйнай барацьбы, а таксама памяць пра вядомых дзеячоў сацыялістычнага руху, дзеячоў БССР і СССР. Таму з'явілася шмат назваў тыпа Прагрэс, Ударнік, Новае жыццё, Першамайск, Акцябрскі, Дзяржынск, Пабеднае і інш. Большасць наданых назваў, як абгрунтавана паказалі даследчыкі, "з'яўляюцца надуманымі, няўдалымі, утворанымі з ігнараваннем законаў беларускай мовы і элементарнай логікі" (В. В. Шур). Разам з немілагучнымі назвамі былі заменены старажытныя і самабытныя народныя назвы. Напрыклад, Рудабелка на Акцябр, Ігумен на Чэрвень (рашэнне аб перайменаванні было прынята ў Чэрвені, адкуль і назва), Койданава на Дзяржынск, Дрыса на Верхнядвінск, Прапойск на Слаўгарад, Шацілкі на Светлагорск, Белы Бераг на Красны Бераг, Каралін на Ельск і інш. Няведанне беларускай мовы прывяло да ўзнікнення такіх назваў, як, напрыклад, Пабеднае, Пабядзіцель, Сіреневка, Зара Новай Жызні, Барба, Труд і інш. У населеных пунктах усе цэнтральныя вуліцы атрымалі свайго роду класічны набор назваў: Леніна, Ленінская, Маркса, Энгельса, Савецкая, Камсамольская, Камуністычная, Першамайская. Былі выпадкі, калі змены назваў наносілі асабліва вялікую страту гістарычнай памяці, напрыклад, вёска Гавязна перайменавая ў Вішнявец у 1964 г., як высветлілася была адзіным тапонімам за ўсю гісторыю на Беларусі. Працягваецца доўгае барацьба мясцовай інтэлігенцыі за вяртанне старажытнай назвы.

У 1964 г. было перайменавана больш за 300 сельскіх пасяленняў. Зроблена гэта было, па меркаванні спецыялістаў, беспадстаўна і няўдала. Замест Фальварак, Моргі, Старцэвічы, Чарлёна з'явіліся Сіреневка, Лучезарная, Рошча, Ковровая, Плодовая і г.д. Вёскі, якія называліся Амерыка сталі Савецкай у Жлобінскім раёне і Краснапольцамі ў Аршанскім раёне і г.д.

4) З цягам часу змяняюцца вымаўленне і націскі тапонімаў. Напрыклад, да вайны гаварылі Ра´дошковічы, Кале´нковічы, Рогова´. Змяняюцца вытворныя ад іх паняцці, напрыклад, многія стагоддзі назад жыхары Мінска называлі сябе "міняне".



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вынікі.* Пад уплывам неспрыяльных фактараў беларуская тапанімія да другой паловы XX ст. не толькі змянялася не ў лепшы бок, але і не вывучалася. Прафесар В. П. Лемцюгова канстатавала: “Топонимия ни одной страны не оказалось в столь заброшенном состоянии, как белорусская”.

У пачатку XXI ст. патрабавалася змяняць становішча: стварыць нармалізаваную сістэму айчынных тапонімаў на нацыянальнай мове. Трэба адзначыць вялікія намаганні вучоных, у т.л. Рэспубліканскай тапанімічнай камісіі пры НАНБ, якую узначальвала доктар філалагічных навук Валянціна Пятроўна Лемцюгова . Важнейшай задачай была стандартызацыя беларускай тапаніміі па міжнародных стандартах. З гэтай з ініцыятывай выступіла В. П. Лемцюгова. Адным з важных кірункаў рэалізацыі задачы было абгрунтаванне і выкананне навуковай тэмы “Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь”.

Нармалізацыя айчыннай тапаніміі пачалася ва ўмовах, калі не існавалі беларускія арыгіналы тапонімаў. Усе існуючыя афіцыйныя спісы былі аформлены на рускай мове без націскаў, скажалі фанечныя асаблівасці і нават сэнс назваў. Напрыклад, сельскія пасяленні, адлюстраваныя ў гэтых спісах, як Ольница, Ожики, на самой справе у вымаўленні мясцовага насельніцтва гучалі як Вольніца і Вожыкі.

Паступова значэнне нацыянальнай тапаніміі ў грамадстве асэнсоўвалася ўсё больш адэкватна. У 2010 г. быў прыняты *«Закон о наименованиях географических объектов» (*змяненні ў 2012 г.) Згодна Закона Прэзідэнт РБ ажыццяўляе адзіную дзяржаўную палітыку ў вобласці найменняў геаграфічных аб’ектаў і прысвойвае назвы абласцям, раёнам, раёнам гарадоў абласнога падпарадкавання і сталіцы, пераймяноўвае іх, пераймяноўвае гарады, вызначае парадак дзяржаўнага ўліку найменняў геаграфічных аб’ектаў, стварэння і вядзення Дзяржаўнага каталога найменняў геаграфічных аб’ектаў Рэспублікі Беларусь;

Савет Міністраў (СМ) дае найменні фізіка-геаграфічным аб’ектам, вядзе Дзяржаўны каталог найменняў геаграфічных аб’ектаў РБ, стварае тапанімічную камісію пры СМ РБ.

Дзяржкамітэт па маёмасці РБ вызначае правілы і спосабы перадачы найменняў геаграфічных аб’ектаў з беларускай мовы на рускую, з рускай мовы на беларускую, і з беларускай і рускай мовы на іншыя мовы, правілы транслітэрацыі назваў геаграфічных аб’ектаў літарамі лацінскага шрыфта.

Абласныя Саветы дэпутатаў могуць перайменоўваць гарады раённага падпарадкавання, пасёлкі гарадскога тыпу, сельсаветы.

Гарадскія, раённыя, пасялковыя і сельскія саветы дэпутатаў прысвойваюць назвы састаўным часткам падпарадкаваных ім аб’ектаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Не глядячы на відавочнае прызнанне ролі нацыянальнай тапаніміі, на жаль, яшчэ не вернуты многія беспадстаўна адвергнутыя старажытныя назвы. Не заўсёды чыноўнікі выступаюць праваднікамі перадавых ініцыятыў у галіне нацыянальнай і рэгіянальнай тапаніміі, а грамадзяне рэгіёну таксама ў ёй недастаткова дасведчаныя. Таму на бібліятэкарах ляжыць асветніцкая задача: збіраць і папулярызаваць звесткі па мясцовай тапаніміі.

У першую тройку беларускіх гарадоў з самай вялікай колькасцю вуліц, па дадзеных сэрвісу Яндэкс.Карты, увайшлі Мінск, Магілёў і Віцебск. Магілёў заняў ганаровае другое месца - 900 вуліц. Усяго у сталіцы і абласных гарадах - амаль 5 тыс. вуліц, завулкаў, праездаў, тупікоў і плошчаў. Больш за 2 тыс. маюць унікальныя назвы

Каля 44% паўтаральных тапонімаў апісваюць геаграфічнае становішча, паказваюць на асаблівасці прыроды або самой вуліцы. Пятая частка (22%) распаўсюджаных назваў абавязаная сваім з'яўленнем савецкага мінулага і дзеячам рэвалюцыі: вуліцы Леніна, Карла Маркса, Піянерская.

На трэцім месцы па папулярнасці (19%) – назвы ў гонар герояў, палкаводцаў і лётчыкаў, у тым ліку Чкалава, Гастэлы, Суворава і Будзёнага. Менш шматлікія вуліцы, названыя ў гонар пісьменнікаў, навукоўцаў і мастакоў: Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Пушкіна і Рэпіна.

Яндэкс звярнуў увагу і на іншыя асаблівасці беларускіх гарадоў. Так, у Магілёве можна прагуляцца па завулках кампазітараў: Шуберта, Шапэна, Моцарта і Бетховена. Брэст непаўторны кварталамі прыватнай забудовы з лірычнымі назвамі: вуліцы Вольная, Добрая, Звонкі і г.д. Цікавыя тапонімы сустракаюцца і ў Гродне, дзе ёсць вуліцы Ветлівая, Сяброўская, Багатая, Шчодрая і Экзатычная.

*Крыніцы па тапаніміцы беларускіх рэгіёнаў.* Да ліку галоўных сучасных крыніц тапанімікі адносіцца Дзяржаўны каталог найменняў геаграфічных аб'ектаў Рэспублікі Беларусь. Яго мэты:

- забеспячэнне аднастайнага і ўстойлівага ужывання назваў геаграфічных аб'ектаў ва ўсіх заканадаўчых актах, афіцыйных дакументах, даведачных і энцыклапедычных выданнях, у перапісцы, у сродках масавай інфармацыі, на якія ствараюцца картах і атласах;

- захаванне назваў геаграфічных аб'ектаў як складовай часткі гістарычнай і культурнай спадчыны народа Рэспублікі Беларусь;

- задавальненне патрэбнасцей рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, прадпрыемстваў і ўстаноў, фізічных і юрыдычных асоб у афіцыйнай інфармацыі аб нармалізаваных назвах геаграфічных аб'ектаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзяржаўны каталог ўяўляе сабой электронную базу даных найменняў геаграфічных аб'ектаў Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна актуалізуюцца на падставе афіцыйных крыніц інфармацыі аб назвах геаграфічных аб'ектаў. Эксплуатацыя Дзяржаўнага каталога ажыццяўляецца установай «Дзяржаўны цэнтр картографа-геадэзічных матэрыялаў і даных Рэспублікі Беларусь» (Дзяржкартгеацэнтр).

Даныя Дзяржаўнага каталога ўваходзяць у склад Дзяржаўнага картографа-геадэзічнага фонду Рэспублікі Беларусь і адносяцца да інфармацыйнага рэсурсу, які мае дзяржаўнае значэнне. Зарэгістраваныя ў Дзяржаўным каталогу нармалізаваныя назвы геаграфічных аб'ектаў з'яўляюцца абавязковымі для ўжывання ў нарматыўных прававых актах, на тапаграфічных картах і планах, у сродках масавай інфармацыі. Уся інфармацыя ў Дзяржаўным каталогу дакументальна пацверджана.

Дзяржаўны каталог змяшчае назвы геаграфічных аб'ектаў на беларускай, рускай мовах і ў лацінскай графіцы з беларускай мовы, а таксама дадатковую інфармацыю пра іх.

Назвы геаграфічных аб'ектаў маюць рэгістрацыйны нумар, род аб'екта, геаграфічныя каардынаты, наменклатуру тапаграфічнай карты маштабу 1:100 000, на якой адлюстраваны геаграфічны аб'ект, адміністрацыйную прывязку (вобласць, раён, сельсавет), код па СААТО (сістэме абазначэнняў аб’ектаў адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу і населеных пунктаў) і іншыя неабходныя атрыбуты. (Код СААТО вядзецца Міністэрствам па налогах і зборах у даведніку “Справочник населенных пунктов”).

Да гэтых інфармацыйных рэсурсаў могуць звяртацца бібліятэкі, афарміўшы неабходныя запыты.

У паўсядзённай практыцы бібліятэкару неабходна выяўляць, вывучаць і выкарыстоўваць разнастайныя выданні, у якіх маюцца звесткі тапанімічнага характару. Тыпы і віды выданняў і змястоўнае іх кола цяжка акрэсліць, таму што тапанічная інфармацыя вельмі рассейваецца. Але ёсць пэўнае кола крыніц, якія асабліва каштоўныя для папулярызацыі тапанімічных ведаў.

Класіфікацыя выданняў па тапаніміцы можа праводзіцца па шэрагу прымет: з якіх асабліва важныя знакавая прырода інфармацыі і мэтавае прызначэнне.

Па знакавай прыродзе інфармацыі значныя аб’ёмы тапанімічных звестак адлюстроўваюцца ў тэкставых выданнях, картаграфічных выданнях, фотаальбомах і інш. Карты перыяду ВКЛ змяшчалі назвы на лацінскай мове мовах. Напрыклад, лепшая карта гэтага перыяду “Magni Ducatus Lithuaniae…” Т. Макоўскага адлюстроўвае ўсе населеныя пункты Беларусі і прыродна-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

геаграфічныя аб'екты. Вучоныя БДУ і МГУ ў 1990-я гг., даследуючы даставернасць карты, не знайшлі ў іншых пісьмовых крыніцах перыяду ВКЛ толькі 5 населеных пунктаў, нанесеных на ёй. Гэта паказчык высокай дакладнасці карты. Шмат карт было створана ў перыяд уваходжання беларускіх зямель у Расійскую імперыю. Асабліва каштоўнымі лічацца карты Ваенна-тапаграфічнага ведамства. Карты гэтага часу публікаваліся ў розных выданнях, у т.л. часам у "Памятных кніжках губерняў", выданні, якое адносіцца да ліку дакладных і даступных крыніц. Шмат гістарычных карт розных перыядаў адлюстравана ў сучасных даведачных выданнях, у т.л. энцыклапедыях, у навуковых выданнях і ў Нацыянальных геаграфічных і гістарычных атласах (1992 г. і інш.) У БССР і РБ картаграфічная дзейнасць вядзецца на высокім узроўні. Картаграфічная прадукцыя рыхтавалася і рыхтуецца картаграфічнымі цэнтрамі – зараз гэта аддзел геадэзіі і картаграфіі Белдзяржкаммаёмасці. Ствараюцца адміністрацыйна-тэрытарыяльныя, фізіка-геаграфічныя, гістарычныя, экалагічныя і іншыя карты абласцей, раёнаў, гарадоў. Для ўдакладнення і стварэння новых карт прыцягваюцца вучоныя НАН (Інстытута гісторыі. Напрыклад, з іх удзелам створана новая карта "Беларусь у сярэдзіне XVI ст."). На сучасным этапе карты, (гістарычныя і сучасныя) даступныя праз Інтэрнет, напрыклад, партал "Мир карт", праз сайты абласных і раённых органаў выканаўчай улады, краязнаўчыя сайты, персанальныя сайты гісторыкаў (напрыклад, на сайце вядомага гісторыка і краязнаўцы В. Л. Насевіча, электронныя гістарычныя карты).

Шырока выкарыстоўваюцца бібліятэкарамі афіцыйныя выданні, даведачныя выданні, навуковыя выданні, навукова-папулярныя выданні, вучэбныя выданні.

*Афіцыйныя выданні* змяшчаюць рашэнні аб назвах населеных пунктаў, вуліц, прадпрыемстваў, навучальных установаў і іншых мікратапанімічных аб'ектаў. Галоўны інфармацыйны рэсурс – прававая інфармацыя НЦПІ. На рэгіянальным ўзроўні, які пакуль не адлюстроўваецца ў БД НЦПІ, бібліятэкары павінны сачыць за афіцыйнымі рашэннямі мясцовых органаў улады.

*Даведачныя выданні: даведнікі, слоўнікі, хронікі.*

Асаблівае значныя, у т.л. для індэксавання краязнаўчых дакументаў, рэгіянальныя тапанімічныя даведачныя выданні. "Слоўнікі назваў населеных пунктаў" Я. Н. Рапановіча. Былі выдадзены ў БССР выйшлі з друку па шасці абласцях. Пры падрыхтоўцы слоўнікаў аўтар выкарыстоўваў крыніцы:

– запісы на месцы – ад старажылаў вёсак, былых мястэчак, пасёлкаў, хутароў і інш. На працягу 1947-1981 гг. ён вёў збор такіх матэрыялаў. Я.Рапановіч быў перакананы, што "сапраўднай афіцыйнай формай айконіма, як



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і ўсякага іншага тапаніма, неабходна лічыць назву, якой карыстаецца сам народ”.

– перапіска з мясцовымі карэспандэнтамі

– друкаваныя матэрыялы (карты, даведнікі, зборнікі законаў, спісы і інш.)

У першай частцы даюцца назвы ўсіх паселішчаў (гарадоў, гарадскіх пасёлкаў, былых мястэчак, вёсак, засценкаў, хутароў, чыгуначных станцый, раз’ездаў), якія ёсць на сучаснай тэрыторыі вобласці. Я.Н. Рапановіч указвае тып населенага пункта; дату, калі ён у час БССР атрымаў гэты статус; адзначаецца падпарадкаванне (абласное, раённае); паказваецца, цэнтрам чаго з'яўляецца населены пункт, у якім с/с і раёне знаходзіцца. Прыведзены скланенні назваў населеных пунктаў, род, беларускі і рускі прыметнікі, утвораныя ад айконімаў. Для перайменаваных населеных пунктаў адзначаны год змены назвы і старая назва. Старыя і новыя назвы звязаны спасылкамі. У тых выпадках, калі мясцовая народная назва не супадае з афіцыйнай пісьмовай, якая ўжо трывала замацавалася ў розных друкаваных крыніцах, што нават пачала выцясняць мясцовую, Я. Н. Рапановіч падаў дзве назвы – спачатку афіцыйную пісьмовую, а затым у дужках мясцовую народную. У другой частцы слоўнікаў змешчаны таксама ў алфавітным парадку назвы раёнаў, пасялковых і сельскіх саветаў, калгасаў, саўгасаў. Пры раёнах паказаны: дата ўтварэння, плошча, цэнтр, адлегласць ад цэнтра да бліжэйшай чыгуначнай станцыі ці раз’езда, да абласнога цэнтра і Мінска і іншыя даныя. Напрыклад, у слоўніку, прысвечанаму Магілёўскай вобласці 3381 назва, якая распаўсюджваецца на 4369 населеных пунктаў. Сярод іх 795 паселішчаў, спаленых падчас Айчыннай вайны. Указана ўздзеянне аварыі на ЧАЭС: “Гайкоўка. в. у Дзеражненскім с/с Касцюковіцкага р-на, але зараз няма ні гэтай вёскі, ні цэнтра с/с.”

У слоўніках змешчаны карты абласцей з раённымі гарадамі, паказальнікі назваў населеных пунктаў, спісы выкарыстанай літаратуры, прадмовы, дзе складальнік характарызуе вобласці, асаблівасці працы над чарговым выпускам. У спісах літаратуры ўказаны розныя крыніцы, у т.л. нумары раённых газет.

У 2000-я г. выйшлі нарматыўныя даведнікі *“Назвы населеных пунктаў...вобласці”*. Гэта выданне падрыхтавалі Рэспубліканская тапанімічная камісія пры НАН Беларусі, Інстытут мовазнаўства НАН Беларусі і цэнтр картаграфіі і геадэзіі краіны.

Структура выдання адпаведна адміністрацыйна-тэрытарыяльнаму падзелу абласцей (што, магчыма не зусім зручна для хуткага пошуку). Ахоплены назвы ўсіх тыпаў пасяленняў, прастаўлены сучасныя націскі. Маюцца паказальнік назваў населеных пунктаў на беларускай, рускай мовах і лацінскай графікай і паказальнік страчаных назваў населеных пунктаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Безумоўна, гэта выданне прадстаўляе значную каштоўнасць і актыўна выкарыстоўваецца для індэксавання краязнаўчых дакументаў і ў іншай дзейнасці.

Падрыхтоўка тапанімічных слоўнікаў пашыраецца, яны ахопліваюць тапаніміку раёнаў і асобных пасяленняў: "Родные названия: топонимический словарь Гомеля и окрестностей" (2004) са значным спісам літаратуры, "Анамастычны слоўнік Гродзеншчыны: Тапаніміка» (2006), "Назвы нашых мясцін" (аб паходжанні назваў Пастаўшчыны, 2013), "Паходжанне назваў населеных пунктаў Баранавіцкага раёна" (2019) і інш.

*Даведачныя выданні, у якіх спадарожна прадстаўлены тапанімічныя даныя.* Тапанімічныя назвы можна адшукаць па энцыклапедыях, асабліва па "Беларускай энцыклапедыі" у 18 т., "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" у 6 т., "Гарады і вёскі Беларусі" у 15 т. і інш. Такую інфармацыю змяшчаюць і многія выпускі серыі гісторыка-дакументальных хронік "Памяць", выйшла 145 т. У многіх кнігах ёсць і спісы страчаных населеных пунктаў.

Тапанімічныя звесткі падаюцца ў рэгіянальных хроніках. Выдатны тапанімічны матэрыял, напрыклад, змяшчае "Хроніка Убарцкага Палесся" А. Атнагулава.

Сярод выданняў мінулага неабходна вылучыць асобна некалькі груп выданняў:

1) Кнігі "Метрыкі Вялікага княства Літоўскага"– змяшчаюць геаграфічныя паказальнікі, у якіх адлюстраваны масівы назваў населеных пунктаў і іншых геаграфічных аб'ектаў на перыяд ВКЛ.

2) Спісы населеных пунктаў губерняў, якія рыхтаваліся губернскімі статыстычнымі камітэтамі ў перыяд Расійскай імперыі. На пачатку XX ст. выйшлі асобнымі выданнямі даведнікі "Список населенных мест Минской губернии" (1912), "Список населенных мест Могилевской губернии" (1910) і інш. Крыніцамі пошуку могуць быць агульныя даведачныя выданні часоў Расійскай імперыі, прысвечаныя населеным пунктам. Выпускаліся яны Цэнтральным статыстычным камітэтам Міністэрства ўнутраных спраў. Так, у даведніку "Городские поселения в Российской империи» (Т.1 – 3, СПб., 1860 – 1863) пададзены звесткі аб адпаведных пасяленнях на тэрыторыі беларускіх губерняў, напрыклад, т. 3 «Минская губерния», 1863. – 154 с. У даведніку "Волости и гмины 1890 года» былі адлюстраваны спіскі населеных пунктаў Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай губерняў.

Сістэматычна розныя тапанімічныя назвы адлюстроўваліся ў "Памятных книжках губерний", "Обзорах губерний", якія выдаваліся ў другой палове XIX ст. да першай сусветнай вайны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асаблівай увагі бібліятэкара заслугоўвае мульцімедыйнае выданне НББ “Региональная история Беларуси в документах и материалах Виленской археографической комиссии (1864-1915). Назвы населеных пунктаў і іншых аб’ектаў, якія ўзгадваюцца ў актавых зборніках, адлюстраваны ў дапаможным геаграфічным паказальніку. Дадаткова ўказана іх адпаведнасць сучасным назвам адміністрацыйна-тэрытарыяльных і фізіка-геаграфічных аб’ектаў Рэспублікі Беларусь.

3) Польскамоўныя даведачныя выданні. Менавіта ў іх можна знайсці не толькі звесткі пра дробныя аб’екты, якія зніклі з тэрыторый і забытыя, але таксама магчыма ўбачыць напісанне назваў, месца аб’екта паводле дзеючага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу.

Сярод такіх выданняў важнейшымі з'яўляюцца: “Слоўнік геаграфічны каралеўства Польскага і прылягаючых тэрыторый” (“Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich”, 1880-1902,) які адлюстроўвае тысячы тапанімічных назваў Беларусі і даведачныя выданні, здзейсненыя ў Другой Рэчы Паспалітай Польскай.

У ліку апошніх значнае месца займаюць спісы населеных пунктаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі па матэрыялах усеагульнага перапісу і спісы, выпушчаныя апаратам ваяводстваў.

У Польшчы 30 верасня 1921 г. быў праведзены ўсеагульны перапіс насельніцтва. Галоўнае ўпраўленне статыстыкі Рэчы Паспалітай Польскай на падставе даных перапісу і іншых афіцыйных крыніц апублікавала ў першай палове 20-х гг. XX ст. шматтомны “Skorowidz miejscowoœci RP Polskiej” (“Паказальнік мясцовасцей РП Польскай”, дзе былі пералічаны ўсе населеныя пункты краіны, у т.л. на тэрыторыі беларускіх зямель. Напрыклад, частка другая 7-га тома „Ziemia Wileñska” – Powiaty Braslaw, Dunilowicze, Dzisna i Wilejka – W-wa, 1923. Адзначаны * (зорачкай) мясцовасці, якія падчас першай сусветнай вайны былі знішчаныя і ў мірны час незаселеныя. У канцы алфавітны спіс мясцовасцей.

4) У БССР выпускаліся ў розныя гады даведнікі, якія інфармавалі аб адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелу, змяшчалі пералікі адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак і населеных пунктаў. Напрыклад, “Спіс сельскіх саветаў БССР” (1930), “Список населенных мест БССР” (бывшей Минской губернии) (1924).

5) Архівы Рэспублікі Беларусь пачалі выданне геаграфічных паказальнікаў да пагаспадарчых кніг. Геаграфічны паказальнік у 3-х частках у 2013 г. выпусціў Занальны дзяржаўны архіў у г. Глыбокае. Гэта: географический указатель к похозяйственным книгам населенных пунктов



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Глубокскага, Дунілавічскага, Пліскага, Пастаўскага, Бягомльскага, Браслаўскага, Відзаўскага, Докшыцкага, Дзісненскага, Міёрскага, Шаркаўшчынскага раёнаў за 1949 – 2006 гг.

*Навуковая і навукова-папулярная літаратура тапанімічнага зместу.* Тапанімічныя даныя часцей за ўсё з'яўляюцца адным з кірункаў гістарычных і комплексных даследаванняў населеных пунктаў, таму часта трапляюць у манаграфіі, навуковыя артыкулы, дысертацыі.

*Кірункі выкарыстання крыніц тапанімікі ў краязнаўчай рабоце бібліятэкі.* У бібліятэках праводзяць разнастайную работу па набыцці выданняў тапанімічнага зместу, іх папулярызацыі, прамоцыі тапанімічных ведаў.

У КДБА бібліятэк ствараюцца элементы, якія адпавядаюць хуткаму знаходжанню бібліяграфічнай і фактаграфічнай інфармацыі аб найменнях рэгіянальных геаграфічных аб’ектаў. Гэта напаўненне бібліяграфічнымі запісамі рубрыкі М 196 “Тапаніміка. Картаграфія. Карты краю” сістэматычнай краязнаўчай картатэкі/каталога, адлюстраванне тапанімічных дакументаў у фактаграфічных картатэках, у бібліяграфічных і фактаграфічных краязнаўчых БД. Бібліятэкі камплектуюць у КДБФ слоўнікі назваў населеных пунктаў вобласці і больш дробных тэрыторый, зборнікі легенд і паданняў пра паходжанне назваў, іншыя даведнікі, навуковыя, навукова-папулярныя выданні, у якіх прадстаўлена значная тапанімічная інфармацыя пра рэгіён, афармляюць папкі газетных выразак данай тэматыкі. Павінны выкарыстоўвацца бібліяграфічныя дапаможнікі, падрыхтаваныя вядомымі даследчыкамі М.В.Бірыла і В.П.Лемцюговай, якія маюць назву “Працы па беларускай анамастыцы”. Друкаваліся самастойнымі выданнямі і ў зборніку “Беларуская анамастыка”.

Тым не менш, крыніц не хапае і бібліятэкары-бібліёграфы зараз актыўна ўдзельнічаюць у зборы тапанімічнага матэрыялу. Так, пры стварэнні летапісаў вёсак па ўсёй краіне бібліятэкары выяўлялі дакументныя крыніцы пра паходжанне мясцовых назваў, запісвалі вусныя паданні. Пэўная інфармацыя аб паходжанні назваў адлюстравана ў базах даных, картатэках тапонімаў, даведніках, створаных у бібліятэках.

Удзел у карпаратыўнай каталагізацыі актуалізаваў пытанне аб папаўненні нацыянальнага аўтарытэтнага слоўніка геаграфічных назваў тапанімічнымі адзінкамі рэгіянальнага ўзроўню, – работа, якую вядуць АУБ і ЦБС.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма “КРЫНІЦЫ ІНФАРМАЦЫІ АБ РЭГІЯНАЛЬНЫХ АСАБЛІВАСЦЯХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ”**

Беларуская мова з'яўляецца адной з галоўных характарыстык беларускага народу, вялікім нацыянальным скарбам, адназначна дазваляе ідэнтыфікаваць асобу, нацыю, краіну. Карані беларускай мовы ў глыбокай старажытнасці: каля 10% сучаснай лексікі мае ўзрост больш за 3000 гадоў.

Беларуская мова за часы свайго доўгага існавання значна змянілася. У сярэднявеччы яна функцыянавала ў выглядзе ранняга слабаарганізаванага крывіцка-дрыговіцка-люціцкага кайнэ і шэрагу дыялектаў і толькі з ўзнікненнем ВКЛ з гэтых складовых частак утварылася кайнэ ВКЛ.

Кайнэ ВКЛ грунтавалася на дыялектах крывічоў полацкіх, віленскіх і смаленскіх, дрыгавічоў, радзімічаў, валынян, северан, літвы (люцічаў) з ужываннем элементаў дыялектаў іншых славянскіх і балцкіх плямёнаў. Кайнэ ВКЛ хутка стала дамінантным на абшарах усёй краіны. Асаблівасці дыялектаў сціраліся, фарміравалася агульнадзяржаўная мова. Велічыня і магутнасць Вялікага княства (ад Балтыйскага да Чорнага мора і ад Карпат да Акі) абумовіла веліч і магутнасць яго мовы.

У сілу гістарычнай і геаграфічнай сітуацыі мова ВКЛ (ліцвінская, або беларуская) у XIII - XVI стагоддзях была *адзінай* дзяржаўнай пісьмовай мовай.

Беларуская мова – захавальніца гістарычнай памяці народа з XVII ст. да нашага часу існавала ў больш ці менш непрыхільных умовах і нават на працягу 209 гадоў (1696 – 1905) пад юрыдычнай забаронай. Рэдка калі ў гісторыі ў падобных умовах мове даводзілася захавацца і аднавіцца, хаця прыклады ёсць (ірландская мова, фінская мова). У XX ст. гістарычныя ўмовы спрыялі аднаўленню беларускай мовы і нават звароту яе дзяржаўнага статуса. За стагоддзі забароны і выцяснення з ужытку ў інтэлектуальных эліт беларуская мова патрабавала самай сур’ёзнай і працяглай дзяржаўнай падтрымкі і ўкаранення. Такую падтрымку беларуская мова атрымала ў 1920-я гг. падчас унутранага курса на “беларусізацыю”. У зборы моўнага матэрыялу для фарміравання літаратурнай, у т.л. навуковай, беларускай мовы, тады прымалі краязнаўцы, навучэнцы, настаўнікі і інш.

Кожная мова існуе ў многіх варыянтах – тэрытарыяльных, сацыяльных, і нават індывідуальных. Літаратурная мова, якую фарміруюць мовазнаўцы, з’яўляецца ідэалам, выпрацоўваецца на аснове жывой народнай (дыялектнай) мовы, яна строга унармаваная. Беларуская мова існуе ў формах літаратурнай і дыялектных моў, якія знаходзяцца ў цеснай сувязі і ўзаемадзеянні. Літаратурная мова выкарыстоўваецца ў адукацыі, абслугоўвае разнастайныя патрэбы культурнага, навуковага і грамадскага жыцця. Яна гучыць ў СМІ, на ёй

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пішуцца навуковыя працы, заканадаўчыя дакументы, вядзецца выкладанне ў сістэме адукацыі. Людзей, якія валодаюць літаратурнымі стандартамі сваёй роднай мовы, няшмат ва ўсім свеце. Так, на літаратурнай беларускай мове гавораць 3 – 5 % асоб.

Дыялектная мова – гэта тэрытарыяльна абмежаваная мова і неаднолькавая ў розных мясцінах, мае вусную форму, выкарыстоўваецца ў літаратурна-мастацкіх, мемуарных і іншых творах. Дыялекталогія – гэта раздзел мовазнаўства, які займаецца вывучэннем дыялектнай мовы і дыялектаў.

Гаворкі – найдрабнейшая адзінкі дыялектнай мовы. Кожная гаворка ўяўляе сабой пэўную сістэму фанетычных, граматычных, лексіка-фразеалагічных асаблівасцей. Група ці некалькі груп мясцовых гаворак, аб'яднаныя агульнымі рысамі ў фанетыцы, граматычным і лексічным складзе, утвараюць дыялект. Дыялекты з'яўляюцца найбольш буйнымі этна-генетычнымі моўнымі элементамі. Дыялекты і гаворкі ўтвараюць жывую мову, якая даволі хутка змяняецца. Жывую мову трэба адрозніваць ад літаратурнай.

У беларускіх гарадах паўсядзённыя зносіны ідуць на рускай мове, аднак руская гаворка большасці беларусаў з сярэдняй адукацыяй, а таксама ў значнай ступені і з вышэйшай, утрымлівае інтэрферэнтныя з'явы, абумоўленыя народна-беларускім субстратам (у невялікіх пасяленнях). Носьбітаў "беларускага варыянту" рускай мовы распазнаюць па вымаўленні, інтанацыі, фразеалогіі, лексіцы. Так, іх можна вылучыць, пачуўшы "ни в коем разе", "яиц". Уплыў беларускай мовы адчувальны таксама ў мове рускага насельніцтва Беларусі (хоць і ў меншай меры, чым у мове беларусаў).

Шырока распаўсюджана зараз пасіўнае валоданне беларускай мовай: г. зн. разумеюць яе, чытаюць, слухаюць тэксты на ёй. Хаця многія людзі сцвярджаюць, што не карыстаюцца беларускай мовай, але 74% прызнаюць яе роднай і гэта важна. Таму пры змене "піраміды прэстыжнасці" беларуская мова можа заняць належна становішча, якое павінна мець як мова тытульнай нацыі.

Вывучэнне рэгіянальных асаблівасцей беларускай мовы пачалося ў XIX ст. Зборам слоўнага матэрыялу, апісаннем асаблівасцей вымаўлення, тлумачэннем сэнсу слоў і выразаў займаліся краязнаўцы-афіцэры Генштаба расійскай арміі Баброўскі, Зеленскі, даследчыкі І. І. Насовіч, П. В. Шэйн, Е. Р. Раманаў і інш. У міжваенны перыяд збор моўнага матэрыялу актыўна вялі шматлікія ўдзельнікі краязнаўчага руху пад кіраўніцтвам Цэнтральнага бюро краязнаўства. Выдатныя зборы моўнага матэрыялу падрыхтавалі М. І. Каспяровіч, І. К. Бялькевіч, М. В. Шатэрнік і інш. Да даследаванняў беларускай мовы ў пасляваенны перыяд прыступілі Інстытут мовазнаўства імя Я. Коласа Акадэміі навук БССР, рэгіянальныя педыінстытуты, а зараз рэгіянальныя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўніверсітэты. У пасляваенны час выдатны ўклад у вывучэнне беларускай дыялекталогіі ўнеслі М. В. Бірыла, Ю. Ф. Мацкевіч, П. У. Сцяцко і інш.

Буйнейшымі кампанентамі беларускай мовы з'яўляюцца два дыялекты і дзве вялікія групы гаворак. У Беларусі два дыялекты: паўночна-усходні і паўднёва-заходні. Набліжаюцца да дыялектаў так званыя сярэднебеларуская група гаворак і заходне-палеская група гаворак. Дыялекты і сярэднебеларуская група гаворак разам складаюць асноўны масіў гаворак нацыянальнай беларускай мовы, які тэрытарыяльна супрацьстаіць па сваіх асаблівасцях заходне-палеская групе гаворак. Гэта група гаворак ахоплівае Пружаны, Бярозу, Лунінец, Кобрын, Брэст, Іванава, Драгічын, Камянец, Маларыту. Дыялект беларуска-украінскага моўнага сумежжа. Сучасныя дыялекты беларускай мовы вядуцца з феадальнага перыяду, вучоныя зафіксаваны тэрытарыяльныя асаблівасці маўлення менавіта ў той час. У наш час новая тэрыторыя дыялектаў не ўтвараецца. Пад уплывам літаратурнай мовы дыялектныя асаблівасці сціраюцца, але як сродак зносін яны яшчэ захоўваюцца. Літаратурнай мове і гаворкам абодвух дыялектаў уласціва аканне, яканне, зацвярджэнне шыпячых і этымалагічнага е, дзеканне і цеканне, тры катэгорыі роду, ліку, два спражэнні. Сучасныя дыялекты захоўваюць шмат архаічных рыс: гукі, граматычныя формы ў сістэме скланення і спражэння, тыпы словазлучэнняў і сказаў. Напрыклад, у гаворках паўднёва-заходняга дыялекту захавалася форма клічнага скланення (мамо, тато, Іване), форма парнага ліку, які ўжываецца тады, калі гаворыцца пра 2 – 4 прадметы (тры стулы, дзве кнігі) і інш.

*Паўночна-Усходні дыялект аб’ядноўвае 3 групы гаворак:*

Віцебскую

Усходне-магілёўскую

Полацка-мінскую

Для паўночна-усходняга дыялекту характэрным з'яўляецца адсутнасць акання і якання (пчыла, сліза), мяккае р’ (рябый, бярёза, грібы, ціперь, сухарь), формы прыметнікаў мужчынскага роду на –ый, ій (добрый, маладый), наяўнасць ць (ідзець, нясець, кажыць, ходзіць), канструкцыі з вініцельным склонам тыпу (зрабіў стул, знайшоў грыб) і інш.

*Паўднёва-Заходні дыялект таксама ахоплівае 3 групы гаворак:*

Гродзенска-навагрудскую

Слуцкую

Мазырскую

Для паўднёва-заходняга дыялекту характэрна аканне і яканне (пчала, кажух, садох), зацверджанае р (грады, рабы, бяроза), формы прыметнікаў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мужчынскага роду на –ы, і (добры, малады, сухі), цвёрдая часціца са ў зваротных дзеясловах (смяяліса, выспаліса), моўныя канструкцыі ў родным склоне (зрабіў стула, знайшоў грыба) і інш.

Сярэднебеларуская група гаворак з'яўляецца пераходнай паміж двума дыялектамі, яны скла́ліся ў выніку ўзаеманакладання і размывання берагоў дыялектаў.

Для заходне-палескай групы гаворак характэрна оканне (вода, сорочка, трова, молодую), цвёрдасць зычных перад е і адсутнасць якання (вэсна, зэмля, вэдро), адсутнасць дзекання і цекання, вымаўленне мяккіх дз’ і ц’ або цвёрдых д і т (дзід, твэрдэ, двэра, дзівка), цвёрдасць зычных перад е, і (дэнь, вэчор, пэнь) і інш.

Людзі, якія размаўляюць на дыялектных мовах, напрыклад, на цудоўным вілейскім ці слуцкім дыялекце – зараз добра ўсведамляюць, што іх мова адрозніваецца ад чутай па радыё ці выкарыстоўваемай у прэсе – літаратурнай. Як правіла, яны лічаць, што размаўляюць: “на змешанай мове гаворым: слова беларускае, слова рускае, слова польскае”. Гэты тыповы адказ добра ведаюць дыялектолагі. “Часам пад паняццем “змешанасці” выступае прыкмета “неўнармаванасці”, – адзначыў вядомы лінгвіст доктар Генадзь Цыхун.

У краязнаўчай рабоце бібліятэк заўсёды надавалася пэўная ўвага мове мясцовага насельніцтва. У фонды збіраюцца публікацыі, прысвечаныя мове насельніцтва рэгіёна. Дыялектныя моўныя слоўнікі знаходзяць месца ў краязнаўчым даведачным фондзе бібліятэкі. Навуковая, даведачная і навукова-папулярная літаратура неабходна для выканання даведак. Неабходна адзначыць, што на сучасным этапе студэнтамі філолагамі абласных універсітэтаў выконваецца вялікая колькасць цікавых даследаванняў мовы і абласныя бібліятэкі і ЦБС павінны ўважліва ўдасканальваць інфармацыйныя рэсурсы па данаму раздзелу краязнаўства. Пытанні, звязаныя з мясцовай мовай цікавяць і настаўнікаў, і вучняў, журналістаў, пісьменнікаў і іншых карыстальнікаў бібліятэк. У публічных бібліятэках вядуцца папкі копій артыкулаў, прысвечаных мясцоваму маўленню. Акрамя выяўлення дакументаў, прысвечаных мове, публічныя бібліятэкі выступаюць ініцыятарамі збору рэгіянальнага моўнага матэрыялу. Такім чынам бібліятэкары становяцца даследчыкамі роднай мовы. Адна з прычын вызначэння данага кірунка краязнаўчай работы бібліятэк заключаецца ў тым, што мова даволі хутка змяняецца: перастае ўжывацца частка слоў, уключаецца новая лексіка, змяняецца вымаўленне і інш. Кожы перыяд часу, кожнае пакаленне характарызуецца пэўнымі моўнымі асаблівасцямі. Таму дыялектныя слоўнікі, якія выпускаюцца рэдка, адлюстроўваюць дакладна мову пэўнага перыяду. Для

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навукі, а таксама і для інфармацыйнага забеспячэння адукацыйных і іншых запытаў, важна мець крыніцы, якія б храналагічна непарыўна адлюстроўвалі б развіццё мовы.

Зараз жа публічныя бібліятэкі прыступілі к збору мясцовага моўнага матэрыялу, бібліятэкары рыхтуюць слоўнікі гаворак. Дубровенская ЦРБ выпусціла буклет “Што ні сяльцо – то слаўцо”, “А ў нас кажуць...” Ганцавіцкая ЦРБ імя імя В. Ф. Праскурава. Бібліятэкары Свіслацкай РЦБС збіралі моўны матэрыял у трох вёсках раёна, размешчаных у розных канцах рэгіёна. Выявілі моўныя адрозненні на гэтых тэрыторыях. Самым складаным было для іх дакладна зафіксаваць вымаўленне слоў.

Магчыма вылучыць наступныя крыніцы, якія адлюстроўваюць патэнцыял жывой беларускай мовы і моўнага асяроддзя ў рэгіёнах краіны: 1) дыялектныя слоўнікі, 2) навуковая, вучэбная і навукова-папулярная літаратура па рэгіянальнай лінгвістыцы (лінгвістычнай геаграфіі), 3) літаратурна-мастацкія творы, напісаныя з ужываннем мясцовай лексікі, 4) бібліяграфічныя крыніцы па дыялекталогіі.

1) Адным з кірункаў даследаванняў стала падрыхтоўка дыялектных слоўнікаў (абласных слоўнікаў) беларускай мовы. Дыялектныя слоўнікі – абласныя слоўнікі – жанр лінгвістычных даведнікаў, у якіх падаецца мясцовая лексіка абмежаванага тэрытарыяльнага пашырэння. Паводле прынцыпаў адбору лексічнага матэрыялу яны бываюць: 1) поўныя, якія апісваюць усю без выключэння лексіку пэўнай гаворкі.

2) дыферэнцыяльныя – у адрозненне ад поўных, уключаюць толькі тыя дыялектызмы, якімі дадзеная гаворка або група гаворак адрозніваецца ад слоўнікавага складу літаратурнай мовы. Дыферэнцыяльнымі слоўнікамі з'яўляюцца, напрыклад, слоўнікі “Краёвы слоўнік Чэрвеньшчыны” М. Шатэрніка (1929), “Слоўнік Гродзенскай вобласці” Т. П. Сцяшковіч (1983).

3) Зводныя (агульныя), якія змяшчаюць дыялектную лексіку розных рэгіёнаў, ці розных гаворак пэўнай нацыянальнай мовы, напрыклад, “Слоўнік беларускіх гаворак Паўночна-Заходняй Беларусі і яе пагранічча”, т.1-5 (1979-1986). Гэта рэгіён акрэслены тэрыторыяй паміж Верхнядзвінскам – Міёрамі – Докшыцамі – Валожынам – Клецкам – Ганцавічамі – Івацэвічамі – Пружанамі – Камянцом.

4) Дыялекталагічныя атласы, у якіх адлюстраваны межы распаўсюджання гаворак і дыляектаў.

Усе віды дыялектных слоўнікаў змяшчаюць словы, захоўваючы асаблівасці вымаўлення, а не правіл літаратурнай мовы, націску. Змяшчаюць тлумачэнні сэнсу слоў, прыклады выразаў, часам прыклады ўжавання ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фальклорных і літаратурна-мастацкіх творах. Для гэтага былі выкарыстана “Інструкцыя па збіранню матэрыялаў для складання абласных слоўнікаў беларускай мовы” ( У 3-х вып. 1959 – 1966 гг.). Дыялектныя слоўнікі даюць лексічныя асаблівасці аднаго з асноўных дыялектаў беларускай мовы. Яны ўключаюць дыялектную лексіку, у т.л. і словы, якія ўваходзяць у лексічны склад беларускай літаратурнай мовы, але маюць іншыя лексічныя або семантычныя адпаведнікі ў суседніх ці больш аддаленых беларускіх гаворках. Так, у Гродзенскім каля 10 тыс. з тлумачэннямі іх значэнняў і ілюстрацыйным матэрыялам, які перадае лексічныя асаблівасці сучасных гаворак, а таксама ўстойлівыя выразы:

Маслам кашы не папсуеш.

Вэджгацца – вазіцца, займацца.

Як у руку спаць – спраўдзіцца.

Як цюцька ў гразь – недарэчна.

Варта адзначыць, што акрамя складання новых слоўнікаў (“Фразеалагічны слоўнік Касаўшчыны” А. Зайкі, 2014, “Мотольський словник” Д. Кульбеды, 2018, Фразеалагічны слоўнік гаворак Гродзеншчыны М.А. Даніловіч, 2020), неаднаразова перавыдаваліся слоўнікі, створаныя ў даваенны час.

2) Навуковая, вучэбная і навукова-папулярная літаратура, якая прысвечана вывучэнню лінгвістычнай геаграфіі Беларусі. У гэтай літаратуры прадстаўлены вынікі моўных даследаванняў ўсіх рэгёнаў Беларусі, а нярэдка і памежных тэрыторый. Лінгвістычная геаграфія – раздзел мовазнаўства, які вывучае тэрытарыяльнае пашырэнне моўных з’яў, іх ўзаемаразмяшчэнне адносна адна адной, узаемадзеяння паміж імі. Даныя лінгвістычнай геаграфіі – гэта не толькі аб’ект тлумачэння, але і крыніца звестак і заключэнняў аб паходжанні, развіцці і гісторыі моўных адзінак і з'яў.

Першым навуковым даследаваннем рэгіянальных асаблівасцей беларускай мовы была кніга П. А. Бузука “Спроба лінгвістычнай геаграфіі Беларусі”.

У межах лінгвістычнай геаграфіі ствараюцца лінгвістычныя атласы і карты. На кожнай карце выразна відаць тэрытарыяльнае бытаванне той або іншай моўнай зявы, т. с. акрэсліваюцца яе межы. Лінія на карце, праведзеная паміж адрознымі моўнымі зявамі паказвае пашырэнне кожнай з іх і называецца ізаглосай.

У пасляваенны перыяд Інстытут мовазнаўства імя Я.Коласа АН вывучаў жывыя гаворкі ў межах *нацыянальнай* тэрыторыі Беларусі, для чаго выкарыстоўвалася спецыяльная навуковая праграма, прызначаная для



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выяўлення сістэматызаваных дыялектных адрозненняў. У 1963 г. быў выдадзены Інстытутам мовазнаўства імя Я.Коласа АН “Дыялектны атлас беларускай мовы”. Уяўляе сабою сістэматызаваны набор лінгвістычных карт, на якіх пры дапамозе розных умоўных знакаў адлюстравана пашырэнне ў межах беларускай мовы разнастайных асаблівасцей яе гаворак. Адлюстраваны стан развіцця беларускіх гаворак на сярэдзіну ХХ ст. У першым раздзеле 7 гісторыка-адміністрацыйных і прыкладна 350 лінгвістычных карт, якія даюць інфармацыю пра фанетычную сістэму, граматычную структуру і лексічныя асаблівасці беларускіх гаворак. Гэтай працы была прысуджана Дзяржаўная прэмія ў 1971 г. Навуковая характарыстыка “Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы” (1963) прадстаўлена ў выданні “Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак” (Інстытут мовазнаўства імя Я.Коласа., 1968).

У 1993-99 гг. выйшаў “Лексічны атлас беларускіх народных гаворак” у 5-ці тамах.

У артыкулах, змешчаных у зборніках рэгіянальных лексікаграфічных прац, у “Весніках” і “Трудах” універсітэтаў і НАН Беларусі бібліятэкар можа выявіць важны навуковы матэрыял, прысвечаны моўным асаблівасцям свайго рэгіёну і асобных населеных пунктаў.

Вучэбная літаратура прадстаўлена вучэбнымі дапаможнікамі, хрэстаматыямі і іншымі выданнямі, напрыклад, як “Хрэстаматыя па беларускай дыялекталогіі” (2009).

У Інтэрнет “Беларускі дыялектны лексікаграфічны фонд” прадстаўляе шэраг дыялектных слоўнікаў, навуковых і іншых выданняў для вывучэння асаблівасцей рэгіянальнага маўлення.

## Тэма “МЕМУАРЫ ЯК КРЫНІЦЫ КРАЯЗНАЎЧЫХ ВЕДАЎ”

Мемуары – гэта аповяды і разважанні аб мінулым, заснаваныя на асабістым вопыце і памяці іх аўтараў. “Пад мемуарнай літаратурай разумеюць творы, у цэнтры якіх знаходзіцца асоба аўтара. Грамадскія падзеі ў іх паказаны не ўвогуле, а ў сувязі з гэтай асобай, праз яе суб’ектыўнае ўспрыманне. Трэба мець на ўвазе, што тэрмін “мемуарыстыка” (ад франц. і лац. слоў) ўжываецца і ў шырокім сэнсе, у якасці вызначэння цэлай групы крыніц, заснаваных на памяці, і ў вузкім – для вызначэння асобнага іх віду – успамінаў”. Усе мемуары заснаваны на памяці. Іх стварэнне патрабуе высокага ўзроўня інтэлектуальнай культуры аўтара, назіральнасці, літаратурных схільнасцей, умення гістарычна разважаць, аналітычнага мыслення.

Асноўнай адзінкай мемуарнага тэксту з'яўляецца дыскрэтна-аналітычны запіс, які ўключае ў сябе разнародныя факты, незалежныя ад іх унутраных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сувязей і рэальнага значэння ў лёсе аўтара і ў ходзе гістарычных падзей. Адзіным аб’яднаўчым элементам з'яўляецца бягучы час.

Мемуары належаць да гістарычных першакрыніц. Яны высока запатрабаваны ў гістарычнай навуцы. З'яўляюцца крыніцай фактаў і звестак, якія часам нельга атрымаць па іншых крыніцах.

Яркімі рысамі мемуараў з'яўляюцца даставернасць (сапраўднасць), аўтэнтычнасць, верагоднасць (надзейнасць), суб’ектыўнасць і крэатыўнасць.

Пры вызначэнні іх сапраўднасці, аўтэнтычнасці, бібліятэкары-бібліёграфы краязнаўцы могуць цалкам абапірацца на дасягненні гістарычнага крыніцазнаўства. Пры высвятленні даставернасці ці правільнасці звестак, якія падаюцца мемуарыстам, неабходна ўлічыць наступнае.

Даставернасць – гэта комплексная характарыстыка крыніцы, абумоўленая многімі псіхалагічнымі, сацыяльнымі, нацыянальнымі, канфесіянальнымі, інтэлектуальнымі, светапогляднымі і іншымі фактарамі.

На даставернасць мемуараў уплываюць асаблівасці памяці, уважлівасці, тыпу ўспрыймання асобы мемуарыста. Маюць значэнне ўмовы работы над мемуарным творам. Вельмі значны ўплыў аказваюць такія характарыстыкі, як светапогляд чалавека, эмацыянальная накіраванасць, яго палітычныя погляды, рэлігійнасць, этнічная прыналежнасць і іншыя рысы, што ў цэлым можна абазначыць, як асаблівасці менталітэту.

Даставернасць залежыць ад такіх паняццяў, як рэтраспектыўнасць і суб’ектыўнасць.

Рэтраспектыўнасць звязана з працягласцю тэрміну, які прайшоў паміж падзеямі і часам напісання мемуараў. У некаторых відах (жанрах) мемуараў – гэта пісьмы, дзённікі, падарожныя запісы – гэта можа быць нязначны час. У аўтабіяграфіях, літаратурных партрэтах, нарысах, успамінах – гэта можа быць вялікі храналагічны тэрмін. Вялікі тэрмін паміж падзеямі і іх апісаннем можа істотна паўплываць на даставернасць і праўдзівасць апісання падзей, на адлюстраванне фактычных даных, пачуццяў і ацэнак, пунктаў гледжання аўтараў. Пры вялікім часом адрэзку паміж падзеямі і іх апісаннем ўзрастае верагоднасць памылак памяці, скажэнняў, калі пажаданае выдаецца за рэчаіснае і інш. Такога роду неспецыяльныя памылкі тлумачыць псіхалогія ўспрыймання (напрыклад, тэорыя перакадзіравання амерыканскага псіхолага Дж. Міллера). Паводле гэтай тэорыі, з данымі, якія трапілі ў памяць чалавека, адбываюцца наступныя з’явы: 1) ураўніванне, калі многія рысы падзеі знікаюць, а сама гісторыя набывае больш схематычны від; 2) удакладненне, калі некаторыя з запомніўшыхся дэталяў набываюць выразнасць і заўсёды ўспамінаюцца; 3) асіміляцыя, калі падзея запамінаецца згодна пажаданням чалавека. Таму



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інтэрпрэтацыя падзей праз працяглы час, можа акцэнтавацца адпаведна пажаданням мемуарыста, асабліва, калі мемуарыст не абапіраецца на запісы.

Часам ва ўспамінах мемуарыст асэнсавана замоўчвае пэўныя дэталі ці надае ім пажаданую інтэрпрэтацыю. Нярэдка гэта адбываецца ў тых выпадках, калі існуе жаданне пэўным чынам адлюстраваць ўласную ролю ў падзеях.

Аўтэнтычнасць арыгінальнасць, сапраўдная прыналежнасць дадзенаму аўтару.

Верагоднасць (надзейнасць), звязана з аднаго боку з даставернасцю, і з другога боку, моцна залежыць ад суб’екта (аўтара мемуараў). Сапраўдны ўдзел аўтара ў падзеях, яго роля ў іх, пазіцыя аддаленага назіральніка ці актыўнага ўдзельніка ўплываюць на характарыстыку надзейнасці. У першым выпадку мемуарыст можа апісаць падзеі павярхоўна, нават сказіць іх.

Суб’ектыўнасць мемуараў, магчымая недакладнасць адлюстроўваемых у іх даных, не памяньшаюць крыніцазнаўчага значэння гэтых дакументаў, а з'яўляюцца іх адметнай характарыстыкай. Бібліятэкар-бібліёграф краязнавец павінен ведаць, што выкарыстоўваючы мемуарную літаратуру ў краязнаўчых даследаваннях і пры падрыхтоўцы інфармацыйнай прадукцыі, важна вывучаць каментарыі, уводныя артыкулы і іншыя элементы выданняў мемуарнай літаратуры, а таксама звяртацца да навуковай і іншай літаратуры адпаведнай тэматыкі.

Не менш важным з'яўляецца тое, што мемуары адлюстроўваюць дух, атмасферу эпохі праз адчуванні і ўспрыйманне рэчаіснасці канкрэтным чалавекам.

Крэатыўнасць мемуараў. Неабходна ўяўляць, што гэтыя крыніцы абумоўлены асобамі іх аўтараў, іх светапоглядмымі, псіхалагічнымі і сацыяльнымі асаблівасцямі ў канкрэтных гістарычных умовах. Гэта праяўляецца ў такой рысе як крэатыўнасць мемуараў. Ніколі ў гісторыі больш не паўторыцца тое ўспрыйманне, пачуцці, ацэнкі, якія перажылі аўтары мемуараў. Напрыклад, Альгерд Абуховіч (1840-1898), магчыма ўдзельнік паўстання Кастуся Каліноўскага, беларускі паэт і мемуарыст, зрабіў запіс у дзённіку XIX ст.: “сказаць на Літве – “Арап Пятра Вялікага – гэта продак Пушкіна” – няма чым хваліцца, скажуць у нас. Але іначэй разумее гэта псіхалогія маскоўская: “Помилуйте, Царский Денщик!» Гэта быццам нешта сярэдняе паміж чалавекам і святым ангелам”.

Мемуары дапамагаюць узнавіць многія факты, якія не знайшлі адлюстравання ў іншых крыніцах, у т.л. у архіўных дакументах. Прычым трэба ўлічваць, што архіўныя матэрыяды дарэвалюцыйнага і даваеннага перыядаў

захаваліся толькі часткова, таму выкарыстанне мемуарнай літаратуры можа кампенсіраваць адсутнасць неабходнай інфармацыі.

*Класіфікацыя мемуараў.* Праблема класіфікацыі мемуараў з'яўляецца складанай і не існуе адзінага падыхода да вызначэння іх відаў. Пры класіфікацыі мемуараў выкарыстоўваюць розныя прыметы: напрыклад, “форму фіксацыі інфармацыі” “Пераважная частка даследчыкаў падзяляе іх у адпаведнасці з формай фіксацыі інфармацыі на наступныя чатыры віды:” (Ходзін С.), ці, на наш погляд больш дакладную прымету “адносіны часу стварэння крыніцы да ўзнаўляемага часу”.

*1.Успаміны* – ствараюцца аўтарам праз некаторы час пасля пэўных падзей ці аўтар жадае распавесці пра ўсё сваё жыццё. Да ліку ўспамінаў можна далучыць аўтабіяграфіі і жыццяапісанні. Ва ўспамінах падзеі могуць атрымаць не зусім тыя ацэнкі і характарыстыкі, якімі яны бачыліся мемуарысту ў мінулым, калі непасрэдна адбываліся. Аналіз і ацэнкі могуць быць больш глыбокімі, таму што прайшоўшы час даў магчымасць прадумаць і ацаніць іх значэнне. Ва ўспамінах могуць быць страчаны пэўныя дэталі, але могуць быць забыты ці недакладна пададзены некаторыя факты. “Крыніца становіцца менш дакладнай, аўтарытэтнай”. Вартасць успамінаў узрастае тады, калі аўтар карыстаецца дзённікавымі запісамі, калі ён мае запісы падзей, дакументы, якія дапамагаюць даставерна адлюстраваць мінулае.

*2.Літаратурны запіс успамінаў* – журналіст, літаратар дапамагае па просьбе мемуарыста запісаць успаміны, надаць ім літаратурную форму. Гэты спецыяліст не павінен скажаць, змяняць сэнс інфармацыі, але ўсё ж яго “прысутнасць” у творы адчуваецца. Таму гісторыкам рэкамендуецца ўдакладняць ступень ўмяшальніцтва літаратара ва ўспаміны.

*3.Стэнаграфічны (пратакольны) запіс успамінаў.* Выкарыстоўваецца па ініцыятыве інстытутаў, архіваў, музеяў і іншых навуковых арганізацый, як форма збора і захавання каштоўных звестак (успамінаў). Стэнаграмы расшыфроўваюцца, выпраўляюцца пры неабходнасці і толькі пасля падпісання аўтарам набываюць паўнацэнны статус успамінаў. Пэўнымі недахопамі ўспамінаў пры стэнаграфаванні з'яўляецца тое, што на мемуарыста пэўным чынам уплывае асоба, якая вядзе гаворку і стэнаграмы захоўваюць асаблівасці гутарковай мовы (непаслядоўнасць, адступленні, моўныя хібы).

*4.Дзённікі.* Ствараюць асобы, якія больш ці менш сістэматычна вядуць запісы паўсядзённых падзей свайго жыцця. Дзённікі вядуцца на працягу пэўнага перыяду, ці ўсяго жыцця. У дзённіках фіксуюцца і пачуцці, эмацыянальныя ацэнкі, які пераажываў чалавек менавіта ў час падзей, у час здзяйснення запісаў. У час ВКЛ дзённікі называліся дыярыушамі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паментнікамі. Апошняя назва ўжывалася польскамоўнымі беларускімі і замежнымі аўтарамі і ў наступныя стагоддзі; выкарыстоўвалася таксама і для абазначэння ўспамінаў.

*5.Запіскі падарожнікаў.* Іх выдзяляюць часта і як асобны жанр гісторыка-літаратурных апавяданняў. Але абгрунтавана адносіць іх да мемуарнай літаратуры, таму што яны таксама заснаваны на памяці, на запісах, якія рабіліся падчас падарожжаў. Так, напрыклад, лічыць С. М. Ходзін: "Назіранні падарожніка – гэта, як правіла, свежы погляд прадстаўніка іншай культуры, іншых традыцый і каштоўнасцей."

Да іншых жанраў мемуарыстыкі адносяць таксама перапіску, літаратурныя партрэты, споведзі, дакументальныя нарысы.

Існуюць іншыя класіфікацыі: 1) Мемуары-летапісы (жанры: дзённікі, пісьмы, запісы, падарожныя запісы і інш.)

2) Мемуары-успаміны (аўтабіяграфіі, успаміны, літаратурныя партрэты, споведзі і інш.)

3) Мастацкія мемуары (створаныя часткова па памяці, часткова па запісах, па пісьмах сваіх і чужых, адрэдагаваныя і мастацкі аформленыя).

Сярод пералічаных відаў па прымеце "адносіны часу стварэння крыніцы да ўзнаўляемага часу" відавочна, што па першых уражаннях ствараюцца дзённікі, пісьмы, падарожныя запіскі. Яны змяшчаюць дакладныя факты, нават дэталі, вызначаюцца эмацыянальнасцю, непасрэдна адлюстроўваюць свой час. Лічыцца, што такія віды найбольш адлюстроўваюць ментальныя рысы свайго часу. Але яны могуць мець недахопы стылю, паслядоўнасці. Праз пэўны час некаторыя звесткі пададуцца аўтару нязначнымі і могуць выключаны з мемуарнага твору.

У мемуарных творах, напісаных праз пэўны час, і, як правіла літаратурна адрэдагаваных, апрацаваных, захоўваюцца ментальныя рысы часу, але ў меншай ступені захоўвацца вастрыня першага ўспрыймання. Таму лічыцца, што ў такіх творах менш рэпрэзентуецца той час, калі адбываліся падзеі, і ўзмацняецца ўплыў новага часу, калі пісаліся ўспаміны.

З'яўленне новых інфармацыйных тэхналогій, і як вынік, спосабаў камунікацыі, спрыяла ўдакладненню мемуарна-аўтабіяграфічных выданняў. Групу такіх выданняў утвараюць не толькі традыцыйныя кніжныя выданні, але і онлайн-тэксты, паколькі яны прадстаўляюць сабой самастойныя публікацыі і/ці нярэдка становяцца крыніцай традыцыйнай кнігі. У аснове рабочай тыпалогіі мемуарна-аўтабіяграфічных выданняў – жанравыя прыметы тэкста з улікам наступных катэгорый: актуалізацыя мінулага, аўтаапісанне, матэрыяльная канструкцыя выдання (друкаваная ці электронная) і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мемуары належаць да ліку асноўных першакрыніц гістарычных даследаванняў. Яны заўсёды карысталіся папулярнасцю сярод чытачоў бібліятэк. Часам некаторыя факты магчыма ўстанавіць толькі па мемуарах. Багацце фактычнага матэрыялу ў мемуарнай літаратуры дазваляе абгрунтавана лічыць мемуарную літаратуру “крыніцай кампенсацыі страчанай інфармацыі”, як напісала Клара Алегаўна Біруковіч, вядучы краязнавец Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі. Зацікаўленаму чытачу і даследчыку яны дазваляюць рабіць адкрыцці, глыбей пазнаваць мінулае. Мемуары ярка адлюстроўваюць атмасферу часу.

Існуе велізарная колькасць мемуараў, прысвечаная буйным рэгіёнам Беларусі, буйным гарадам, значна менш – іншым тэрытарыяльным аб’ектам і населеным пунктам. Але населеныя пункты і рэгіёны ўпамінаюцца і характарызуюцца ў мемуарах, якія прама не звязаны з даным тэрытарыяльным аб’ектам. Для бібліятэкараў-бібліёграфаў краязнаўцаў важна навучыцца выяўляць рэгіянальныя аспекты мемуарнай літаратуры, звязаныя менавіта з даным краем ў мемуарах больш шырокай ці наадварот вузкай тэматыкі (прысвечанай 1 чалавеку). Як ніякія іншыя дакументныя крыніцы творы мемуарыстыкі дапамагаюць больш дакладна і жыва ўзнавіць элементы мінуўшай рэчаіснасці пры стварэнні інфармацыйна-бібліяграфічнай прадукцыі і пры падрыхтоўцы мерапрыемстваў краязнаўчай тэматыкі.

У ГомАУНБ з канца 1980-х гг. выкарыстанне мемуарнай літаратуры лічылася прыярытэтным накірункам. Высветлілася, што многія лакуны мясцовай гісторыі магчыма асвяціць па мемуарных крыніцах.

У ЦБС бібліятэкары займаюцца не толькі выяўленнем твораў мемуарыстыкі, але і із непасрэдным збіраннем. Вялікая работа па збору ўспамінаў сярод мясцовага насельніцтва была праведзена падчас падрыхтоўкі летапісаў вёсак і гісторыі бібліятэк. У многіх бібліятэках афармлены папкі з рукапісамі ўспамінаў ветэранаў і адметных людзй края.

Бібліятэкары імкнуцца задакументаваць крыніцы вуснай памяці, таму падчас масавых і іншых мерапрыемстваў, вельмі важна зрабіць відэа ці аўдэазапісы.

Мемуарная літаратура адлюстроўваецца ў краязнаўчым фондзе і ДБА. Для выяўлення мемуараў магчыма выкарыстоўваць спецыяльныя беларускія і замежныя бібліяграфічныя паказальнікі, напрыклад, “Советская Белоруссия в воспоминаниях современников”, шматтомны анатаваны паказальнік “История дореволюционной России в дневниках и воспоминаниях” (с XV – по 1917 .), “Русские мемуары. Избранные страницы XVIII в.”, польскія – Савіцка Фр. “Bibliografia polskich wydawnictw pamiątnikowych. 1801 – 1914” (Wroclaw, 1987.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

-197 s.), украінскія, літоўскія бібліяграфічныя крыніцы. Мемуары трапляюць у рэтраспектыўныя бібліяграфічныя паказальнікі, найчасцей па гістарычных навуках, у персанальныя і іншыя дапаможнікі.

Новую мемуарную літаратуру можна адшукаць па рэсурсах бягучай нацыянальнай бібліяграфіі, бягучых універсальных паказальніках “Новая літаратура аб вобласці”. Мемуары адлюстроўваюцца, як правіла, у раздзелах гісторыі, літаратуразнаўства, радзей у іншых галіновых раздзелах. Іх рассеянасць патрабуе ўважлівага прагляду бібліяграфічных крыніц.

У развіцці мемуарнай літаратуры ў Беларусі С. М. Ходзін выдзяляе 5 этапаў. Яны абумоўлены агульнай гістарычнай перыядызацыяй і асаблівасцямі самой мемуарнай літаратуры:

Першы этап – другая палова XVI – XVII стст.

Другі этап – XVIII ст.

Трэці этап – XIX – да 1920-х гг.

Чацвёрты этап – XX ст. перыяду БССР

Пяты этап – канец XX – пачатак XXI ст.

*Першы этап – другая палова XVI – XVII стст.* Паводле высновы выдатнага беларускага гісторыка і краязнаўцы XIX ст. Міхала Балінскага, “в давней Польшчы” амаль у кожнай шляхецкай сям’і вяліся рознага роду памятныя запісы. Былі распаўсюджаны дыярыушы, памэнтнікі, дзённікі, перапіска, падарожныя запіскі. Стварэнне ўспамінаў (больш складаных формаў) патрабавала высокай інтэлектуальнай культуры аўтара, літаратурных навыкаў, умення гістарычна разважаць, што было характэрна для найбольш адукаванай часткі шляхты. Ствараліся рукапісныя і друкаваныя мемуарныя творы. Даследчыкі адзначаюць, што некаторыя мемуарныя творы знаходзяцца на мяжы летапісаў і мемуараў, напрыклад, “Баркулабаўскі летапіс”. Іншыя перакананы, што гэта мемуарны твор, таму што ў адрозненне ад летапісца, які глядзеў на свет вачамі дзяржаўнага бытапісца, “Баркулабаўскі летапіс” напісаны з пазіцый звычайнага жыхара, які хоча добрага нармальнага жыцця (М.К.Дабрынін “Беларуская літаратура”, 1952). Адметнай рысай мемуарнай літаратуры таго часу з'яўляецца скрытая аўтарская прысутнасць. У XVII ст. мемуарысты пераважна хранікальна-інфармацыйна адлюстроўвалі палітычныя, сямейныя і метэаралагічныя падзеі і з'явы. Рэдка праяўлялі сваё асабістае ўспрыйманне падзей, нават пры самых драматычных абставінах.

З мемуарных твораў магчыма пачэрпнуць звесткі аб мясцовых падзеях і падзеях, якія адбываліся ў краіне (ВКЛ) і за яе межамі. Так напісаны “Дзённікі паходаў Стэфана Баторыя” і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У дзённіках было шмат звестак гаспадарчага і асабістага характару, звестак пра падзеі ў краіне, таму даследчыкі акрэсліваюць творы гэтага часу як гісторыка-мемуарную літаратуру.

*На першым этапе* развіцця мемуарнай літаратуры выдзяляюцца 1)творы, напісаныя прадстаўнікамі рэгіянальнай улады (Я.Храпавіцкі – віцебскі ваявода), Абуховічы (Філіп Казімір – смаленскі ваявода); 2) мемуары вайскоўцаў (С.Маскевіч, Я Пасек), 3) мемуары шляхты, якая займалася адміністрацыйнай, вайсковай і іншай дзейнасцю; 4) мемуары падарожнікаў.

Сярод важнейшых твораў мемуарнай літаратуры першага этапа, якія змяшчаюць значную інфармацыю пра беларускія рэгіёны, пра асобныя гарады, мястэчкі, рэкі і іншыя аб'екты, магчыма адзначыць“Паментнікі” Самуіла Маскевіча, “Дыярыуш” віцебскага ваяводы Яна Антонія Храпавіцкага, дзённікі Абуховічаў.

С. Маскевіч на  вайсковай службе пабываў у Брагіне, Гродне, Смаленску. Апісваў бедствы сялян, якіх рабавалі вайскоўцы, аб цяжкасцях паходу супраць маскоўскага войска.

Я.А.Храпавіцкі належаў да роду старажытнай беларускай шляхты, яго продкі і радня займалі відныя пасады ў Віцебскім ваяводстве. У сваім “Дыярыушу” таксама занатаваў жахі вайны: 17 снежня 1661 г. каля Ярэміч (Наваградскае ваяводства) і запісаў, што край “поўнасцю вынішчаны. Паўсюду голад”, 17 і 18 студзеня 1662 г. каля Смілавіч пад Мінскам “усё спустошана”, едучы далей на ўсход Беларусі, адзначаў у шэрагу населеных пунктаў поўнае знішчэнне сялянскіх хат, знікненне і гібель людзей і г д. (мястэчка Беразіно, Талачын, Бялынічы і інш.). Прывёў многа дакладных дат аб спаленні мястэчак, вёсак, маёнткаў і іншых населеных пунктаў, у т.л. і тых якія, былі ў яго асабістай уласнасці. Занатаваў ён гаспадарчыя, прыродныя, археалагічныя і іншыя звесткі.

Значная ўвага нададзена ў дыярыўшу апісанню ўступлення Храпавіцкага на пасаду віцебскага ваяводы і працяглых святочных цэрымоній з гэтай нагоды.

Храпавіцкі выдзяляў на тэрыторыі Беларусі такі рэгіён як “Русь” ці “Белая Русь”. Дакладна і спецыяльна, на жаль, яго межы не акрэсліваў, толькі ўпамінаў асобныя мясціны з гэтага рэгіёну ў сувязі з апісваемымі падзеямі, па яго нататках гэта сучасная Аршаншчына, тэрыторыя паміж Магілёвам і Шкловам.

Мемуары вайскоўца Яна Пасека і стольніка Пятра Андрэевіча Талстога паказваюць беларускія рэгіёны, населеныя пункты, жыхароў вачамі замежных грамадзян. Ян Пасек больш паказаў бедствы, якія прынесла на беларускія землі вайна. П.А.Талстой накіроўваўся ў Італію з палітычнымі мэтамі, і праязжаючы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

па Беларусі, даволі ўважліва аглядзеў і апісаў шэраг населеных пунктаў. На гэтага вельмі багатага, разумнага і адукаванага чалавека найбольшае ўражанне сярод гарадоў аказаў Магілёў. Гэты адзін з буйнейшых гарадоў краіны рускі стольнік падрабязна апісаў з розных пунктаў гледжання: размяшчэння, забудовы, канфесій і інш. П.А.Талстой адзначае багацце магілеўчан, прыгажосць горада, ажыўлены гандаль, мноства добрага тавару і інш.

*Другі этап храналагічна адносіцца да XVIII ст.,* калі ў краіне адбываліся выключныя па значэнні падзеі, якія вызначылі далейшы гістарычны лёс Беларусі і яе народу. У гэты час змяняліся ідэалы, грамадства падзялялася на непрымірымыя па палітычных поглядах лагеры. Тыповы адукаваны чалавек лічыўся гуманістам, прыхільнікам ведаў, быў скептыкам і касмапалітам. Да стварэння мемуараў прычыніліся людзі розных станаў і прафесій, ураджэнцы беларускіх земляў ці часова пражываючыя. Мемуарыстыка набыла розныя формы, жанры. Распаўсюджанымі былі творы з такімі тагачаснымі тэрмінамі: дыяруюшы, паментнікі, мемарыялы, каментары, дзённікі і інш. З'явіліся творы, набліжаныя да мастацкай прозы (прыгодніцкія раманы нагадваюць успаміны І.Турчыноўскага і С.Пільштынавай-Русецкай), аповесці-споведзі (Ф.Карпінскі). Матэрыял нярэдка падаваўся ў форме "раманаў у пісьмах" і дзённікавых запісаў. Такім чынам, мемуарная літаратура зафіксавала істотныя каштоўнасныя змяненні асобы – павышэнне ўвагі да ўласнага "я". Характэрнай рысай твораў з'яўляецца павышэнне адлюстравання асобы мемуарыста, яго думак, разважанняў, ацэнак, пачуццяў. На жаль, малое адлюстраванне атрымалі беларускія населеныя пункты, нават гарады. На першым і другім этапах аўтарамі мемуараў выступалі пераважна прадстаўнікі шляхецкага саслоўя.

Па *другому этапу* развіцця мемуарнай літаратуры магчыма выдзеліць "Паментнікі Марціна Матушэвіча, кашталяна Брэст-Літоўскага", 4 тамы «Успамінаў» аб падзеях 1714-1764. М.Матушэвіч (1714 – 1765) паходзіў з мінскага заможнага шляхецкага роду, сам нарадзіўся каля Камянца (Брэсцкая вобласць), меў добрую адукацыю, перакладаў лацінскіх аўтараў, ведаў генеалогію многіх родаў, быў за мяжой. Усё жыццё амаль ён правёў у маёнтку Расна на Брэстчыне і не выязжаў далей Варшавы і Коўна. Але меў патаемнае ці яўнае дачыненне да ўсіх грамадскіх падзей на Беларусі.

Адметнасцю мемуараў М.Матушэвіча з'яўляецца значная ўвага, якая надаецца падзеям у сям'і – гэта сімвалізуе глыбокія змены, якія адбыліся ў новым XVIII ст. у стаўленні да асобы, у ацэнцы ўласнага "я". Успаміны М.Матушэвіча паказваюць панараму жыцця берасцейскай шляхты: як зацята вялася паміж мясцовымі родамі барацьба за зямельныя ўладанні, за такія высокадаходныя крыніцы, як права правядзення кірмашоў, якімі напружанымі і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жорсткімі былі адносіны ў сям'і, дэспатызм яго маці, і поўнае падчыненне яе волі ўсіх членаў сям'і, яе інтрыгі з суседзямі і іншымі людзьмі. Зусім нечаканая афарбоўка вобразу шляхцянкі, жанчыны далёкага мінулага. Тон мемуараў спакойны, разважлівы. Адным з першых Матушэвіч апісаў свае сны «прадвяшчальныя».

Упершыню з'явіліся мемуары літаратурна-мастацкага характару, у жанры прыгодніцкіх раманаў, напрыклад, "Авантуры майго жыцця" Саламеі Русецкай, ураджэнкі Навагрудчыны, украінскага юнака Ільы Турчыноўскага, які апісаў сваё жыццё і прыгоды ў Гомелі, Магілёве і Шклове - "Незвычайныя прыгоды Турчыноўскага". Ён апісвае, якія больш чым непрыемныя сітуацыі ўзнікалі, калі праваслаўны юнак не хацеў спяваць у даміканскім шклоўскім саборы і інш. Называе імя шклоўскай жанчыны Яўдакіі Машчыхі, якая вылечыла яго ад пабоеў.

Мемуары замежнікаў, пераважна гэта падарожныя нататкі, характарызуюць геаграфічнае становішча гарадоў і мястэчак, знешні выгляд, замкі, касцёлы і цэрквы, багацце прыроды, асаблівасці гаспадарчых заняткаў насельніцтва, транспартныя сродкі. Напрыклад, С.Герберштэйн у сваіх "Запісках аб Масковіі" нават аставіў замалёўкі беларускага тура і зубра.

*Трэці этап ахоплівае XIX – да 1920-х гг.* Для гэтага этапу характэрна 1) павялічэнне твораў мемуарыстыкі 2) пашырэнне аўтарскага складу мемуарыстаў. Мемуары ствараюцца не толькі дваранамі, але і разначынцамі, купцамі, духавенствам, сялянамі, рабочымі і інш.

На працягу *трэцяга этапу* крыніцы мемурнай літаратуры з рэгіянальным асектам зместу магчыма падзяліць па розных прыметах на: 1) мемуары, напісаныя рускімі аўтарамі, у сувязі з падпарадкаваннем Беларусі Расійскай імперыі; мемуары іншых замежных аўтараў, 2) мемуары, створаныя ўраджэнцамі Беларусі і прысвечаныя асобным населеным пунктам, адміністрацыйна-тэрытарыяльным адзінкам (мемуары Соф'і Кавалеўскай пра Мінск) ці многім беларускім мясцінам; 3) мемуары, прысвечаныя нацыянальна-вызваленчаму руху і рэвалюцыйнаму руху. Усе яны з розных пунтаў гледжання: тэрыторыі, тэматыкі і асабоваму погляду даюць магчымасць бібліятэкару-бібліёграфу краязнаўцу больш поўна, але разам з тым і акцэнтавана адлюстроўваць інфармацыю і веды аб краі.

1) Сярод мемуараў, напісаных рускімі аўтарамі, у сувязі з падпарадкаваннем Беларусі Расійскай імперыі, вылучаюцца мемуары вайскоўцаў і чыноўнікаў, якія занатавалі асаблівасці беларускіх зямель, непадобнасць мясцовага ўкладу на жыццё ў Расіі. Былі апублікаваны мемуары афіцэра І.І.Лажэчнікава (вядомага рускага пісьменніка), удзельніка экспедыцыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

па апісанні беларускіх зямель Севергіна і інш. Увагу мемуарыстаў прыцягвала беларуская мова, шматлікія замкі, багатыя бібліятэкі ў маёнтках шляхты, прырода, добрыя дарогі, традыцыі, святы, адукаванасць людзей, напрыклад, са здзіўленнем адзначалі малітоўнікі ў руках вернікаў у касцёлах.

2) Многа мемуараў было створана ўраджэнцамі Беларусі. У іх знайшлі адлюстраванне вандроўкі па роднай зямлі, апісанні населеных пунктаў, адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак. Так, два выдатных мемуарысты Павел Шпілеўскі і Уладзіслаў Сыракомля аставілі мемуары ў жанры падарожных запісак. Публіцыст і літаратар Павел Шпілеўскі (1823 - ), ураджэнец Бабруйскага павету Мінскай губерні, па адукацыі святар, апублікаваў у часопісе "Современник" у 1853 – 1855 гг. серыю нарысаў "Падарожжы па Палессі і беларускім краі" (перавыдадзены ў 1992 г. у Мінску). Уладзіславу Сыракомлі належаць мемуары "Падарожжа па маіх былых ваколіцах". Аўтары належалі да двух плыняў у беларускім грамадстве сярэдзіны XIX ст.: тых, хто з прыхільнасцю ставіўся да новай краіны (Шпілеўскі) і тых, хто быў у апазіцыі да расійскай улады (Сыракомля) і гэта знайшло адлюстраванне нават у мове іх мемуараў – у Шпілеўскага – рускай, у Сыракомлі – польскай. Абодва мемуарныя творы напісаны з вялікай патрыятычнай натхнёнасцю, аўтары апісалі многія беларускія гарады і мястэчкі, вобразы сялян, мяшчан, памешчыкаў, народны побыт. Шпілеўскі ярка характарызуе прадстаўнікоў такіх беларускіх этнасаў, як татары і яўрэі.

Сярод мемуараў, прысвечаных населеным пунктам, асобнае месца займаюць успаміны Соф'і Кавалеўскай "Obrazki minskie 1850 – 1863". Яны да сённяшніх дзён з'яўляюцца адной з важнейшых крыніц Мінсказнаўства. Аўтар – шляхцянка Мінскай губерні. Успаміны прадстаўляюць невялікія тэматычныя замалёўкі жыцця горада напярэдадні і пасля паўстання 1863 г. Абрысаваны грамадскае жыццё, падзеі, звязаныя з паўстаннем, патрыятызм мінчан, побыт шляхты, санітарнае становішча горада і эпідэмія халеры і многія іншыя бакі жыцця горада.

3) Сярод мемуараў, прысвечаных нацыянальна-вызваленчаму руху і рэвалюцыйнаму руху, выдзяляюцца мемуары, звязаныя з трыма паўстаннямі супраць расійскага ўладарання і з рэвалюцыямі супраць царскага і буржуазнага дзяржаўнага ўпраўлення. З падзеямі ўключэння Беларусі ў склад Расіі, паўстання 1830/31 гг. звязаны мемуары М.К.Агінскага. Яго успаміны былі апублікаваны ў 1826 годзе ў 4 тамах на французскай мове яшчэ пры жыцці аўтара у Парыжы, а на беларускай мове "Мемуары за 1795 – 1810 гадывыйшлі ў 2015 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падзеі ў розных мясцінах, звязаныя са скасаваннем царкоўнай уніі, апісаны ў “Запісках” І.С.Жыркевіча, Я.А.Чабадзько, М.Маркса.

Пласт мемуарыстыкі звязаны з нацыянальна-вызваленчым рухам, напрыклад, успаміны Ігнацiя Клюкоўскага.

4) Група мемуараў, прысвечана апісанню першай сусветнай і іншых войнаў, якія вяліся Расіяй з іншымі краінамі. У гэтых мемуарах адлюстраваны жахі вайны, знішчэнне населеных пунктаў, пакуты мірнага насельніцтва. Напрыклад, у мемуарах Ф.Кудрынскага “Людскія хвалі. Бежанцы” адлюстраваны карціны бежанства насельніцтва Рагачова і іншых мясцін падчас нямецкага наступлення ў першую сусветную вайну.

*Чацвёрты этап – ахоплівае мемуарыстыку XX ст. перыяду БССР* і падзяляецца на больш дробныя перыяды, вызначаныя па агульнагістарычнай перыядызацыі БССР. Такая дыферэнцыяцыя абумоўлена шматлікасцю мемуараў. Да напісання мемуараў далучыліся прадстаўнікі розных груп насельніцтва: былыя рэвалюцыянеры, партыйныя, савецкія і камсамольскія кіраўнікі, ваенныя, кіраўнікі прадпрыемстваў і ўстаноў, пісьменнікі, выкладчыкі і інш. У пасляваенны перыяд з’явіліся мемуарныя творы асоб, якія займалі кіруючыя пасады ў БССР і вялікі паток мемуарыстыкі былых партызан, падпольшчыкаў і вайскоўцаў.

1920-1930-я гг. – гэта перыяд сацыялістычнага будаўніцтва ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы і стварэння новай культуры са сваёй шкалой каштоўнасцей. Адначасова гэта перыяд жорсткіх палітычных рэпрэсій, агрэсіўнай ідэалагічнай прапаганды, вынішчэння беларускасці, час небывалай дэмагогіі. Канкрэтнасць і вобразнасць мемуараў даюць магчымасць адчуць каларыт той эпохі. Па зместу мемуарыстыка ахоплівала падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай вайны, пераўтварэнні у эканоміцы, змяненні у палітычнай сістэме, барацьбу за павышэнне агульнага адукацыйнага ўзроўня насельніцтва, ліквідацыю непісьменнасці, правядзенне розных палітычных і гаспадарчых кампаній.

Адмоўнай рысай мемуарыстыкі гэтага часу стала палітызаванасць, нецярпенне іншых ідэй, акрамя камуністычных, перабольшванне дасягненняў, замоўчванне недахопаў у эканоміцы, незаконных рэпрэсій. Нярэдка у якасці аўтараў мемуараў указваліся малапісьменныя людзі – перадавікі сацыялістычнай вытворчасці.

У перыяд Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны час тэма змагання з нямецка-фашысцкімі захопнікамі стала адной з асноўных тэм савецкай мемуарыстыкі. Адлюстроўвалася гаспадарчае аднаўленне, падзеі рэвалюцыі і даваеннага сацыялістычнага будаўніцтва.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У канцы 1980-х гадоў узнік інтарэс да падзей далёкай гісторыі, пачаўся пошук матэрыялаў пра беларускія рэгіёны ў дарэвалюцыйнай і замежнай мемуарыстыцы. Стала магчымым друкаваць мемуары, прысвечаныя забароненым у савецкі час тэмам.

*Пяты этап развіцця мемуарнай літаратуры ў Беларусі прыходзіцца на перыяд пасля дасягнення суверынітэту.* Зніклі ідэалагічныя забароны. Павысіўся інтарэс да мемуараў ураджэнцаў Беларусі незалежна ад мовы, на якой яны былі напісаны і краіны, дзе былі выдадзены. Выдатная з’ява – пераклад мемуараў на беларускую мову. На навуковым узроўні былі здзейснены публікацыі мемуараў мінулага ў часопісах “Спадчына”, “Полымя”, “Беларускі гістарычны часопіс”, краязнаўчых часопісах “Ziemia Lidska”, “Magazin Polski” і іншых, і ў якасці асобных выданняў. Асабліва важна, што мемуары мінулых перыядаў былі перакладзены на беларускую мову, уключалі каментары, слоўнікі старажытных і замежных слоў. (Значную ролю ў публікацыю мемуараў унёс В.Таранеўскі). Напрыклад, да ліку такіх публікацый належаць запіскі і дыярыуш Яна Уладзіслава Пачобута-Адланіцкага.

На сучасным этапе пачалі ствараццa спецыялізаваныя сайты мемуараў. Больш мемуараў прадстаўлены на расійскіх сайтах. Так, сайт “Российский мемуарий” змяшчае мемуары Ф.В.Булгарына, ураджэнца Беларусі, знакамітага расійскага журналіста, якія апісаў час пераходу беларускіх зямель у склад Расіі.

## Тэма “ФОТАДАКУМЕНТЫ ЯК КРЫНІЦЫ КРАЯЗНАЎЧАЙ ІНФАРМАЦЫІ”

Фотадакументы – гэта выяўленчыя дакументы, якія ствараюцца пры дапамозе фатаграфічнай тэхнікі і фіксуюць рэчы, падзеі, з’явы рэчаіснасці ў выглядзе адлюстраванняў.

Выдзяляюць фатаграфіі – арыгіналы, якія атрымліваюць на светаадчувальнай плёнцы і іншых носьбітах у выніку аўтарскай здымкі і фатаграфіі копіі, якія атрымліваюць у выніку адна- ці шматразовага капіравання арыгінала (рэпрадукцыраванне).

Спалучэнне інфармацыйных і атракцыйных уласцівасцей дазваляе адначасова лічыць фатаграфіі дакументальнымі і выяўленчымі крыніцамі. Фатаграфіі па яе прыродзе ўласціва дакументальнасць, таму фотадакументы з’яўляюцца відам гістарычных крыніц. Але не менш паспяхова развіваецца шырокае кола сродкаў, стыляў, аўтарскіх (індывідуальных) манер здымкі, якія надалі фатаграфіі мастацкія ўласцівасці.

Гэтыя ўласцівасці фатаграфіі разам з такімі выдатнымі характарыстыкамі як аператыўнасць, псіхалагічны “эфект прысутнасці”, таннасць,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тыражыруемасць і іншымі абумовілі шырокае яе выкарыстанне ў многіх абласцях дзейнасці.

Фатаграфія ад пачатку яе ўзнікнення спадарожнічала краязнаўчай дзейнасці. Яна передавала факты культуры, сямейнай і мясцовай гісторыі ад пакалення ў пакаленне, садзейнічала захаванню іх у памяці рэгіянальнай супольнасці. Сямейныя фотаальботы ці зборы, фотаальбомы калектываў увасабляюць асацыятыўную гістарычную памяць пакаленняў.

У гісторыі беларускай фатаграфіі прызнана, што краязнаўства значна паўплывала на яе развіццё. Феномен краязнаўчай фатаграфіі ў Беларусі вядомы з 70-х гадоў XIX, калі яна пачала друкавацца.

Краязнаўчая фатаграфія – гэта фатаграфія, прысвечаная населеным пунктам і рэгіёнам краіны. Лічыцца асобным змястоўным кірункам фатаграфіі. Многа фотографаў прафесіяналаў і аматараў працавалі, каб гэты кірунак сфарміраваўся ў беларускай фатаграфіі і прадаўжаюць развіваць яго сёння. Хто жгэтыя творцы?

У Беларусі ўзнікненне краязнаўчай фатаграфіі звязана з імёнамі І. Дабравольскага, І.Садоўскага, В. Косткі, А.К. Сержпутоўскага, С. Харламповіча С., Я. Балзункевіча і інш. Гэта розныя людзі па саслоўнай прыналежнасці, адукацыі, прафесіі. У канцы 70-х гадоў XIX ст. краязнаўчыя фатаграфіі, зробленыя фотографамі І.Дабравольскім (Полацк) і І.Садоўскім (Гродна) увайшлі ў "Альбом костюмов России". Вялікую навуковую каштоўнасць захоўваюць фотаздымкі студэнта Пецярбургскага універсітэта В.Косткі, які ў 1904 – 1905 гг. падарожнічаў па Слуцкім і Ігуменскім паветах, па Падняпроўі, вядомага краязнаўца (этнографа і фалькларыста) А.К.Сержпутоўскага, псаломшчыка Вічынскай царквы (Камянецкі раён) С.Харламповіча і інш. На жаль, да сённяшняга часу дайшла толькі малая частка іх спадчыны. Так, з 5 тысяч фотаздымкаў Сержпутоўскага захавалася каля 450, прычым не ў Беларусі.

Варта ведаць, што ўзнікненне паняцця "краязнаўчая фатаграфія" звязана з творчасцю славутага фотамастака Яна Булгака, ураджэнца Беларусі. Як новая з'ява ў фатаграфіі "краязнаўчая фатаграфія" выражала высокі патрыятызм інтэлегенцыі, прадстаўнікоў мастацтва, якія беражліва ставіліся да адлюстравання і захавання зменлівых форм рэчаіснасці: навакольнай прыроды, відаў населеных пунктаў, выгляду людзей, сваіх сучаснікаў.

Менавіта Ян Булгак дасягнуў найвышэйшых вяршынь у стварэнні краязнаўчай фатаграфіі, зафіксаваў непаўторную рэчаіснасць многіх мясцін Беларусі, сучаснай Літвы і Польшчы. Ён тэарэтычна абгрунтаваў паняцце

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“краязнаўчая фатаграфія”, быў аўтарам кніг і артыкулаў па розных пытаннях фатаграфіі.

*Краязнаўчая фатаграфія,* паводле Я.В.Булгака, “адлюстраванне выгляду края ва ўсіх праявах натуральнай прыгажосці і зменаў, унесеных чалавекам”.

Доўгі час яго ўклад у культуру замоўчваўся ў Савецкай Беларусі, і тым самым яго імя і творчасць былі аддадзены польскай і літоўскай культуры. Але час унёс справядлівыя папраўкі і сёння фотамастак заняў пачэснае месца ў беларускай культуры.

Гонар і славу беларускай краязнаўчай фатаграфіі прынеслі выдатныя фотамастакі розных пакаленняў як Юзэф Ядкоўскі, Леў Дашкевіч, Міхась Раманюк, Г.Ліхтаровіч, Мірон Шчудло і многія інш. Лёс іх творчай спадчыны розны, фатаграфіі некаторых захаваліся пераважна ў тых выданнях, што былі выпушчаны дзесяткі гадоў назад, дзе іх упершыню размясцілі аўтары.

У БССР у даваенны і пасляваенны час у фотамастацтве выразна праявіліся тагачасныя ідэалагічныя настроі: здымаліся новабудоўлі, факты перамогі сацыялістычнай працы (пачатак выпуска прадукцыі прадпрыемствам, першы сноп жыта, атрыманне ўзнагароды перадавіком). Было апублікавана вельмі многа фатаграфій перыяду Вялікай Айчыннай вайны, напрыклад, каштоўныя фотаздымкі ўвайшлі ў выданні мемуараў, даведачныя выданні. Сучасныя гісторыкі заўважаюць, што адбор фатаграфій вёўся так, каб паказаць змаганне і перамогу над ворагам, але мала адлюстравалася жыццё горада, вёскі пад акупацыяй.

У сучасных публікацыях, прысвечаных фатаграфіі, можна заўважыць думку аб наступленні часу “культа фатаграфіі краязнаўчай”. Выдатна сказаў на адкрыцці фотавыставы ў Гальшанах (2002 г.), прысвечанай архітэктурным гістарычным помнікам, вядомы фотамастак Уладзімір Багданаў: “...паколькі культура ў цэлым – гэта гістарычна складзены ўзровень развіцця грамадства, то давайце разам паглядзім, на якім узроўні мы знаходзімся зараз”. Менавіта магчымасць “глядзець разам” вачамі фатографа і ўласнымі – памнажае моц уздзеяння фатаграфій, асабліва прысвечаных родным мясцінам.

У творчасці фотамайстроў-краязнаўцаў зафіксаваны непаўторныя вобразы многіх беларускіх мясцін, напрыклад, апублікавана “найбольш рэпрэзентатыўная частка фатаграфічнай спадычны” Яна Балзункевіча, якая захоўваецца ў аддзеле рукапісаў і рэдкай кнігі ЦБ НАН Беларусі.

Разам з краязнаўчай фатаграфіяй узнікла і яе калекцыяніраванне – дзейнасць таксама важная для бібліятэкараў-краязнаўцаў. Створаны каштоўныя калекцыі, якія апублікаваны. Напрыклад, Раман Афтаназі – знакаміты збіральнік фатаграфій маёнткаў (двароў) на тэрыторыі Беларусі і іншых зямель

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэчы паспалітай у межах 1772 г. Інтарэс да маёнткаў узнік у яго ў вельмі маладым узросце, у гімназіі, калі сябрам з роду Ордаў быў запрошаны ў двор Навашыцы на Палессі. “Атмасфера старога, стыльнага двору ў Навашыцах была незвычайна, таму што гарманічна звязвала ўсе пазітыўныя шляхецкія рысы з інтэлектуальнымі”, успамінаў пазней Р.Афтаназі. У гаспадароў (вельмі прыветлівых) была багацейшая бібліятэка. Юнак пабываў і ў суседніх дварах, дзе жыло нямала знакамітасцей, у т.л. маёнтак Молодаў К. Скірмунта – члена Дзяржаўнай Думы Расіі, міністра Польшчы, дыпламата РПП у Вялікабрытаніі, яго брата Генрыка Скірмунта, які мог распавесці гісторыю маёнткаў ваколіцы і ўсяго Палесся, Марыі Радзевіч –памешчыцы з маёнтку Грушава, дачкі паўстанцаў 1863-1864 г., якая выдатна ведала прыроду Палесся, напісала шмат аповесцей з мясцовымі сюжэтамі. (Усе маёнткі і асобы прадстаўлены ў кнізе А.Т.Федарука “Старинные усадьбы Берестейщины”).

Падчас гэтых вакацый (канікул) Афтаназі адчуў і зразумеў, што вельмі індывідуальная атмасфера маёнткаў (двароў) не можа быць затрымана ў іх матэрыяльнай форме. Пачаў спробы дакументавання іх з дапамогай фатаграфіі і апісанняў, гэтыя матэрыялы публікаваў у перыядычным друку, зарабляючы тым самым на новыя вандроўкі. Пасля вайны не мог ствараць уласныя фатаграфіі, так як амаль усе маёнткі на тэрыторыі акупіраванай нямецка-фашысцкімі захопнікамі былі знішчаны. Але працягваў збіраць дакументы аб сядзібах у Інстытуце мастацтва Польскай АН, па архівах, у т.л. сямейных, музеях, бібліятэках Польшчы і свету, збіраў вусную інфармацыю. 40 год штодзённа высылаў некалькі пісем з просьбамі даслаць фатаграфіі і звесткі аб маёнтках, Распрацаваў спецыяльны апытальнік, у якім падрабязна былі сфармуляваны шматлікія пытанні аб знешнім і ўнутраным выглядзе, інтэр’еры, аб саміх уладальніках і інш. Гэта дапамагала ўзнавіць у памяці мінуе, але ўсё ж не гарантавала і ад памылак. На падставе сабраных матэрыялаў і іх вывучэння Р. Афтаназі выпусціў два выданні унікальнага даследавання “Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej” (у 1992 і 1997 гг.). У другім з іх, лепшым па якасці, адлюстравана больш 1000 маёнткаў, палацаў, прадстаўленых 5 тысячамі фатаграфій, часта зусім невядомых і змястоўнымі даведкамі. Фатаграфіі зроблены у асноўным у канцы XIX да 1917 г., яны унікальныя, пераважна аматарскія. У кнігах Афтаназі ёсць звесткі аб знакамітых маёнтках, якія апісваліся ў многіх крыніцах, але ёсць фатаграфіі і звесткі аб сотнях малых і сярэдніх маёнткаў, палацаў, якія ніколі не апісваліся. Частку фатаграфій атрымаў ад жыхароў былых ваяводстваў, якія выканалі здымкі яшчэ існуючых аб’ектаў. Прычым неабходна памятаць, што сабранае Афтаназі з такой цяжкасцю гэта невялікая частка таго, што існавала калісьці ў рэгіёнах.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Матэрыял размешчаны па ваяводствах у межах 1772 г., што павінен мець на ўвазе бібліятэкар-краязнавец. Кожны том мае карты размяшчэння гэтых аб'ектаў у ваяводствах, зручныя паказальнікі для пошуку па дадатковых прыметах (паказальнік мясцовасцей, паказальнік (спіс) двароў і палацаў, спіс ілюстрацый). Дарэчы другое выданне здзейснена з фінансавай дапамогай нашчадка вядомага шляхецкага беларускага роду са Мсціслаўшчыны Андрэя Цеханавецкага (Лондан).

Страсныя збіральнікі краязнаўчай фатаграфіі ёсць і сёння, колькасць расце, сярод іх А.Федарук, Л. Лаўрэш, У. Ліхадзедаў. Так, вядомы сучасныя краязнавец А. Т. Федарук, выдатны знаўца ландшафтнай архітэктуры, папаўняе сваю ўнікальную калекцыю фатаграфій маёнткаў, а таксама збірае звесткі аб іх (будаўніцтва, выгляд, прыналежнасць і інш.) і аб іх уладальніках. Па гэтых зборах ім выдадзены кнігі, прысвечаныя старадаўнім сядзібам Міншчыны, Гродзеншчыны, Брэстчыны.

Лідскія краязнаўцы Леанід Лаўрэш і Уладзімір Круцікаў выпусцілі кнігу фатаграфій аб горадзе, адкрылі сайт. Целеш Л. сабраў фатаграфіі старадаўняга Мінска, многія з якіх апублікаваны.

Беларускі гісторык Уладзімір Ліхадзедаў належыць да самых вядомых калекцыянераў старых паштовак і фатаграфій. Калекцыянер ладзіць цікавыя тэматычныя выставы, напрыклад, "Мінск. Падарожжа ў часе", "Імгненні Першай сусветнай вайны" і многія іншыя, якія дэманструюцца ў Беларусі і за мяжой.

Фотадакументы атрымалі шырокае распаўсюджанне ў арганізацыях і ўстановах, функцыяй якіх з'яўляецца фарміраванне інфармацыйных рэсурсаў, навукова-даследчая, асветніцкая дзейнасць. Так, фотадакументы складаюць важную частку архіўных і музейных фондаў, дзе шырока выкарыстоўваюцца як для навуковай, адукацыйнай, так і для асветніцкай дзейнасці. У гэтых установах назапашаны вопыт сабірання, вывучэння і захоўвання фатаграфій, іх выкарыстання. Унікальныя фотадакументы захоўваюцца ў абласных, гарадскіх і раённых краязнаўчых музеях, абласных і занальных архівах краіны. Фонды фатаграфій аб населеных пунктах і рэгіёнах маюцца і ў цэнтральных архівах: НАРБ, НГАБ і Дзяржаўным архіве кінафотафонадакументаў (г. Дзяржынск). У гэтым архіве захоўваюцца фотаздымкі з 1870-х гг. да цяперашняга часу. Ёсць фонд па гісторыі Мінска, Нясвіжа, Барысава, Вілейкі, Магілёва, Гомеля, Пінска і іншых гарадоў.

Натуральна, што фотадакументы ўвайшлі і ў склад інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк, дзе іх значэнне бесперапынна павялічваецца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Краязнаўчыя фатаграфіі неабмежавана шырока прадстаўлены ў электронных інфармацыйных рэсурсах, і бібліятэкі маюць магчымасць іх шырока выкарыстоўваць. Існуюць сайты, мэтанакіравана створаныя як сайты краязнаўчай фатаграфіі. Напрыклад, Radzima. org, Глобус Беларусі. Сайты, прысвечаныя населеным пунктам і адміністрацыйна-тэрытарыльным адзінкам маюць раздзелы "Фотаальбом", "Фотагалерэя". Выстаўлены ў інтэрнет і асобныя фотавыданні, напрыклад, кніга Л.Лаўрэша і У. Круцікава "Ліда на старых малюнках, паштоўках, фотаздымках".

Сучасныя даследчыкі, карыстальнікі архіваў, музеяў, бібліятэк, падкрэсліваюць неацэннае значэнне краязнаўчых фатаграфій для навуковых даследаванняў, справы рэстаўрацыі гісторыка-культурных помнікаў, для атрымання ўяўленняў аб стратах гісторыка-культурных у часы гістарычных катаклізмаў, аб змяненні прыродных ландшафтаў, для папаўнення ведаў аб нацыянальнай і рэгіянальнай культурнай спадчыне, для патрыятычнага выхавання і г.д.

Фатаграфія стала элементам актыўнага пазнання края для вучняў і студэнтаў, якія вывучаюць краязнаўства, рэгіёназнаўчыя дысцыпліны ў складзе праграм сярэдняй школы, ВНУ і іншых навучальных устаноў. У турыстычна-краязнаўчай дзейнасці – фатаграфіі – эфектыўны элемент інфармацыйна-рэкламнага ўздзеяння, адлюстравання гістарычнага мінулага, прыроднай унікальнасці рэгіёнаў. Так, у публікацыях, якія асвятляюць ход турыстычна-краязнаўчай экспедыцыі навучэнскай моладзі "Жыву ў Беларусі і тым ганаруся", пастаянна гаворыцца аб формах, звязаных з фатаграфіяй роднага края.

У друку фатаграфія выдатны ілюстрацыйны матэрыял, існуе жанр фотарэпартажа. Невыпадкова, напрыклад, рэгіянальны перыядычны друк называюць крыніцай фоталетапісу мясцовага жыцця.

Значэнне фатаграфіі для дакументавання мясцовага жыцця, адлюстравання яго вобразнай непаўторнасці вельмі істотнае і кірункі выкарыстання – шырокія.

Сёння краязнаўчая фатаграфія як ніколі запатрабавана грамадствам і гэта асэнсавалі і бібліятэкары.

Большасць бібліятэк, якія вядуць краязнаўчую работу, назапасілі вопыт работы з фотаілюстрацыямі ў выданнях, выдзеленых у краязнаўчы фонд, друкаванымі фотаальбомамі.

Але асобныя бібліятэкі пачалі збіраць фонды арыгінальных фатаграфій, прысвечаных адміністрацыйна-тэрытарыяльным адзінкам, населеным пунктам, установам і прадпрыемствам, калекцыяніраваць фатаграфіі асобных майстроў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Напрыклад, ЦНБ імя Я. Коласа НАН зберагае фотаспадчыну Яна Балзункевіча і ўдзельнічала ў выпуску фотальбома майстра. Гэта дзейнасць новая, яна не стала яшчэ шырока распаўсюджанай, і адпаведна прааналізаванай, метадычна і навукова раскрытай.

Асмысленне і пашырэнне дзейнасці з фотадакументамі прадстаўляецца перспектыўным кірункам бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства. Адпавядае працэсу пашырэння ў структуры краязнаўчых бібліятэчна-інфармацыйных фондаў дакументаў незалежна ад матэрыяльнай прыроды носьбіта і знакавай прыроды інфармацыі. Адпавядае прынцыповым падыходам міжнародных арганізацый ЮНЕСКА і ІФЛА да захавання бібліятэчных матэрыялаў у якасці культурнай спадчыны. Фотадакументы асобна і ў спалучэнні з тэкставай ці іншай інфармацыяй, бясспрэчна з'яўляюцца часткай рэгіянальнай, айчыннай і сусветнай культурнай і інтэлектуальнай спадчыны.

Фарміраванне і выкарыстанне рэсурсаў фотадакументаў у бібліятэцы абапіраецца на ўяўленні аб іх класіфікацыі.

Фотадакументы дыферэнцыруюцца па шэрагу прымет, некаторыя з іх асабліва важныя для бібліятэкараў-краязнаўцаў: па арыгінальнасці, па колернасці відарыса, характары прасторавага ўспрыймання, па жанрах, па знакавай прыродзе інфармацыі і інш. (Віды фатаграфіі вывучаліся ў курсе “Дакументазнаўства”.)

Па арыгінальнасці выдзяляюцца фатаграфіі арыгіналы і копіі. Фатаграфіі-арыгіналы атрымліваюць на светаадчувальнай плёнцы і іншых носьбітах у выніку аўтарскай здымкі.

У фатаграфіях-арыгіналах выдзяляюць такія віды, як фатаграфія, негатыў, пазітыў, дыяпазітывы (слайды), стэрэапара, стэрэадыяпазітыў, фотаальбом, галаграфія.

Фатаграфіі-копіі атрымліваюць у выніку адна- ці шматразовага капіравання арыгінала. Паводле дзяржаўнага стандарту РБ (СТБ ГОСТ 7.60-2005) “Выданні. Асноўныя віды” па знакавай прыродзе інфармацыі выдзелены выяўленчыя выданні, для якіх характэрна ўзнаўленне спецыяльнай або мастацкай фатаграфіі, а ў іх складзе фотаальбомы. Іншымі выяўленчымі выданнямі, дзе фатаграфія займае галоўнае месца з’яўляюцца камплекты паштовак і мастацкія календары. У кнігах, часопісах і іншых сродках масавай інфармацыі шырока распаўсюджана рэпрадукцыйная фатаграфія, калі здзяйняецца фатаграфічнае ўзнаўленне карцін, карт, планаў, паштовак, саміх фатаграфій і іншых твораў і дакументаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па колернасці відарыса: чорна-белая і каляровая, па характары прасторавага ўспрыймання: плоскасная (звычайная) і аб'ёмная (стэрэаскапічная). Асобым відам з'яўляецца галаграфія.

Жанры краязнаўчай фатаграфіі: партрэт, партрэт парны, партрэт групавы (трох і больш асоб, звязаных з рэгіёнам). Цэніцца глыбіня пранікнення ў сутнасць чалавечага характару, дакладнасць адлюстроўваемых дэталяў.

Сюжэтная фатаграфія (адлюстроўвае падзеі ў краі). Відавая фатаграфія (від помніка, будынка, інтэр'еру, асобнага прадмета). Пейзажная фатаграфія, у якой аб'ектам адлюстравання з'яўляецца навакольная прырода.

Вельмі цэняцца фотаальбомы – арыгінальных краязнаўчых фатаграфій, створаных мясцовымі фотамайстрамі або вядомымі фатографамі. Прадстаўляць каштоўнасць і фотаальбомы аматарскія, якія вядуцца ў сем'ях, установах. Іх значэнне залежыць ад ролі роду, яго прадстаўнікоў у гісторыі.

Ахарактарызаваныя фатаграфіі арыгіналы прадстаўляюць немалую каштоўнасць для зберажэння рэгіянальнай культурнай спадчыны і яшчэ падкрэслім, вельмі станоўча, калі бібліятэка пачынае працу па збору, вывучэнні і выкарыстанні гэтага унікальнага рэсурса.

Адметнасцю рэпрадукцыйных фатаграфій (копій) з'яўляецца шырокая рассеянасць, што памнажае высілкі бібліятэкараў пры фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў фатаграфіі.

Рэпрадукцыйная фотадакументы прадстаўлены ў бібліятэках друкаванымі фотаальбомамі, фатаграфіямі, змешчанымі ў навуковай, навукова-папулярнай, даведачных выданнях, у часопісах, асабліва краязнаўчага і беларусазнаўчага зместу.

Фотаальбомы прысвячаюцца абласцям, раёнам, гарадам, прыродным рэгіёнам, эканамічным цэнтрам, помнікам розных відаў (архітэктурным, гістарычным і інш.), актуальным тэмам.

Паспрабуем абагульніць працэсы і кірункі дзейнасці з фотадакументамі у бібліятэцы. Абагульненне зроблена на падставе вывучэння звестак па тэме, рассеяных па апублікаваных і неапублікаваных матэрыялах, агульных тэхналагічных падыходах.

На жаль, менавіта з пункту гледжання бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці работа з краязнаўчымі фотадакументамі распрацавана недастаткова, амаль няма адпаведных публікацый. Разнастайныя кірункі дзейнасці з фотадакументамі патрабуюць пэўнага метадычнага асэнсавання. Адзінай жа працай, дзе была падкрэслена важнасць фатаграфій для краязнаўчай работы бібліятэк, былі метадычныя рэкамендацыі "Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк". У парадах па стварэнні дакументнай і фактаграфічнай базы "Народны архіў",



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прысвечанай адлюстраванню матэрыялаў аб насельніцтве края і мясцовых дзеячах, у пераліку дакументаў, прысвечаных сем'ям і асобам, былі адзначаны і фатаграфіі. Разам з пісьмамі, біяграфіямі, успамінамі, асабістымі дакументамі фотаздымкі рэкамендавалася збіраць у асобных папках пад назвай "Радавод". Складальнікі дапаможніка далі кароткія парады па тэхналогіі апісання фатаграфій. Ахарактарызавалі методыку картатэкі фатаграфій жыхароў і ўраджэнцаў края, указалі, што нават пры адсутнасці "Народнага архіва" варта весці такую картатэку.

Работу з фотадакументамі ў бібліятэцы можна тэхналагічна падзяляліць на некалькі асноўных этапаў: выяўленне і адбор фотадакументаў, іх вывучэнне і апісанне, адлюстраванне ў краязнаўчым фондзе і ў краязнаўчым даведачна-бібліяграфічным апараце, выкарыстанне ў рабоце з карыстальнікамі. Вядзецца гэта дзейнасць большасцю супрацоўнікаў бібліятэкі і калі з іх вылучаны бібліятэкар-бібліёграф краязнавец, то ён павінен аказваць дапамогу іншым калегам.

Выяўленне фотадакументаў вядзецца бібліятэкарам-бібліёграфам па шырокаму колу крыніц. Раней большасць бібліятэк засяроджвалася на фатаграфіі рэпрадукцыйнай, змешчанай у выданнях, што зразумела. Але на сучасным этапе у полі інтарэсаў бібліятэкі знаходзіцца і арыгінальная краязнаўчая фатаграфія. Для іх выяўлення фатаграфій рэпрадукцыйных (копій) і арыгінальных выкарыстоўваюць розныя крыніцы.

Рэпрадукцыйныя фатаграфіі выяўляюцца па выданнях, што паступаюць у бібліятэку, а калі такая работа не вялася раней, то варта здзейсніць прагляд рэтраспектыўнай часткі краязнаўчага фонду, найбольш верагодных выданняў у плане наяўнасці рэдкіх фотаілюстрацый. (Напрыклад, у НББ знайшоўшы па картатэцы партрэтаў 2 фатаграфіі краязнаўцаў XIX ст., і праглядаючы само выданне – гэта зборнік успамінаў віцяблян, выдадзены ў пачатку XX ст., убачыла фатаграфіі яшчэ некалькіх мясцовых краязнаўцаў, якія не трапілі ў картатэку. Было нечаканасцю і радасцю). Неабходна ўважліва праглядаць новыя паступленні краязнаўчых і беларусазнаўчых выданняў, перыёдыкі, асабліва мясцовага друку і краязнаўчыя часопісы. Асноўнымі групамі выданняў, па якіх магчыма выяўляць фатаграфіі аб рэгіёнах, з'яўляюцца фотаальбомы, даведачныя, навуковыя і навукова-папулярныя выданні, мясцовы перыядычны друк, электронныя краязнаўчыя выданні. Напрыклад, завершана ў Беларусі выданне гісторыка-дакументальных хронік гарадоў і раёнаў "Памяць", у якія ўвайшоў багаты пласт партрэтных фатаграфій, сабраных складальнікамі з немалымі цяжкасцямі. Выходзіць некалькі энцыклапедычных выданняў, прысвечаных населеным пунктам ("Гарады і вёскі Беларусі" і інш.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Краязнаўчыя фотаальбомы, камплекты паштовак выяўляюцца з дапамогай матэрыялаў выдавецка-кнігагандлёвай бібліяграфіі, па "Летапісу выяўленчага мастацтва" і паказальніках "Новая літаратура аб вобласці". Па "Летапісу выяўленчага мастацтва" магчыма выяўляць фотаілюстрацыі мастацкіх твораў з выданняў, асабліва часопісаў.

Фатаграфіі-арыгіналы набываюцца шляхам:

– збору ў мясцовага насельніцтва, ураджэнццаў края і іх нашчадкаў.
– набыцця ў краязнаўцаў-фатографаў.

Адбор фотадакументаў таксама з'яўляецца вельмі важным. Каштоўнасць фатаграфіі тым вышэйшая, калі яна ўпершыню адлюстроўвае пэўны аб'ект або асобу, паказвае рэдкія падзеі і г.д. Таму пры адборы краязнаўчых фотадакументаў да іх падыходзяць, як да гістарычных крыніц:

улічваюць такія паказчыкі, як унікальнасць, арыгінальнасць, актуальнасць, навізна, дастаupernасць. Важную ролю адыгрывае і мастацкі ўзровень, захаванасць.

Заслугоўвае ўвагі ў працэсах выяўлення фатаграфій, іх капіравання для бібліятэкі, адбору, ўзаемадзеянне з установамі – фондатрымальнікамі фотадакументаў, зносіны з краязнаўцамі фатографамі і збіральнікамі, аматарскімі арганізацыямі фатографаў.

Вельмі важным працэсам з'яўляецца вывучэнне фотадакументаў. Пачынаецца падчас адбору фатаграфій і накіравана на атрыбуцыю адлюстраванай і высвятленне гістарычнага кантэксту. Можна прапанаваць наступную паслядоўнасць дзеянняў бібліятэкара-бібліёграфа пры вывучэнні фатаграфій: устанаўленне важнейшых знешніх характарыстык, гэта, у прыватнасці, яго віду, (фатаграфія, фотаальбом, негатыў і інш.), жанру; вызначэнне назвы, крыніцы і даты паступлення; устанаўленне сувязі фатаграфіі з іншымі дакументнымі краязнаўчымі рэсурсамі. Магчымы і дадатковыя аперацыі, накіраваныя на больш глыбокую ідэнтыфікацыю фотадакумента, напрыклад, выяўленне памеру, тэхнікі выканання, ступені захаванасці і інш.

Бібліяграфічнае апісанне фотадакументаў для краязнаўчых каталогаў, картатэк, БД, бібліяграфічных выданняў выконваецца паводле дзеючых стандартаў і правіл.

Але прадстаўляецца карыснай раіць бібліятэкарам-краязнаўцам апісання набытых фатаграфій (арыгіналаў) з элементамі навуковай характарыстыкі. Гэта можа прынесці карысць пры правядзенні краязнаўчых даследаванняў. Такое апісанне спалучае даныя атрыбуцыі фатаграфіі, яго знешняга выгляду, характарыстыкі сюжэта і кампазіцыі відарыса; звязвае фатаграфію з іншымі дакументнымі рэсурсамі і становіцца унікальным кампанентам краязнаўчых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ведаў, якія магчыма нельга атрымаць па іншых крыніцах. Яго пажадана падаваць у сувязі са зместам тых краязнаўчых ведаў, у комплекс якіх будзе ўключана фатаграфія. У прыватнасці пры апісанні адзення асобы, можна адзначыць, з якімі ўзнагародамі, характэрнымі ці не тыповымі для часу і мясцовасці ўпрыгожваннямі, на якім фоне і інш., бо такая інфармацыя можа быць карыснай для краязнаўцаў.

Важным элементам бібліяграфічнага і навуковага апісання фотадакумента з'яўляецца назва. Фотадакумент можа мець аўтарскую назву, звесткі, адзначаныя сфатаграфанымі асобамі, а таксама ўказаныя даты і месца фотаздымкі, а зараз і час. Пры адсутнасці даных, іх трэба шукаць іншымі шляхамі, напрыклад, звяртацца да сваякоў ці сведак, да навуковых прац, кансультавацца з краязнаўцамі. У назвах партрэтаў неабходна ўказваць прозвішча, імя, імя па бацьку адлюстраванай асобы і звесткі важныя для краязнаўчага аспекту (пасада, прафесія, тытул, месца жыхарства, удзел у пэўнай падзеі). У назве парнага ці групавога партрэта пералічыць усіх асоб, але на першым месцы тых, якія звязаны з дадзеным краем.

У назвах сюжэтных, відавых, пейзажных фотадакументаў, калі яны даюцца бібліятэкам-бібліёграфам, можа спачатку вызначаецца агульны змест, затым важныя дэталі. Пры адсутнасці дакладных звестак пра час і месца фотаздымкі пажадана ўстанавіць іх прыблізна.

Фотадакументы шырока выкарыстоўваюцца ў формах масавай работы бібліятэкі; наглядных формах папулярызацыі краязнаўчых ведаў; у працэсе фарміравання краязнаўчых бібліяграфічных рэсурсаў.

У формах масавай работы бібліятэкі краязнаўчая фатаграфія выкарыстоўваецца ў фотавернісажах, фотагалерэях, пры правядзенні урокаў гісторыі края, прэм’ер (прэзентацыі краязнаўчых) кніг, вечарын ўшанавання землякоў, “вандраванняў” па краі. З ёю працуюць краязнаўчыя аматарскія аб’яднанні, ствараюцца музейныя экспазіцыі і інш.

Шырока выкарыстоўваецца фатаграфія ў наглядных формах папулярызацыі краязнаўчых ведаў. У айчынным і замежным спецыяльным друку, у справаздачах бібліятэк прыводзяцца звесткі аб арганізацыі фотавыстаў “Край сёння”, “Мінулае і сучаснасць края”, “Помнікі і памятныя мясціны края”, па тэмах прыроды і экалогіі, фотагалерэй і персанальных выстаў майстроў краязнаўчай фатаграфіі і інш.

Вельмі важнае значэнне набыла фатаграфія і ў краязнаўчых інфармацыйна-бібліяграфічных рэсурсах бібліятэкі. Фотадакументы адлюстроўваюцца ў краязнаўчых каталогах, картатэках, у т.л. спецыяльных картатэках фатаграфіі, неацэнныя пры фарміраванні БД. Наяўнасць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фотаілюстрацый адлюстроўваецца ў бібліяграфічных апісаннях дакументаў у каталогах і картатэках краязнаўчай літаратуры.

Картатэкі фатаграфій могуць быць прысвечаны жыхарам і ўраджэнцам края, пейзажам, помнікам або іншай тэматыцы. НББ у метадычных рэкамендацыях "Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк" дае парады па вядзенні картатэкі жыхароў і ўраджэнцаў края, з імі пазнаёміся самастойна (с. 60). Гэтыя парады адпавядаюць і для картатэк фатаграфіі іншай тэматыкі.

У краязнаўчы ДБФ уключаюцца выданні з багатымі фактаграфічнымі матэрыяламі і фатаграфіямі, бібліяграфічныя дапаможнікі, прысвечаныя майстрам краязнаўчай фатаграфіі, па фотамастацтве края. (Такіх яшчэ няма).

Ёсць падставы прапанаваць бібліятэкам і кірунак краязнаўчых даследаванняў, прысвечаных фатаграфіі.

Вельмі пажадана, каб краязнаўчая даследчая дзейнасць бібліятэк ахоплівала і вывучэнне гісторыі фотасправы ў краі, уключаючы фотаатэлье, фатографаў прафесіяналаў і адметных аматараў, вывучэнне асобных фотадакументаў, і вядома вывучэнне інфармацыйных рэсурсаў фотадакументаў. Гэта даступны і цікавы кірунак навуковых пошукаў. Яго вынікам могуць быць навуковыя і навукова-папулярныя даклады, выступленні, публікацыі. На жаль, кірунак яшчэ не распаўсюджаны.

Краязнаўчая фатаграфія – важны, адметны кірунак фотамастацтва, сацыяльна-культурная і грамадская запатрабаванасць якога зараз заметна ўзрастае.

Для бібліятэк, якія вядуць краязнаўчую работу з'яўляецца каштоўным дакументным рэсурсам. Шырока выкарыстоўваецца ў практычнай дзейнасці, часта як ілюстрацыйны матэрыял. Але краязнаўчая фатаграфія, валодаючы вялікім пазнавальным патэнцыялам, можа быць асновай, важнейшым элементам некаторых інавацыйных прадуктаў і паслуг, новых кірункаў дзейнасці бібліятэкі. Можна раіць бібліятэкам фарміраваць фонды арыгінальных фатаграфій аб краі, калекцыі твораў фатографаў краязнаўцаў, картатэкі і БД фатаграфіі, электронную энцыклапедыю "Край у фатаграфіі", даваць спасылкі на сайты, з багатымі фотаматэрыяламі аб краі. Плённым і цікавым кірункам, даступным для бібліятэкараў можа быць развіццё фотамастацтва ў краі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## ТЭМАТЫКА ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

| п/п | Назва тэмы | Від заняткаў і колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Крыніцы па генеалогіі і геральдыцы насельніцтва беларускіх рэгіёнаў | 2 гадзіны, практычная работа |
| 2. | Крыніцы інфармацыі па тапаніміцы рэгіёнаў Беларусі | 2 гадзіны, практычная работа |
| **Усяго: 4 г. – практычныя работы** | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМАТЫКА І МЕТАДЫЧНЫЯ ЎКАЗАННІ ДЛЯ ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

### ПРАКТЫЧНАЯ РАБОТА

па тэме **“Крыніцы генеалогіі і геральдыкі**”, 2 гадзіны

*Мэта:* пазнаёміцца з крыніцамі генеалогіі і геральдыкі, правесці пошук генеалагічных звестак і гербоў.

*Выкананне*: На падставе навуковай, даведачнай літаратуры і іншых крыніц кожны студэнт павінен падрыхтаваць пісьмовыя адказы на прыведзеныя пытанні. Заданні 1 – 3 выконваюцца кожным студэнтам, заданні 4 – 8 – індывідуальныя, размяркоўваюцца сярод студэнтаў выкладчыкам не менш за 4 заданні. Па ходу занятку і пасля яго праверкі выкладчыкам абмяркоўваюцца асаблівасці крыніц, паўната і надзейнасць прадстаўленай у іх інфармацыі, зручнасць пошуку, шляхі выкарыстання ў рабоце бібліятэк.

Выкарыстоўваецца фонд бібліятэкі БДУКМ, НЭБ, іншыя інтэрнэт-рэсурсы.

*Пытанні:*

***Заданне 1.*** Ахарактарызуйце некалькі геральдычных і негеральдычных фігур гербоў.

***Заданне 2.*** На інтэрнэт-партале “Архівы Беларусі” звярніцеся да раздзела “Геральдыка” (https://archives.gov.by/home/geraldika) → Афіцыйныя геральдычныя сімвалы Рэспублікі Беларусь → Тэрытарыльная геральдыка:

– каротка апішыце напаўненне гэтага раздзела. Прывядзіце 1-2 імя аўтараў сучасных гербоў;

– прывядзіце прыклад зацвярджэння гістарычнага герба;

– прывядзіце прыклады 1-2 гербоў вёсак. Якія гістарычныя падставы вы выявілі для надання вёсцы герба?

***Заданне 3.*** Адшукайце раздзел “Геральдыка” на сайце аднаго з раённых, гарадскіх ці абласных выканаўчых камітэтаў Мінскай вобласці (на выбар): герб і наяўнасць даты яго заснаваня, апісання і Палажэння аб гербе.

***Заданне 4. На аснове аднаго з сучасных рэгіянальных гербоўнікаў адкажыце на пытанні*:**

1. Значэнне данага гербоўніка.
2. Характарыстыка структуры гербоўніка ў цэлым.
3. Межы якой тэрыторыі гербоўнік ахоплівае.
4. Якія крыніцы былі выкарыстаны для падрыхтоўкі гербоўніка?
5. Якія праблемныя пытанні вырашаліся складальнікамі?
6. Наколькі інфармацыя ў гербоўніку з'яўляецца поўнай, ці даецца цэласнае прадстаўленне гісторыі рода?
7. Бібліяграфічнае аснашчэнне гербоўніка.

***Заданне 5. На аснове “Малога гербоўніка Наваградзкай шляхты” адкажыце на пытанні:***

1. Якія шляхецкія роды карысталіся гербам Абданк?
2. Якія шляхецкія роды карысталіся гербам Магіла?
3. Якія шляхецкія роды карысталіся гербам Порай?
4. Якія шляхецкія роды карысталіся гербам Ястрабец?
5. Якія шляхецкія роды карысталіся гербам Трубы?
6. Якія шляхецкія роды карысталіся гербам Сыракомля?
7. Хто выводзіўся з роду Літоўскіх?
8. Хто выводзіўся з роду Маеўскіх?
9. Хто выводзіўся з роду Малюшыцкіх?
10. Хто выводзіўся з роду Абламовічаў?
11. Хто выводзіўся з роду Анцутаў?
12. Які герб мелі Збароўскія? Калі яны былі прызнаны ў расійскім дваранстве?
13. Які герб мелі Ігнатовічы? Якімі фальваркамі валодалі прадстаўнікі роду?

***Заданне 6. На аснове “Гербоўніка халопенічскай шляхты” адкажыце на пытанні:***

1. Які герб мелі Янушкоўскія шляхціцы? Калі яны былі прызнаны ў расійскім дваранстве?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Які герб мелі Барэйшы шляхціцы? Калі яны былі прызнаны ў расійскім дваранстве?

3. Які герб мелі Аскеркі шляхціцы? Колькі разоў яны падавалі дакументы на прызнанне ў расійскім дваранстве?

4. Які герб мелі Ханецкія шляхціцы? Хто першым з гэтага роду атрымаў шляхецтва? Якім маёнткам валодаў Міхал Ханецкі? Ці была ўласная зямля ў яго нашчадкаў?

5. Які герб мелі неафіты Яроцкія? Хто і калі першым з гэтага роду атрымаў шляхецтва?

***Заданне 7. На аснове "Гербоўніка беларускай шляхты" адкажыце на пытанні:***

***Том 1.***

1. Які герб мелі шляхціцы татарскага паходжання Александровічы? Як звалі сыноў прадстаўніка трэцяга калена Разеба Александровіча? У якім годзе яны былі прызнаны ў расійскім дваранстве і калі зацверджаны ўказам Сената?

2. Які герб мелі шляхціцы Акінчыцы? У якім годзе нарадзіўся прадстаўнік восьмага калена Вікенці? Як звалі яго бацьку? Ці было зацверджана іх дваранства указам Сената Расійскай імперыі?

3. Які герб мелі шляхціцы Акулічы? У якім годзе нарадзіўся прадстаўнік шостага калена Канстанцін? Якія ёе атрымаў пасады і ўзнагароды? Ці прадоўжыў ён род па мужчынскай лініі?

***Том 2.***

1. Які герб мелі шляхціцы Брылеўскія? Якія важнейшыя пасады займалі прадстаўнікі роду, дзе пражывалі?

2. Якія гербы насілі прадстаўнікі родаў з прозвішчам Богушы? Дайце кароткае апісанне гэтых гербоў.

4. Якія гербы насілі прадстаўнікі родаў з прозвішчам Багдановічы? У якім годзе яны былі прызнаны ў расійскім дваранстве і калі зацверджаны ўказам Сената? (На прыкладзе адной лініі).

5. Які герб насілі шляхціцы Баранкевічы? Якія важнейшыя пасады займалі прадстаўнікі роду, дзе пражывалі?

***Том 6.***

***Па "Гербоўніку беларускай шляхты" адкажыце на пытанні:***

Які герб мелі шляхціцы Ельскія (Jelski), дзе пражывалі? Дайце кароткае апісанне герба.

Які герб мелі шляхціцы Жакевічы (Żakiewicz), дзе пражывалі? Дайце кароткае апісанне герба.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Том 8.***

1. Які герб мелі шляхціцы Зелянкевічы (Zielenkiewicz), дзе пражывалі? Дайце кароткае апісанне герба.

2. Які герб мелі шляхціцы Зялёнкі (Zielonko), дзе пражывалі? Дайце кароткае апісанне герба.

***Заданне 9. Па "Алфавитному спискам дворянских родов Минской губернии…1903"*** прывесці прыклады прозвішчаў дваран, якія адносіліся да 1, 2 і 3 разраду дваранства. У якія гады яны былі зацверджаны ў расійскім дваранстве? Доступ праз НЭБ ці іншыя інфармацыйныя рэсурсы.

***Па "Алфавитному спискам дворянских родов Могилевской губернии…1908***" прывесці прыклады прозвішчаў дваран, якія адносіліся да 1, 2 і 3 разраду дваранства. Доступ праз Государственную публичную историческую библиотеку России ці іншыя інфармацыйныя рэсурсы.

**Крыніцы:**


1. Алфавитный список дворянским родам Минской губернии, внесенным в дворянскую родословную книгу по 1 июля 1903 года. – Минск, 1903.
2. Алфавитный список дворянским родам, внесенным в родословные дворянские книги Могилевской губернии. – Могилев, 1908.
3. Гербоўнік беларускай шляхты / Нац. цэнтр па арх. і справаводству Рэсп. Беларусь, Нац. гіст. арх. Беларусі, Бел. навук.-даслед. ін-т дакументазнаўства і арх. справы. – Мінск, 2002. – ТТ. 1-7.
4. Крукоўскі, У. З гісторыі беларускіх прыватных гербаў / У. Крукоўскі. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2010. – 136 с. : іл.
5. Рассадзін, С.Я. Гербы і сцягі гарадоў і раёнаў Беларусі / С.Я. Рассадзін, А.М.Міхальчанка. – Мінск : Беларусь, 2005. – 127 с.
6. Цітоў, А.К. Геральдыка беларускіх местаў (XVI - пач. XX ст.) / А.К.Цітоў. – Мінск : Полымя, 1998. – 284 с.
7. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / Беларуская Энцыклапедыя. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1993—2003.
8. Яцкевіч, З. Малы гербоўнік халопеніцкай шляхты / З.Яцкевіч – Мінск : Бел. кнігазбор., 1999. – 494 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРАКТЫЧНАЯ РАБОТА

па тэме **“Крыніцы тапанімікі**”, 2 гадзіны

*Мэта:* пазнаёміцца з крыніцамі тапанімікі розных гістарычных перыядаў і іх выданнямі.

*Выкананне*: правесці выяўленне крыніц, адказаць на прапанаваныя пытанні, ахарактарызаваць адлюстраваныя дадзеныя, структуру і даведачна-метадычны апарат выданняў. Індывідуальныя пошукавыя задачы размяркоўваюцца выкладчыкам. Студэнты выконваюць мінімальна 5 пошукаў.

Пры выкарыстанні геаграфічнага паказальніка (заданні 1, 3) важна ўлічваць магчымасць гістарычна-геаграфічнай ідэнтыфікацыі населеных пунктаў і лакалізацыі ў межах тагачасных і сучасных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, змяненні тыпаў населеных пунктаў.

Па ходу занятку і пасля яго праверкі выкладчыкам абмяркоўваюцца асаблівасці крыніц, паўната і надзейнасць прадстаўленай у іх інфармацыі, зручнасць пошуку, выкарыстанне ў рабоце бібліятэк.

Выкарыстоўваецца фонд мульцімедыйных выданняў 418 каб., НЭБ, Онлайн библиотека Царское Село // http://book-old.ru.

***Заданне 1. Па мульцімедыйным выданні “Региональная история Беларуси в документах и материалах Виленской археографической комиссии (1864 – 1915)”:***

1. У 8-м томе указана “имение Абрамовщизна” Ошмянского повета. Ці існуе ў наш час гэта пасяленне, прывядзіце яго назву і адміністрацыйна-тэрытарыяльную прыналежнасць.
2. У 38-м томе ўпамянуты “застенок Адамишки”, да якой адміністрацыйна-гаспадарчай адзінкі належаў? Ці існуе ў наш час гэта пасяленне, прывядзіце яго назву і адміністрацыйна-тэрытарыяльную прыналежнасць.
3. У 13-м томе названа “село Амбросовичи” Витебского повета. Ці існуе ў наш час гэта пасяленне, прывядзіце яго назву і адміністрацыйна-тэрытарыяльную прыналежнасць.
4. У 35-м томе названа “село Андрейки” Ошмянского повета. Ці існуе ў наш час гэта пасяленне, прывядзіце яго назву і адміністрацыйна-тэрытарыяльную прыналежнасць.
5. У 9-м томе названа “имение Антополь” Брэсцкага ваяводства. Ці існуе ў наш час гэта пасяленне, прывядзіце яго назву, тып і адміністрацыйна-тэрытарыяльную прыналежнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. У 7-м томе названа “село Бали” Городенского повета. Ці існуе ў наш час гэта пасяленне, прывядзіце яго назву і адміністрацыйна-тэрытарыяльную прыналежнасць.

7. У 21-м томе названа “Бальская церковь Святого Спаса”. Ці існуе ў наш час пасяленне, у якім яна існавала? Прывядзіце яго назву і адміністрацыйна-тэрытарыяльную прыналежнасць.

8. У 15-м томе названы “Борколабов” Мстиславского воеводства. Ці існуе ў наш час гэта пасяленне, прывядзіце яго назву і адміністрацыйна-тэрытарыяльную прыналежнасць.

9. У 37-м томе названы “Бигомль”. Ці існуе ў наш час гэта пасяленне, прывядзіце яго назву, тып і адміністрацыйна-тэрытарыяльную прыналежнасць.

10. У 18 и 34-м тамах названа “село Бологуши, Бологуша”. Ці існуе ў наш час гэта пасяленне, прывядзіце яго назву, тып і адміністрацыйна-тэрытарыяльную прыналежнасць.

***Заданне 2. Па “Памятных книжках» беларускіх губерняў у перыяд Расійскай імперыі адказаць на пытанні:***

1. У якой воласці і павеце Мінскай губерні знаходзілася Давід-Гарадокскае народнае вучылішча?

2. У якой воласці і павеце Мінскай губерні знаходзілася Жыткавічскае народнае вучылішча?

3. У якой воласці і павеце Мінскай губерні знаходзілася Навагрудскае народнае вучылішча?

4. У якой воласці і павеце Мінскай губерні знаходзілася Пінькавічскае народнае вучылішча?

5. У якой воласці і павеце Мінскай губерні знаходзілася Слабада-Скрыгалаўскае народнае вучылішча?

6. У якой воласці і павеце Мінскай губерні знаходзілася Столінскае народнае вучылішча?

7. У якой воласці і павеце Мінскай губерні знаходзілася Стаўбцоўскае народнае вучылішча? Як пісалася назва населенага пункта?

8. У які павет Мінскай губерні ўваходзілі Лоеўская і Нараўлянская воласці?

9. У які павет Мінскай губерні ўваходзілі Клецкая і Ляхавічская воласці?

10. У які павет Мінскай губерні ўваходзілі Карэлічская, Мірская і Цырынская воласці?

11. У які павет Мінскай губерні ўваходзілі Лемяшэвічская і Лунінская воласці?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

12. У які павет Мінскай губерні ўваходзілі Лельчыцкая і Ленінская воласці?

13. У які павет Мінскай губерні ўваходзілі Дукорская і Уздзенская воласці?

14. У які павет Мінскай губерні ўваходзілі Лагойская і Мсціжская воласці?

15. У які павет Мінскай губерні ўваходзілі Азарычская і Свіслачская воласці?

16. У які павет Мінскай губерні ўваходзілі Івянецкая, Ракаўская і Сенніцкая воласці?

17. Назавіце 3 навучальныя ўстановы Пінскага павету Мінскай губерні ў пачатку XX ст.

18. Прывядзіце назвы банкаў, якія існавалі ў Мінску ў 1905 г.

19. Прывядзіце назвы медыцынскіх устаноў, якія існавалі ў Мінску ў 1905 г.

20. Назавіце горад Мінскай губерні, у якім у 1905 г. было найменш жыхароў. Прывядзіце колькасць жанчын і мужчын.

21. Назавіце 3 буйнейшыя гарады Мінскай губерні ў 1905 г. па колькасці жыхароў.

22. Колькі жыхароў было ў 1905 г. ў Рэчыцы Мінскай губерні, якая канфесія пераважала? Укажыце тып гэтага населенага пункта.

23. Колькі жыхароў было ў 1905 г. ў Нясвіжы Мінскай губерні, якая канфесія пераважала? Укажыце тып гэтага населенага пункта.

24. Колькі жыхароў было ў 1905 г. ў Слуцку Мінскай губерні, якая канфесія пераважала? Укажыце тып гэтага населенага пункта.

25. Колькі жыхароў было ў 1905 г. ў Ігумене Мінскай губерні, якая канфесія пераважала? Укажыце тып гэтага населенага пункта.

26. Колькі жыхароў было ў 1905 г. ў Барысаве Мінскай губерні, якая канфесія пераважала? Укажыце тып гэтага населенага пункта.

27. Колькі жыхароў было ў 1905 г. ў Мінску, якая канфесія пераважала? Укажыце тып гэтага населенага пункта.

28. Колькі жыхароў было ў 1905 г. ў Бабруйску Мінскай губерні, якая канфесія пераважала? Укажыце тып гэтага населенага пункта.

29. Колькі жыхароў было ў 1905 г. ў Навагрудку Мінскай губерні, якая канфесія пераважала? Укажыце тып гэтага населенага пункта.

30. Назавіце тып гарадского населенага пункта Друскенікі Гродзенскай губерні. Укажыце, да якога павету ён адносіўся, колькі было ў ім жыхароў і якая адлегласць да губернскага цэнтра.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

31. Назавіце тып гарадского населенага пункта Брэст-Літоўск Гродзенскай губерні. Укажыце, да якога павету ён адносіўся, колькі было ў ім жыхароў і якая адлегласць да губернскага цэнтра.

32. Назавіце тып населенага пункта Зэльва Гродзенскай губерні. Укажыце, да якога павету ён адносіўся, колькі было ў ім жыхароў і якая адлегласць да губернскага цэнтра.

33. Назавіце тып населенага пункта Лунна Гродзенскай губерні. Укажыце, да якога павету ён адносіўся, колькі было ў ім жыхароў і якая адлегласць да губернскага цэнтра.

34. Назавіце тып населенага пункта Скідэль Гродзенскай губерні. Укажыце, да якога павету ён адносіўся, колькі было ў ім жыхароў і якая адлегласць да губернскага цэнтра.

35. Назавіце тып населенага пункта Масты Гродзенскай губерні. Укажыце, да якога павету ён адносіўся, колькі было ў ім жыхароў і якая адлегласць да губернскага цэнтра.

36. Назавіце тып населенага пункта Высокае Літоўскае Гродзенскай губерні. Укажыце, да якога павету ён адносіўся, колькі было ў ім жыхароў і якая адлегласць да губернскага цэнтра.

37. Назавіце тып населенага пункта Пружаны Гродзенскай губерні. Укажыце, да якога павету ён адносіўся, колькі было ў ім жыхароў і якая адлегласць да губернскага цэнтра.

38. Назавіце тып населенага пункта Іванава Гродзенскай губерні. Укажыце, да якога павету ён адносіўся, колькі было ў ім жыхароў і якая адлегласць да губернскага цэнтра.

39. Назавіце тып населенага пункта Камянец-Літоўскі Гродзенскай губерні. Укажыце, да якога павету ён адносіўся, колькі было ў ім жыхароў і якая адлегласць да губернскага цэнтра.

40. Назавіце тып населенага пункта Косава Гродзенскай губерні. Укажыце, да якога павету ён адносіўся, колькі было ў ім жыхароў і якая адлегласць да губернскага цэнтра.

41. Назавіце тып населенага пункта Кобрын Гродзенскай губерні. Укажыце, да якога павету ён адносіўся, колькі было ў ім жыхароў і якая адлегласць да губернскага цэнтра.

42. Назавіце тып населенага пункта Малеч Гродзенскай губерні. Укажыце, да якога павету ён адносіўся, колькі было ў ім жыхароў і якая адлегласць да губернскага цэнтра.

43. Назавіце праваслаўныя цэрквы і іх адрасы ў г. Горкі Магілёўскай губерні ў пачатку XX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

44. Назавіце касцёлы ў і іх адрасы ў Горацкім павеце Магілёўскай губерні ў пачатку XX ст.

45. Які манастыр быў у Гомелі ў пачатку XX ст. Укажыце адрас.

46. Назавіце 3 навучальныя ўстановы ў Гомелі Магілёўскай губерні ў пачатку XX ст., укажыце іх адрасы.

47. Прывядзіце назвы навучальных ўстаноў, якія былі ў 1865 г. у Клімавічскім павеце Магілёўскай губерні.

48. Прывядзіце назвы навучальных ўстаноў, якія былі ў 1865 г. у Аршанскім павеце Магілёўскай губерні.

49. Прывядзіце назвы навучальных ўстаноў, якія былі ў 1865 г. у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні.

50. Прывядзіце назвы навучальных ўстаноў, якія былі ў 1865 г. у Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні.

51. Прывядзіце назвы навучальных ўстаноў, якія былі ў 1865 г. у Быхаўскім павеце Магілёўскай губерні.

52. Прывядзіце назвы навучальных ўстаноў, якія былі ў 1865 г. у Мсціслаўскім павеце Магілёўскай губерні.

53. Назавіце конныя станцыі ад Оршы да Клімавіч Магілёўскай губерні, існаваўшыя ў 1865 г.

54. Назавіце медыцынскія ўстановы, якія ўснавалі ў 1865 г. у Магілёве.

55. У якіх гарадах Гомельскага павету ў пачатку XX ст. былі аддзяленні Саюза рускага народа (чарнасоценцаў). Укажыце саслоўны склад кіраўніцтва аддзяленняў Саюза.

56. Прывядзіце назвы і адрасы бальніц у Магілёве ў пачатку XX ст.

57. Па якому адрасу размяшчалася Паліцэйская стража Магілёўскай губерні ў пачатку XX ст.?

58. Па якому адрасу размяшчаўся ў Магілёве ў пачатку XX ст. Настаўніцкі інстытут?

***Заданне 3. У 28-й кнізе Метрыкі ВКЛ:***

1. Названа "ыменье Забори». У якой мясцовасці яно знаходзілася, каму належала? Укажыце тып прыведзенага дакумента, год падпісання і сэнс зместу.

2. Названа "село Доложце". Хто атрымаў сяло ў сваё валоданне, якім дакументам гэта падцверджана? Якія абавязкі ўскладаліся на сялян?

3. Які прывілей у 1552 г. атрымалі жыхары Мінска (Менска)? З нагоды якой падзеі быў падпісаны дакумент? Прывядзіце 2-3 прыклады правоў і абавязкаў мінскіх мяшчан.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Названа “ыменье Голубичи». У якой мясцовасці яно знаходзілася, каму належала? Укажыце тып прыведзенага дакумента, год падпісання і сэнс зместу.

5. Названы “места Любошаны”. Як называлася пасяленне ў 1551 г. , да якога павету і ваяводства адносілася? Укажыце суму грашовага падатку. Прывядіце сучасную назву, тып населенага пункта і адміністрыцыйна-тэрытарыяльную прыналежнасць.

6. Укажыце суму грашовага падатку, якую выплочвалі ў 1551 г. мяшчане Пінска. Які адміністрацыйны статус меў Пінск, да якога ваяводства адносіўся?

7. Якія геаграфічныя аб’екты названы ў дакуменце “Листъ, даный дворенину господарскому, князю Янушу Любецкому»? Ці існуюць яны ў наш час?

***У 30-й кнізе Метрыкі ВКЛ:***

1. Як называліся ў 1546 г. вёска Сталовічы / Сталовичи (сёння – Баранавіцкі раён). Укажыце тагачасны тып пасялення і адміністрацыйна-тэрытарыяльную прыналежнасць.

2. Як называліся ў 1546 г. Рачуны (сёння – Смаргонскі раён). Укажыце тагачасны тып пасялення і адміністрацыйна-тэрытарыяльную прыналежнасць.

3. Да якога тыпу пасяленняў і адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі адносіўся ў 1546 г. сучасны горад Скідзель (Гродзенская вобл.)?

***У 70-й кнізе Метрыкі ВКЛ:***

1. Як называлася вёска Геранёны (Іўеўскі раён) у 1584 г.? Якім былі статус і адміністрацыйна-тэрытарыяльнае падпарадкаванне?

2. Як называлася вёска Вайцехава, Войцехово (Ашмянскі раён) у 1584 г.? У склад якой адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі ўваходзіла?

## Крыніцы


1. Метрыка Вялікага княства Літоўскага [Электронны рэсурс] / Ін-т гісторыі Нац. акад. навук Беларусі. 28 : Кніга запісаў (1522—1552) : Копія канца XVI ст. / Падрыхт.: В. Мянжынскі [і інш.]. — 2000. — 1 электронны аптычны дыск (CD-ROM). — (Athenaeum. Калекцыя "Помнікі" ; Т. 1).
2. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга 30 (1480 – 1546) : Кніга запісаў № 30 / Падрыхт. В. С. Мянжынскі ; Інстытут гісторыі НАН Беларусі. – Мінск : Беларуская навука, 2008. – 386 с.
3. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга 70 (1582 – 1585) : Кніга запісаў № 70 / Падрыхт. А. А. Мяцельскі; Інстытут гісторыі НАН Беларусі. – Мінск : Беларуская навука, 2008. – 354 с.
4. Памятные книжки Витебской губернии (1861–1914) [Электронный ресурс] / Национальная библиотека Беларуси. – Электронные текстовые,


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

графические данные и программа (2,62 Гб). – Минск: Национальная библиотека Беларуси, 2011. – 1 электронный оптический диск(DVD-ROM).

5. Памятные книжки Гродненской губернии (1847–1915) [Электронный ресурс] / Национальная библиотека Беларуси. – Электронные текстовые, графические данные и программа (4,5 Гб). – Минск : Национальная библиотека Беларуси, 2013. – 1 электронный оптический диск (DVD-ROM).

6. Памятные книжки Минской губернии (1845–1916) [Электронный ресурс] / Национальная библиотека Беларуси. – Электронные текстовые, графические данные и программа (4,05 Гб). – Минск : Национальная библиотека Беларуси, 2011. – 1 электронный оптический диск (DVD-ROM).

7. Памятные книжки Могилевской губернии (1853–1916) [Электронный ресурс] / Национальная библиотека Беларуси. – Электронные текстовые, графические данные и программа (3,8 Гб). – Минск : Национальная библиотека Беларуси, 2011. – 1 электронный оптический диск (DVD-ROM).

8. Региональная история Беларуси в документах и материалах Виленской археографической комиссии (1864—1915) [Электронный ресурс]: [сборник] / Национальная библиотека Беларуси. – Электронные текстовые, графические данные и программа (7,34 Гб). – Минск : НББ, 2018. - 1 электронный оптический диск (DVD-ROM).

9. НЭБ і Онлайн библиотека Царское Село // http://book-old.ru.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ

## МЕТАДЫЧНЫЯ ПАРАДЫ ДА САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ

Самастойная работа студэнтаў з'яўляецца асноўным спосабам засваення навучальнага матэрыялу па вучэбнай дысцыпліне “Краязнаўчае крыніцазнаўства”. Мэта самастойнай працы студэнтаў – садзейнічанне засваенню ў неабходным аб'ёме зместу вучэбнай дысцыпліны праз сістэматызацыю, планаванне і самакантроль асабістай вучэбнай дзейнасці.

У мэтах ацэнкі якасці самастойнай работы студэнтаў ажыццяўляецца кантроль за яе выкананнем.

З улікам мэты, задач і зместу вучэбнай дысцыпліны “Краязнаўчае крыніцазнаўства” мэтазгодна выкарыстоўваць наступныя віды самастойнай работы студэнтаў:

– вывучэнне канспекта лекцый;

– работа студэнтаў з навуковай і вучэбна-метадычнай літаратурай, даведачнымі выданнямі, самастойнае вывучэнне студэнтамі асобных пытанняў вучэбнай дысцыпліны;

- кантралюемая самастойная работа ў выглядзе выканання індывідуальных заданняў у аўдыторыі падчас правядзення практычных заняткаў пад кантролем выкладчыка;

– падрыхтоўка да апытанняў, заліку.

Выкананая работа павінна адлюстроўваць ступень засваення студэнтам асноўных тэарэтычных пытанняў, уменне самастойна думаць, аналізаваць і абагульняць матэрыял, вызначаць праблемы, рабіць вывады.

Тэма **“Фотадакументы як крыніцы краязнаўчай інфармацыі”, 6 гадзін**

*Мэта*: Самастойная работа дапамагае паглыбіць засваенне тэмы, папоўніць .

*Выкананне*: азнаёміцца з фотаальбомамі, на падставе даведачнай, навуковай, навукова-папулярнай і іншай літаратуры азнаёміцца з выданнямі, якія маюць фотаілюстрацыі, выявіць фотамайстроў.

*Заданне 4* можа быць па жаданні студэнта заменена на іншую творчую работу з фотадакументамі.

***Заданне 1. Выяўленне апублікаваных фотадакументаў па бібліяграфічных крыніцах.***



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кожнаму студэнту на падставе краязнаўчых каталогаў, баз даных ці "Летапісу выяўленчага мастацтва" выявіць:

1. камплект фатаграфій (фотапаштовак), прысвечаных гораду, адміністрацыйна-тэрытарыльнай адзінцы, прыроднаму аб'екту ці іншай таксанамічнай адзінцы.

2. фотаальбом, прысвечаны рэгіёну ці населенаму пункту.

3. каляндар, прысвечаны любому рэгіянальнаму аб'екту, у афармленні якога выкарыстана фатаграфія.

***Заданне 2. Выявіць звесткі аб адным рэгіянальным фотамастаку (па выбары студэнта).***

1. Прывесці прозвішча, імя, даты жыцця ці перыяд творчасці.
2. Указаць рэгіён / населены пункт, з якімі звязана яго творчасць.
3. Выявіць жанры, у якіх працаваў фотамастак, адметныя рысы яго здымкаў.
4. Прывесці назвы і кароткія апісанні лепшых здымкаў.

***Заданне 3. Азнаёміцца з выданнем калекцыі аднаго са збіральнікаў краязнаўчых фотадакументаў ("Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej" Р. Афтаназі, А.Т .Федарука ("Старинные усадьбы Берестейщины", "Старинные усадьбы Минского края" ці іншых калекцыянераў па выбару студэнтаў.)***

1. Бібліяграфічнае апісанне выдання.
2. Вызначыць віды апублікаваных фатаграфій, рэгёны, якім яны прысвечаны, тэматыку.
3. Ці суправаджае фатаграфіі тэкст?
4. Адзначыць наяўнасць паказальнікаў да выдання, карт, прыкніжныя спісы літаратуры.
5. Біяграфічныя звесткі аб фотазбіральніку.

***Заданне 4. Падрыхтаваць макет выставы фотадакументаў, прысвечаных абранаму рэгіёну (населену пункту). Макет павінен утрымліваць:***

1. Назву выставы, назвы раздзелаў выставы.

2. Умоўныя абазначэнні фотадакументаў, прадстаўленых у раздзелах.

3. Спіс бібліяграфічных апісанняў фотадакументаў.

## Літаратура

1. Саітава, В.І. Фотадакументы як аб'ект краязнаўчай дзейнасці бібліятэк / В.І.Саітава // XI Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 24 – 26 мая 2006 г.): матэрыялы чытанняў. – Мінск, 2006. – С.121 – 126.
2. Фотография: энцикл. справочник. – Минск, 1992. – С.37 – 39. .

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПЫТАННІ ДА ЗАЛІКУ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

1. Агульная характарыстыка мемуарыстыкі.
2. Арганізацыя геральдычнай дзейнасці ў Беларусі на сучасным этапе.
3. Асаблівасці гербоў беларускіх тэрыторый у асобныя гістарычныя перыяды.
4. Асноўныя віды крыніц па дыялектах і гаворках беларускай мовы. Дыялекталагічныя слоўнікі.
5. Асноўныя дыялекты і гаворкі беларускай мовы.
6. Асноўныя паняцці геральдыкі і віды гербоў.
7. Віды фотадакументаў і выданняў фотадакументаў.
8. Дзейнасць бібліятэк з дакументальнымі крыніцамі аб рэгіянальных асаблівасцях беларускай мовы.
9. Дзейнасць бібліятэк з дакументальнымі крыніцамі тапанімікі.
10. Значэнне генеалагічнай інфармацыі і работа бібліятэкі па гэтаму напрамку.
11. Значэнне геральдыкі і кірункі работы з тэрытарыяльнымі геральдычнымі сімваламі ў бібліятэцы.
12. Значэнне мемуараў як крыніц інфармацыі ў краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі.
13. Інфармацыя аб беларускіх рэгіёнах і населеных пунктах у гербоўніках.
14. Крыніцазнаўства як навуковая дысцыпліна. Спецыфіка краязнаўчага крыніцазнаўства.
15. Паняцце “крыніца”, тыпы крыніц.
16. Рэгіянальныя тапанімічныя слоўнікі.
17. Тыпы населеных пунктаў у Беларусі і вынікі іх перайменаванняў.
18. Уплыў краязнаўчага крыніцазнаўства на фарміраванне прафесійнага светапогляду і ведаў бібліятэчнага спецыяліста.
19. Фотадакументы як крыніцы краязнаўчай інфармацыі ў дзейнасці бібліятэкі.
20. Характарыстыка крыніц генеалогіі.
21. Характарыстыка крыніц геральдыкі.
22. Характарыстыка крыніц па тапаніміцы беларускіх рэгіёнаў.
23. Характарыстыка рэгіянальных гербоўнікаў беларускай шляхты.
24. Этапы вывучэння фотадакументаў бібліятэчным спецыялістам краязнаўцам.
25. Этапы развіцця рэгіянальнай мемуарыстыкі ў Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМЫ КУРСАВЫХ І ДЫПЛОМНЫХ РАБОТ

1. Гульнёвыя формы прамоцыі рэгіянальнай тапанімікі ў ….. бібліятэцы.
2. Дзейнасць замежных бібліятэк ў галіне генеалогіі.
3. Край ва ўспамінах ураджэнцаў: бібліяграфічны даведнік.
4. Крыніцы па сямейнай гісторыі ў краязнаўчым фондзе …бібліятэкі.
5. Рэгіянальная гісторыя ў мемуарнай літаратуры: бібліяграфічны даведнік.
6. Тапаніміка рэгіёна: методыка падрыхтоўкі фактаграфічных інфармацыйных рэсурсаў.
7. **7.** Фотадакументы як інфармацыйны рэсурс у краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПЕРАЛІК СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ
### вынікаў вучэбнай дзейнасці, якія выкарыстоўваюцца па дысцыпліне

### Рэкамендуемыя сродкі дыягностыкі вынікаў навучальнай дзейнасці студэнтаў

Аб'ектам дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў з'яўляюцца акадэмічныя, сацыяльна-асобасныя і прафесійныя кампетэнцыі, зафіксаваныя ў адукацыйным стандарце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па накірунках).

Для ацэнкі дасягненняў студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне "Краязнаўчае крыніцазнаўства" і дыягностыкі ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па вучэбнай дысцыпліне рэкамендаваны наступны дыягнастычны інструментарый:

– падрыхтоўка аглядаў крыніц па асобных тэмах вучэбнай дысцыпліны;

– вуснае апытанне і маніторынг засваення бягучых матэрыялаў падчас лекцый;

– абарона заданняў, выкананых на практычных занятках;

– абарона выкананых у рамках кіруемай самастойнай работы індывідуальных (групавых) заданняў;

– залік – для выніковай дыягностыкі кампетэнцый студэнта па дысцыпліне.

Ацэнка навучальных дасягненняў студэнтаў ажыццяўляецца з улікам актыўнасці работы студэнта на лекцыйных і практычных занятках, а таксама з улікам дасягненняў кіраванай самастойнай работы. Для вымярэння ступені адпаведнасці навучальных дасягненняў студэнта патрабаванням адукацыйнага стандарту рэкамендуецца выкарыстоўваць праблемныя, творчыя заданні, якія прадугледжваюць эўрыстычную дзейнасць і нефармалізаваны адказ.

### Рэкамендуемыя педагагічныя тэхналогіі і метады выкладання

Педагагічныя тэхналогіі і метады навучання ў рамках навучальнай дысцыпліны "Краязнаўчае крыніцазнаўства" адпавядаюць агульным патрабаванням да фарміравання прафесійных кампетэнцый спецыяліста з вышэйшай адукацыяй.

Аснову навучання складаюць:

– тэхналогія праблемнага навучання на лекцыйных занятках;

– тэхналогія навучання як навучальнага даследавання, якая рэалізуецца на практычных занятках, пры самастойнай рабоце студэнта;

– камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– тлумачальна-ілюстрацыйныя, рэпрадуктыўныя метады (лекцыя-прэзентацыя);

– метады самастойнай працы студэнтаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА

### Уводзіны

Прадмет, змест, задачы вучэбнай дысцыпліны “Краязнаўчае крыніцазнаўства”. Яе месца ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці. Кампетэнцыі, якія фарміруюцца ў студэнтаў у ходзе яе вывучэння. Практыка-арыентаваны характар вучэбнай дысцыпліны і яе сувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі. Асноўныя віды навучальных заняткаў і арганізацыя самастойнай работы студэнтаў. Формы кантролю. Характарыстыка забяспечанасці вучэбнай дысцыпліны вучэбнай і навуковай літаратурай.

### Тэма 1. Тэарэтычныя пытанні краязнаўчага крыніцазнаўства

Характарыстыка паняцця “крыніцы” ў даследчай дзейнасці. Асноўныя тыпы крыніц: рэчавыя, пісьмовыя, вусныя, кіна-фота-фона, аўдыё-відэа, машыначытальныя. Крыніцазнаўства як навуковая дысцыпліна, яго аб’ект і структура. Выдатныя даследчыкі.

Краязнаўчае крыніцазнаўства як частка навуковых дысцыплін агульнага крыніцазнаўства і краязнаўства. Бібліятэкі і бібліятэчныя спецыялісты як суб’екты інстытуцыянальнай структуры краязнаўчага крыніцазнаўства. Функцыі краязнаўчага крыніцазнаўства. Асаблівасці працы бібліятэчна-інфармацыйнага спецыяліста з крыніцамі краязнаўства.

Крыніцазнаўчае даследаванне. Метады крыніцазнаўчага даследавання ў прафесійнай дзейнасці бібліятэкара краязнаўца. Структура прафесійных ведаў бібліятэчнага спецыяліста ў галіне краязнаўчага крыніцазнаўства.

### Тэма 2. Крыніцы па генеалогіі і геральдыцы беларускіх рэгіёнаў

Значэнне генеалагічнай інфармацыі ў краязнаўчай дзейнасці бібліятэк. Асноўныя паняцці генеалогіі. Прамыя і ўскосныя генеалагічныя звесткі, сваяцкія лініі. Архіўныя дакументы як крыніцы генеалогіі. Буйнейшыя даследчыкі радаводаў беларускай шляхты. Асноўныя віды друкаваных крыніц генеалогіі. Генеалагічная інфармацыя ў гербоўніках перыяду ўваходжання беларускіх зямель у ВКЛ і Расійскую імперыю. Генеалагічная інфармацыя ў “Гербоўніку беларускай шляхты”, у рэгіянальных гербоўніках, выдадзеных у Рэспубліцы Беларусь. Адлюстраванне звестак аб шляхце ў “Алфавитных списках дворянских родов ...губернии, внесенных в дворянскую родословную



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

книгу", выданнях губернскіх статыстычных камітэтаў і іншых друкаваных і электронных даведачных выданнях.

Паняцці геральдыкі. Віды гербоў. Значэнне геральдычнай інфармацыі ў краязнаўчай дзейнасці бібліятэк. Агульная характарыстыка крыніц геральдыкі. Буйнейшыя даследчыкі беларускай рэгіянальнай геральдыкі ў розныя гістарычныя перыяды. Інфармацыя аб беларускіх рэгіёнах і населеных пунктах у гербоўніках перыяду ўваходжання беларускіх зямель у ВКЛ і Расійскую імперыю. Сучасныя друкаваныя і электронныя крыніцы геральдычнай інфармацыі. Гербы беларускай шляхты ў гербоўніках, выдадзеных у Беларусі на сучасным этапе; гербы тэрыторый у навуковых і даведчных выданнях.

### Тэма 3. Крыніцы інфармацыі па тапаніміцы рэгіёнаў Беларусі

Значэнне тапанімічнай інфармацыі ў краязнаўчай рабоце бібліятэк, іх дзейнасць па данаму накірунку. Агульная характарыстыка тапанімікі. Галіны тапанімікі. Буйнейшыя даследчыкі беларускай рэгіянальнай тапанімікі. Асноўныя тыпы населеных пунктаў у Беларусі на працягу гістарычнага развіцця. Змены назваў і іх вынікі. Класіфікацыя крыніц па тапаніміцы беларускіх рэгіёнаў і іх характарыстыка. "Слоўнікі назваў населеных пунктаў" Я.Н.Рапановіча; абласныя нарматыўныя тапанімічныя даведнікі Інстытута мовазнаўства імя Я.Коласа НАН. Тапанімічная інфармацыя ў іншых даведачных выданнях розных гістарычных перыядаў; электронныя рэсурсы. Навуковая і навукова-папулярная літаратура па тапаніміцы. Буйнейшыя бібліяграфічныя крыніцы па тапаніміцы.

### Тэма 4. Крыніцы інфармацыі па дыялектах і гаворках беларускай мовы

Асаблівасці дыялектнай мовы. Дыялекты і гаворкі беларускай мовы (Паўночна-Усходні і Паўднёва-Заходні дыялекты, Сярэднебеларуская і Заходне-Палеская групы гаворак).

Значэнне інфармацыі аб асаблівасцях маўлення мясцовага насельніцтва ў краязнаўчай рабоце бібліятэк. Удзел бібліятэк у зборы моўнага матэрыялу ў рэгіёне.

Характарыстыка крыніц па дыялектах і гаворках. Класіфікацыя дыялектных слоўнікаў і іх выданні. Дыялектныя слоўнікі беларускай мовы. "Дыялектны атлас беларускай мовы". Навуковая, вучэбная і навукова-папулярная літаратура, якая прысвечана вывучэнню лінгвістычнай геаграфіі Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 5. Мемуары як крыніцы краязнаўчай інфармацыі

Характарыстыка мемуараў як краязнаўчай крыніцы; іх класіфікацыя. Значэнне мемуараў у краязнаўчай дзейнасці бібліятэк. Вусныя ўспаміны, наданне ім дакументаванай формы ў бібліятэках.

Этапы развіцця мемуарнай літаратуры, асноўныя віды мемуараў на кожным з іх, іх асаблівасці. Аўтарскі склад мемуарыстаў. Характарыстыка лепшых мемуараў асобных гістарычных этапаў з рэгіянальным аспектам зместу. Рэгіянальныя аспекты мемуараў беларускіх эмігрантаў. Бібліяграфічнае аснашчэнне мемуарнай літаратуры. Бібліяграфічныя крыніцы па мемуарыстыцы.

## Тэма 6. Фотадакументы як крыніцы краязнаўчай інфармацыі

Характарыстыка фотадакументаў як дакументальных і выяўленчых крыніц. Паняцце “краязнаўчая фатаграфія”, Я. Булгак. Развіццё калекцыяніравання краязнаўчай фатаграфіі. Р. Афтаназі, А. Т. Федарук і інш. Краязнаўчая фатаграфія ў архівах і яе інтэрнет-рэсурсы.

Класіфікацыя краязнаўчых фотадакументаў.

Значэнне фотадакументаў у краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі. Стварэнне ў бібліятэках фондаў краязнаўчых фатаграфій і фондаў выданняў з фотаматэрыяламі аб краі. Шляхі выяўлення фотадакументаў і набыцця іх у фонды бібліятэк. Выкарыстанне і прамоцыя фотадакументаў у бібліятэцы.

Асноўныя этапы і працэсы вывучэння фотадакументаў: вызначэнне віда і жанра, назвы, даты і месца фотаздымкі і інш. Вызначэнне навуковай, гістарычнай, мастацкай і мемарыяльнай каштоўнасці фотадакументаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| **ЗМЕСТ** | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін ВСР | Форма кантролю заняткаў |
|---|---|---|---|---|
| | Лекцыі | Практычныя | | |
| Уводзіны | 0,5 | | | |
| Тэма 1. Тэарэтычныя пытанні краязнаўчага крыніцазнаўства | 1,5 | | | вуснае апытанне |
| Тэма 2. Крыніцы па генеалогіі і геральдыцы насельніцтва беларускіх рэгіёнаў | 2 | 2 | | праверка практычных работ, субяседаванне |
| Тэма 3. Крыніцы інфармацыі па тапаніміцы рэгіёнаў Беларусі | 2 | 2 | | праверка практычных работ, субяседаванне |
| Тэма 4. Крыніцы інфармацыі па дыялектах і гаворках беларускай мовы | 1 | | | вуснае апытанне |
| Тэма 5. Мемуары як крыніцы краязнаўчай інфармацыі | 1 | | | групавое субяседаванне |
| Тэма 6. Фотадакументы як крыніцы краязнаўчай інфармацыі | | | 6 | праверка падрыхтаваных матэрыялаў, субяседаванне |
| Усяго | 8 | 4 | 6 | залік |



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЭЛЕКТРОННЫЯ АДУКАЦЫЙНЫЯ РЭСУРСЫ

У мэтах паляпшэння нагляднасці лекцыйнага матэрыялу выкарыстоўваюцца:

1. Беларускі дыялектны лексікаграфічны фонд [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://philology.by/fund.
2. Геральдика Беларуси [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://archives.gov.by/home/geraldika.
3. Генеалогия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://archives.gov.by/home/genealogiya.
4. Составляем родословную: с чего начать самостоятельный поиск и во что обойдется помощь профессионалов [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://minsknews.by/sostavlyaem-rodoslovnuyu-s-chego-nachat-samostoyatelnyiy-poisk-i-vo-chto-oboydetsya-pomoshh-professionalov.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## АСНОЎНАЯ ЛІТАРАТУРА

1. Источниковедение : учебник для вузов / А. В. Сиренов [и др.] ; под редакцией А. В. Сиренова. – Москва : Издательство Юрайт, 2021. – С. 40 – 45, 352 – 356 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://urait.ru/bcode/468777.

2. Мамонтов, А. В. Типы краеведческих источников и методы их изучения // Мамонтов А.В. Библиотечное краеведение; учеб. пособие. Вып. 1. Основы краеведения. – СПб., 1996. – С.14-22.

3. Русина, Ю. А. Методология источниковедения : [учеб. пособие] / Ю. А. Русина ; М-во образования и науки Рос. Федерации, Урал. федер. ун-т. – Екатеринбург : Изд-во Урал. ун-та, 2015. – С. 113 – 120 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://elar.urfu.ru/bitstream/10995/34723/1/978-5-7996-1466-9.pdf.

## ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА

1. Беларусь вачыма бібліёграфа: па матывах бібліяграфічнага бюлетэня "Новыя кнігі: па старонках беларускага друку": [да 60-гадовага юбілею бюлетэня / аўтары-складальнікі: Н. А. Шашэнька і інш. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2020. – 174 с.

2. Бирюкович, К. А. Мемуаристика: ее место и роль в краеведении / К. А. Бирюкович // Библиография. – 2003. – № 2 . – С.13 – 16.

3. Богдан, А. І. Помнікі мемуарнага жанру беларускага пісьменства як крыніца вывучэння гісторыі і культуры / А. І. Богдан // Институт белорусской культуры и становление науки в Беларуси : к 90-летию создания Института белорусской культуры : материалы Международной научной конференции, Минск, 8—9 декабря 2011 г. / [редколлегия: А. А. Коваленя и др.]. — Минск, 2012. — С. 503—510.

4. Крыніцазнаўства, археаграфія, архівазнаўства ў XX—XXI ст. у Беларусі: зборнік навуковых артыкулаў, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння М. М. Улашчыка / [рэдкалегія: С. М. Ходзін (адказны рэдактар) і інш.]. – Мінск : БДУ, 2008. – 303 с.

5. Кузьмініч, Т. В. Лакальныя электронныя калекцыі як сродак стварэння крыніцазнаўчай базы гістарычных і краязнаўчых даследаванняў (на прыкладзе Памятных кніжак беларускіх губерняў) / Т. В. Кузьмініч, Валянціна Саітава // Бібліятэчны свет. – 2012. – № 5. – С. 19–20.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Кузьмініч, Т. В. Лічбавая рэканструкцыя дакументаў і матэрыялаў па рэгіянальнай гісторыі Беларусі другой паловы XIX — пачатку XX стагоддзя / Т. В. Кузьмініч // Беларускі гістарычны часопіс. – 2018. – № 10. – С. 34–38.

7. Кузьмініч, Т. В. Электронныя інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк у сістэме энцыклапедычных ведаў пра Беларусь / Т. В. Кузьмініч, З. А. Пятроўская, А. М. Маліноўская // Развитие информатизации и государственной системы научно-технической информации : РИНТИ — 2021 : XX Международная научно-техническая конференция, 18 ноября 2021 г., Минск : доклады / [научные редакторы: А. В. Тузиков, Р. Б. Григянец, В. Н. Венгеров]. – Минск, 2021. – С. 24–28.

8. Лаппо, М. А. Типология мемуарно-автобиографических изданий: динамические аспекты / М. А. Лаппо // Библиосфера. – 2015. - № 2. – С. 47 – 52.

9. Лемтюгова, В. П. Корни наших фамилий / В. П. Лемтюгова, И. О. Гапоненко. – Минск : Звязда, 2018. – 668 с.

10. Рассадзін, С. Я. Гербы і сцягі гарадоў і раёнаў Беларусі / С. Я. Рассадзін, А. М. Міхальчанка. – Мінск : Беларусь, 2005. – 127 с.

11. Рогалев, А. Ф. Этнические и географические названия как источник для изучения истории Беларуси / А. Ф. Рогалев. – Гомель : Барк, 2014. – 127 с.

12. Рыбчонок, С. А. Генеалогія Беларусі: дасягненні і перспектывы даследавання / С. А. Рыбчонак // Герольд Litherland. – 2013. – С. 4 – 19.

13. Улашчык, М. Мемуары і дзённікі як крыніцы па гісторыі Беларусі: З рукап. спадчыны / М. Улашчык; уклад.: Я. М. Кісялёва, В. У. Скалабан. – Мінск : Пейто, 2000. – 86 с.

14. Ходзін, С. М. Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі: дапаможнік для студэнтаў вышэйшых навучальных установ, якія навучаюцца па спецыяльнасці 1-21 03-01 "Гісторыя (па напрамках)" / С. М. Ходзін. – Мінск : Беларускі дзяржаўны універсітэт, 2012. – 254 с.

15. Цітоў, А. К. Гербоўнік беларускіх гарадоў (XVI — пачатак XX ст.) / А. К. Цітоў. – Мінск : Беларусь, 2015. – 172 с.

16. Шур, В. В. Беларускія ўласныя імёны: беларуская антрапанімія і тапанімія: дапаможнік для магістрантаў, якія навучаюцца па спецыяльнасці 1-21 80 11 "Мовазнаўства" / В. В. Шур. – 2-е выд. – Мазыр : Выснова, 2019. – 355 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ